Ігар Сідарук

# ВІРТУАЛЬНАЕ ЗУБРАНЯ

Зборнік п’ес

KAMUNIKAT.org

Мінск
2004

**ЗМЕСТ:**

Кветкі пад ліўнем.
Меч Анёла.
Кірмашовы балаган.
Юнак і Вядзьмар.
Віртуальнае Зубраня.
Залатая табакерка.

KAMUNIKAT.org

## КВЕТКІ ПАД ЛІЎНЕМ
П’еса-казка

**Дзейныя асобы:**

САДОЎНІК.
ДЗІЦЯ.
ГАНДЛЯР.
КВЕТКІ.
ДОЖДЖ.

KAMUNIKAT.org

З’ява 1.

Глыбокая ноч. Бліскаюць маланкі, грукоча гром. У садзе шуміць Дождж, скрозь яго праступае дом Садоўніка. Недзе гучыць скрыпка, разам з яе мелодыяй чуваць шэпт Дажджу.

ДОЖДЖ.
Люблю гэты сад,
Які поўны кветак.
Люблю гэты дом,
Дзе жыве маўклівы Садоўнік.
Кветкі называюць яго
“Маэстра”... Яны закаханыя
Ў яго, а ён – у іх...
Як толькі знікае ноч,
Выходзіць Садоўнік
Да сваіх кветак.
Якія прыемныя яго словы,
Уважлівы позірк,
Клапатлівыя рукі.
Ён шчаслівы,
Як могуць быць шчаслівымі
Яго кветкі...

З’ява 2

Світанак. Дождж сціхае. Падымаецца рыжае сонейка. З дома выходзіць Садоўнік. У руках ён трымае матыку. Ціха спявае і набліжаецца да кветак.

ПЕСНЯ САДОЎНІКА:

У бліскучай расе,
Як заўжды, пакрысе
Мой квітнеючы сад прачынаецца.
Я між клумбаў прайду,
Зорку зноў не знайду –
Яна з неба мне ўсміхаецца!

“На здароўе!” – скажу,
Я не ёй даражу,
А сваімі гарэзамі-дзеткамі.
Зорка ў небе гарыць,
На зямлі ж лепей жыць
Разам з найпрыгажэйшымі кветкамі.

(Спыняецца ля клумбы.)

КВЕТКІ. Добрай раніцы, маэстра!
САДОЎНІК. Як вам сёння спалася?
КВЕТКІ. О, вельмі добра. Выдатна!

Садоўнік пачынае праполку. Затрымліваецца ля Цюльпана.

САДОЎНІК. А табе, прыгажун?
ЦЮЛЬПАН (капрызна). Вельмі было холадна. Я прамок да карэньчыкаў.
САДОЎНІК. Ну, гэта не страшна. Хутка сонейка цябе сагрэе.
ЦЮЛЬПАН. Спадзяюся. Аднак недзе яно прапала.

Садоўнік паварочваецца да сонейка, якое ўзыходзіць усё вышэй. Разам з ім паварочваюцца ўсе галоўкі кветак.

САДОЎНІК. Вось яно – сонейка. Прывітанне!
КВЕТКІ. Добры дзень, сонейка!

На даляглядзе ўсё залітае святлом. Птушкі ў садзе спяваюць усё гучней і радасней. Кветкі і іх маэстра ўсміхаюцца. Раптам чуецца ціхі стогн. Садоўнік нахіляецца да клумбы.

САДОЎНІК. Што з табою, званочак?
ЗВАНОЧАК. Не хвалюйцеся, маэстра. Здаецца, зламана сцябліна.
САДОЎНІК (заклапочана). Як гэта здарылася?
ЗВАНОЧАК. Учора вечарам у садзе гуляла дзіця. Яно так усяму радавалася і так хацела ўсё ўбачыць! Побач з клумбай сядзеў прыгожы вялікі жук. Дзіця нагнулася, каб лепей яго разгледзець, і не заўважыла, як наступіла на клумбу. Зусім ненаўмысна! І я дараваў дзіцяці.
САДОЎНІК. Бедны званочак! Але паспрабуем табе дапамагчы.

Садоўнік бяжыць назад у дом. Вяртаецца з марляю, нейкімі шкляначкамі. Схіляецца над Званочкам.

Патрывай крыху. Зараз будзе лягчэй.
ЗВАНОЧАК. Дзякуй, маэстра. Мне ўжо лепей.
САДОЎНІК. Нічога-нічога. Хутка будзеш гуляць разам з усімі кветкамі.
ЗВАНОЧАК (шэптам). Скажыце, гэта праўда?
САДОЎНІК (гледзячы ў вочы Званочку). Так.

Іншыя кветкі весела гуляюць на клумбах.

КВЕТКІ:
Раз, два, тры, чатыры, пяць –
Будзем ў хованкі гуляць.
Раз – рамонак, два – півоня,
Тры – цюльпан. Ён ўсіх дагоніць!
Раз, два, тры, чатыры, пяць,
Цур, на клумбах не драмаць!
Мы галоўкамі качнём
І лічылку зноў спяём:
Раз, два, тры, чатыры, пяць,
Гэй, выходзьце ўсе гуляць!
РАМОНАК. Хто адгадае, што ў мяне ў пялёстках? А вось і ніхто!
ПІВОНЯ (разважліва). Не крычы так гучна. Маленькіх разбудзіш.
ГЛАДЫЁЛУС. А я ведаю! Там – сонечны праменьчык!
РАМОНАК. Ага, ты падгледзеў, падгледзеў!

Гульня працягваецца. Садоўнік узнімаецца з каленяў, назірае за кветкамі.

З’ява 3

У садовыя веснічкі ўваходзіць незнаёмы чалавек. Гэта Гандляр. Раніцай ён скупляе тавар, каб потым перапрадаць яго на рынку. Садоўнік ідзе яму настустрач.

ГАНДЛЯР. Добры дзень, гаспадар.
САДОЎНІК. І вам таксама.
ГАНДЛЯР. Дзянёк будзе на славу.
САДОЎНІК. Так думаеце? Але прабачце, хто вы?

Садоўнік глядзіць то на кветкі, якія працягваюць свае вясёлыя гульні, то на Гандляра, які нічога не заўважае.

ГАНДЛЯР. Дазвольце адрэкамендавацца – гандляр! Якія ў вас прыгожыя кветкі! Колькі за іх хочаце?
САДОЎНІК. Выбачайце, не зразумеў.
ГАНДЛЯР (смяецца). Вядома, не за ўсе кветкі. А толькі за тыя, што я выберу.
САДОЎНІК. Кветкі не прадаюцца.
ГАНДЛЯР. Чаму?
САДОЎНІК. Таму што яны – жывыя.
ГАНДЛЯР. Вось так!.. Тады навошта вы іх вырошчваеце?

Кветкі змоўклі. Прыслухоўваюцца да размовы. Цюльпан выцягвае сваю галоўку.

САДОЎНІК. Досыць! Мы ўсё роўна не зразумеем адзін аднаго. Вы трапілі не туды. Я не магу прадаць вам гэтыя кветкі.
ГАНДЛЯР. Але чаму?
САДОЎНІК. Таму што тады яны памруць.

Гандляр здзіўлена глядзіць на Садоўніка. Потым – на кветкі.

ГАНДЛЯР. Ах, якая прыгажосць! Значыць, не прадасцё?
САДОЎНІК. Давайце пакінем гэтую размову. Хадземце лепей піць гарбату.
ГАНДЛЯР. Дзякую, я ўжо паснедаў. Усяго добрага!
САДОЎНІК. Бывайце.

Глядзіць, як зыходзіць Гандляр. Той, азірнуўшыся, знікае за веснічкамі.

З'ява 4

Кветкі паварочваюць галоўкі да Садоўніка.

РАМОНАК. Хто гэта?
САДОЎНІК. Здаецца, чалавек...
ЦЮЛЬПАН. А што ён хацеў?
САДОЎНІК (сумна ўсміхаецца). Хацеў вас купіць.
ГЛАДЫЁЛУС. Выбачайце, што?
САДОЎНІК. Але вам гэта ведаць неабавязкова. Гуляйце далей.

ПІВОНЯ. Надта ж вы клапатлівы часам. Але гэта ўжо ваша справа. Мы не пакрыўдзіліся, маэстра!..
САДОЎНІК. Вось і цудоўна.

Аб нечым падумаўшы, Садоўнік зноў схіляецца над Званочкам.

ЗВАНОЧАК. Гэта дрэнны чалавек, маэстра. І добра, што ён пайшоў.
САДОЎНІК. Так, званочак, я згодны...
ЗВАНОЧАК. Калі ён стаяў побач, холад прабіраў да самых жылак!
САДОЎНІК. Ён проста заблукаў... І болей сюды не прыйдзе.
ЗВАНОЧАК. Такія, як ён, прыносяць няшчасце. Але ў вас стомлены выгляд. Схадзіце адпачніце крыху.
САДОЎНІК. Так, так... Дзякуй, званочак.

З'ява 5

Садоўнік павольна ідзе да дома. Яго рукі і край камізэлькі выпэцканыя ў зямлю. Насустрач скача на адной назе Дзіця.

ДЗІЦЯ. Адгадай, што сёння мне снілася?
САДОЎНІК. Пэўна, вялікае белае воблака. Яно зачапілася за верхавіну сасны, а ты сядзела на ім. на самым краёчку. Табе было весела і страшна: а раптам звалішся ўніз.
ДЗІЦЯ (перабівае). А потым воблака ператварылася ў слана! Я трымалася за яго вушы, а слон быў такі добры!.. Вой, адкуль ты ведаеш, якія я бачу сны?
САДОЎНІК. Пойдзем у дом, малое. Калі-небудзь ты таксама навучышся адгадваць думкі людзей.

Садоўнік абдымае Дзіця за плечы і вядзе за сабой у дом.

З'ява 6

Кветкі зноў пачынаюць свае гульні. Смех, спевы, танцы.

Раз, два, тры, чатыры, пяць!
Будзем ў хованкі гуляць.
Раз – рамонак, два – півоня,
Тры – той, хто ўсіх дагоніць!
Раз, два, тры, чатыры, пяць,
Хіба можна нас дагнаць?

Мы галоўкамі качнём
І лічылку зноў спяём:
Раз, два, тры, чатыры, пяць,
Гэй, выходзьце ўсе гуляць!

Цюльпан адварочваецца ад усіх, хаваецца пад куст.

ЦЮЛЬПАН. Чужы чалавек хацеў нас купіць. Магчыма, тады ён забраў бы нас адсюль? У гэтым садзе так нецікава і сумна! Але што яму адказаў Садоўнік?
РАМОНАК. Цюльпанчык, гуляй з намі!
ЦЮЛЬПАН. Зараз. Як яны ўсе надакучылі! (Зноў у роздумах). Чаму ён так хутка пайшоў? Няўжо кветкі яму не спадабаліся? Дзіўна... Магчыма, ён яшчэ вернецца. Трэба будзе больш уважліва паслухаць іх размову з Садоўнікам.
ГЛАДЫЁЛУС. Эй, цюльпан, з кім там шэпчашся?
ЦЮЛЬПАН. Вось прычапілася! (Да кветак). І ў што гуляеце?

Сонца свеціць усё ярчэй. Падступае спякота. У небе – ні воблачка. Кветкі хаваюцца ў цень. З дома выходзіць Садоўнік, нясе ў руках парасоны. Падыходзіць да клумбаў, раскрывае іх над кветкамі.

САДОЎНІК. Так будзе лепей. Шмат загараць – шкодна.

Ідзе пад павець. Прылягае на канапку і чытае кнігу. Засынае. Ветрык гартае старонкі.

ПІВОНЯ. Заснуў наш маэстра. (Пазяхае). Можна падрамаць і нам.

Адна за адной кветкі засынаюць. Іх сон падобны на дзіцячы: яны нечаму ўсміхаюцца, прыцмокваюць, уздрыгваюць, неспакойна варушацца. Не спіць толькі адзін Цюльпан.

З’ява 7

За агароджай, крадучыся, паказваецца Гандляр з кашом. Заўважае Садоўніка, які моцна спіць. Уваходзіць у веснічкі, рашуча накіроўваецца да клумбаў. З дома выбягае Дзіця. Выдзімае вялікую мыльную бурбалку і глядзіць на Гандляра. Бурбалка хвіліну трымаецца ў паветры, а потым, падохпленая

ветрыкам, разбіваецца аб край капелюша Гандляра. Той уздрыгвае.

ДЗІЦЯ (смяецца). Ага, спужаліся! Вы каго-небудзь шукаеце?
ГАНДЛЯР (збянтэжана). Так... Дакладней... Не. Ты жывеш тут?
ДЗІЦЯ. Тут я гуляю. А жыву – вось у тым доме! Садоўнік спіць. Можа, разбудзіць?
ГАНДЛЯР. Не, пачакай, не трэба! Ідзі сюды. (Дзіця падыходзіць да Гандляра). Я быў тут ранкам. Ён прасіў, каб я прынёс яму насенне. (Робіць выгляд, што шукае па кішэнях). Але дзе ж яно?
ДЗІЦЯ. Згубілі?
ГАНДЛЯР. Здаецца, не... Вось галава! Дома забыў.
ДЗІЦЯ. Тады вярніцеся і знайдзіце.
ГАНДЛЯР. Не, дамоў я, мабыць, вяртацца не буду. Надта далёка жыву. Паслухай, ты мне не дапаможаш?
ДЗІЦЯ (выдзімаючы бурбалкі). Як?
ГАНДЛЯР. Вось табе адрас. Гэта побач. Пагрукай, дзверы адчыніць старая жанчына. Дасі ёй гэтую цыдулку і грошы.

Гандляр дастае з важкай магалейкі некалькі манет і аддае іх разам з аркушам Дзіцяці.

ДЗІЦЯ. Грошы? А што гэта?
ГАНДЛЯР. Як што?.. Ты дасі грошы бабульцы, а яна табе за іх – насенне.
ДЗІЦЯ. Вось за гэтыя металічныя кружочкі?
ГАНДЛЯР. Так, за гэтыя кружочкі! Усё зразумела?
ДЗІЦЯ (здзіўлена разглядае манеты). Здаецца, усё...
ГАНДЛЯР. Тады паспяшайся!
ДЗІЦЯ. Я імгненна!
ГАНДЛЯР. Імгненна не трэба. Яшчэ насенне рассыплеш. Або грошы згубіш!

Дзіця знікае за веснічкамі.

З’ява 8

Гандляр яшчэ раз аглядаецца вакол і падыходзіць да кветак. Яны па-ранейшаму спяць. Цёмная хмара закрывае сонца.

ГАНДЛЯР. Цяпер вы будзеце мае!

Нахіляецца, каб сарваць першую кветку. Гэта Гладыёлус. Але ў Гандляра нічога не атрымліваецца.

Што за д'ябальшчына?!

Бярэцца за другую – Рамонак. І зноў – няўдача.

Дзіва! У гэтага рамонка такая тонкая сцябліна – але не вырваць! (Спрабуе справіцца з Півоняй. Безвынікова). Зачараваныя яны, ці што?
ЦЮЛЬПАН. Мяне, мяне купіце!
ГАНДЛЯР. Што? Хто гэта?
ЦЮЛЬПАН. Я! хіба не бачыце?
ГАНДЛЯР. Б... бачу. Цюльпан. Р... размаўляе?
ЦЮЛЬПАН. Так. А што тут дзіўнага?
ГАНДЛЯР. Упершыню бачу, каб размаўлялі кветкі.
ЦЮЛЬПАН. Дык вы купіце мяне ці не?
ГАНДЛЯР. Купіць цябе, кажаш? А каму заплаціць?
ЦЮЛЬПАН. Як каму? Мне!
ГАНДЛЯР. Табе? А навошта табе грошы?
ЦЮЛЬПАН. У вас яны ёсць? Вам з імі добра?
ГАНДЛЯР. О! гэта шчасце!..
ЦЮЛЬПАН. Вось і я хачу быць шчаслівым таксама.
ГАНДЛЯР. Ты думаеш, грошы зробяць цябе шчаслівым? (Выходзіць з задумення). Добра, я згодзен. (Дастае бліскучую манету). Трымай!
ЦЮЛЬПАН. Ого! А яна залатая?
ГАНДЛЯР (рэзка). А як жа! А зараз – у кош! Хутка!

Цюльпан, схаваўшы манету між пялёсткаў, марудзіць ля клумбы. Глядзіць на іншыя кветкі, быццам развітваецца.

Паспяшайся! (Цюльпан уздыхае і лезе ў вялікі кош). Сядзі там ціха. І не спрабуй высоўваць носа! (Гандляр яшчэ раз азіраецца навокал і рашуча дастае вялікі нож). Але аднаго цюльпана будзе малавата!

Хутка зразае кветкі пад корань і складвае іх у кош. На клумбе застаецца адзін Званочак. Гандляр кранае яго за сцябліну.

На жаль, гэты тавар сапсаваны! (Ускідвае кош на плечы. Дастае з магалейкі дзве паперкі і кладзе іх пад каменьчык).

Вось цяпер усё! Думаю, плата будзе дастатковай. (Ідзе, спяваючы.)

Які прыемны звон манет!
Куплю за іх увесь я свет.
Скажу: ганіце здачу!
Як чараўніцтва, гэты звон!
Я ведаю адзін закон:
Хто бедны, той і плача.

О, як чырвонцы храбусцяць!
Усё гатовы я прадаць,
Каб іх было паболей.
Мой кош ніколі не пусты,
А мне здаецца ўсё: малы!
Багацце – злая доля!..

Чуецца яго зларадны смех. Як толькі за Гандляром зачыніліся веснічкі, пайшоў Дождж. Садоўнік трывожна ўздрыгвае пад павеццю. Дождж узмацняецца.

ДОЖДЖ. Здаецца, здарылася непапраўнае. У маэстра болей няма яго кветак. Прагнасць гандляра знішчыла іх. Засталіся адны карані. Але, у каго яны моцныя, тых купіць немагчыма. Толькі што зрэзаць...

З'ява 9

У веснічкі ўбягае Дзіця. Яно наскрозь прамокла. У руцэ – пакуначак з насеннем. Раптам бачыць, што клумбы пустыя, і спыняецца.

ДЗІЦЯ. Садоўнік! Прачніся! Твае кветкі!..

Садоўнік узнімаецца з канапы, ідзе да Дзіцяці.

САДОЎНІК. Што здарылася?
ДЗІЦЯ. Кветкі!.. Іх няма!
САДОЎНІК. Што? Не можа быць!

Дзіця нахіляецца да Званочка, гладзіць яго па галоўцы.

ДЗІЦЯ. Толькі званочак застаўся. Астатнія зрэзалі.

САДОЎНІК. Хто?
ЗВАНОЧАК. Чалавек з кашом, маэстра. Толькі мяне не чапаў. Сказаў, што я сапсаваны.
САДОЎНІК. Чалавек? Які? Што прыходзіў ранкам?
ЗВАНОЧАК. Так, той самы. Ён зрэзаў усіх. Дакладней... (Змаўкае).
САДОЎНІК. Ты хочаш сказаць яшчэ нешта?
ЗВАНОЧАК. Цюльпан палез у яго кош сам. За гэта яму далі манету.

Садоўнік апускаецца на тое месца, дзе рос Цюльпан

САДОЎНІК. Значыць, ён прадаў сам сябе? Даў сябе вырваць... (Не дагаворвае). Эх!..

Дзіця знаходзіць пад каменьчыкам грошы.

ДЗІЦЯ. Глядзі! Што гэта?
САДОЎНІК. Гэта, малое, грошы.
ДЗІЦЯ. Грошы? (Адразу робіцца змрочным). Чалавек, які прыходзіў, і мне даваў грошы. Дык вось з-за чаго не стала ў садзе кветак!

Ірве на дробныя шматочкі грошы і пакуначак з насеннем, кідае на зямлю. Моўчкі стаяць з Садоўнікам. Ідзе праліўны дождж.

САДОЎНІК (страпянуўшыся). Я пакідаю цябе, малое. Чакай, я павінен вярнуцца з кветкамі.
ДЗІЦЯ. Я пайду разам з табой.
САДОЎНІК. Не! Ты застаешся са званочкам – наглядай за ім, калі ласка!

Садоўнік хоча сказаць яшчэ нешта, але толькі махае рукой і кідаецца за веснічкі. Дождж сціхае.

ЗВАНОЧАК. Куды пайшоў наш маэстра?
ДЗІЦЯ. Шукаць чалавека з кашом.
ЗВАНОЧАК. Ён вернецца?
ДЗІЦЯ. Не ведаю. Калі вернуцца яго кветкі.
ЗВАНОЧАК. Але як іх знайсці? Хто яму дапаможа? Ты ведаеш, дзе жыве гэты чалавек?
ДЗІЦЯ. Не. Можа, ведае дождж?

ЗВАНОЧАК. Але такія людзі заўсёды хаваюцца ад дажджу.
ДЗІЦЯ. Хаваюцца, кажаш? А калі хаваюцца, значыць, і ўцякаюць? Туды, дзе цёпла і суха... Званочак, я прыдумаў!
ЗВАНОЧАК. Што?..
ДЗІЦЯ. Усё вельмі проста. Няхай дождж праганяе яго адусюль, дзе ён паказваецца. У рэшце рэшт ён прыбяжыць сюды.
ЗВАНОЧАК. Малайчына, малое! (Зноў засумаваўшы). Але што можам зрабіць мы?
ДЗІЦЯ. Ты званіць можаш?
ЗВАНОЧАК. Магу. Але навошта...
ДЗІЦЯ. Паспрабуй.

Чуецца прыемны звон.

Цудоўна! Дзе наш дружа Дождж? Адгукніся!

Дождж з'яўляецца побач з Дзіцем.

ДОЖДЖ. Я доўно тут і ўсё чуў. Я ведаю, дзе жыве Гандляр. Толькі наўрад яго прыход дапаможа вам і Садоўніку.
ДЗІЦЯ. Мы яшчэ паглядзім!.. Ідзі ж хутчэй, прашу цябе!

Дождж знікаеза садам, за домам, за далягладам...

З'ява 10

Змяркаецца. Дзіця сядзіць на парозе дома, падпёршы голаў. Ціха спявае.

ПЕСНЯ ДЗІЦЯЦІ:

Дожджык грукоча ў вакно,
Дожджык па даху грукоча.
Без кветак не спіць даўно
Сад гэтай цёмнай ноччу.

Дожджык, вярніся сюды!
Знайдзі чалавека злога.
З ім непапраўнай бяды
Ў сад пралягла дарога.

Няхай ён назад аддае

Кветкі, якія скалечыў.
Няхай ім званочак спяе
Радасна пры сустрэчы.

Адчыняюцца веснічкі. Уваходзіць засмучаны Садоўнік.

Ты… не знайшоў іх?
САДОЎНІК. Я абышоў увесь горад. Нідзе няма гэтага чалавека!
ДЗІЦЯ. Я чуў, што Гандляр жыве каля рынку. Ты быў там?
САДОЎНІК. Каля рынку? Не, там я не быў ніколі і дарогі туды не ведаю.
ДЗІЦЯ. Мы са званочкам таксама. Можа, ведае дождж? Ён абяцаў знайсці.
САДОЎНІК. Дождж? Але дзе ён?
ДЗІЦЯ. Пайшоў за гандляром. Хутка, сказаў, будзе.
САДОЎНІК. Пачакаем… Аднак я змарыўся. Пайду ў дом, прылягу.

Садоўнік заходзіць у дом.

З'ява 11

Раптам чуюцца незадаволеныя выкрыкі Гандляра. Яго гоніць Дождж, ад якога спрабуе ўцячы, але зноў і зноў трапляе пад вадзяныя струмені. Над яго галавой – шырачэзны парасон.

ГАНДЛЯР. Ды супакойся!.. Вось прычапіўся! Што я табе зрабіў? Зусім няма куды схавацца!

Паступова яны набліжаюцца да садовых веснічак. Гандляр, прагнучы ўцячы ад Дажджу, хаваецца за імі. Але Дождж паранейшаму насядае. Гандляр адступае да клумбаў.

Змучыў, пракляты! І вінен каму што ці што?!.

Да Гандляра падыходзіць Дзіця.

ДЗІЦЯ. Вы прынеслі кветкі?
ГАНДЛЯР. Якія кветкі?
ДЗІЦЯ. Якія раслі тут. Калі ласка, вярніце іх!
ГАНДЛЯР. Ну не! Я заплаціў.
ДЗІЦЯ (ціха). Садоўніку дрэнна… Здаецца, ён памірае.

Паўза.

ГАНДЛЯР (задуменна). Вось як... Ну добра. Я вярну вам кветкі. Акрамя адной. Прыгажуна цюльпанчыка. Мне ён прадаўся сам. Аднак папрашу назад мае грошы!
ДЗІЦЯ. Іх няма.
ГАНДЛЯР. Як няма? А дзе яны? Я ж сам клаў іх вось пад гэты каменьчык!
ДЗІЦЯ. Тут сад.
ГАНДЛЯР. І што з таго?
ДЗІЦЯ. Тут растуць кветкі, а не грошы. Лепей ідзіце адсюль. Вы, пэўна, заблукалі. Званочак, пазвані яму на развітанне.
ГАНДЛЯР. Нейкія вар'яты тут усе. То вяртай ім кветкі, то ідзі, грошай няма, а тавар патрабуюць, ды яшчэ й праганяюць! Добра, я пайшоў. (Падымае свой цяжкі кош, збіраецца ісці).
ЗВАНОЧАК. Пачакайце!
ГАНДЛЯР. Хто там яшчэ? А, гэта ты, калека?
ЗВАНОЧАК. Так, я. (Пачынае спяваць).
У кожнага – родны куток...
Кроплямі – горкі сок,
Калі паламана сцяблінa.
Садоўнік добрай рукой
Аблегчыць пякучы боль –
Амаль крананнем адзіным.
Толькі аднойчы прыйшоў
Той, хто без лішніх слоў
Кветкі усе – пад корань!
Прагны і злы чалавек
З кветак зрабіў калек,
Не чуючы іхняга болю.

Гучыць лёгкая, сярэбраная мелодыя. Гандляр апускае кош на зямлю.

ГАНДЛЯР. Якая недарэчная песня!

Слухае. Паступова з ім пачынае рабіцца нешта незразумелае...

Знаёмы зван, чорт бы мяне падраў!

Да Званочка далучаецца Дождж. Гандляру здаецца, што з неба падаюць манеты. У яго запальваюцца вочы. Дзіця падстаўляе твар пад кроплі і смяецца.

Ого! Аднак гэты садзік поўны цудаў! Але што са мною? Яшчэ зазяваюся ды застануся ні з чым.

Вытрасае з каша кветкі, кідаецца збіраць, як яму здаецца, манеты. Звініць меладычна Званочак. Кветкі, кінутыя на клумбу, пад Дажджом ажываюць і смяюцца з Гандляра. Дзіця сярод іх. Дождж раптоўна сціхае.

Фу! Хопіць! Вось дык плата. Прывітанне!

Абліваючыся потам, Гандляр цягне кош да веснічак. Праз дзіркі плеценага каша льецца звычайная вада.

ДЗІЦЯ. Ніколі болей не хадзіце сюды!
ГАНДЛЯР. Не прыйду, каб і запрашалі! Мне тут болей няма чаго рабіць. А гэтага багацця (устрасае кош) хопіць надоўга!
ДЗІЦЯ. Будзем спадзявацца.

Усе гучна смяюцца.

З'ява 12

ПІВОНЯ. Дзіўна! Але здаецца, мы дома.
ГЛАДЫЁЛУС. Неверагодна. Смагі няма, душнага каша няма, агіднага гандляра – няма!
РАМОНАК. Добры дзень, званочак. Як сябе пачуваеш? Будзеш гуляць з намі? Ой, глядзіце!

Побач з клумбаю ляжыць Цюльпан. Ён завяў.

ПІВОНЯ (засмучана). Ён ніколі болей не вернецца да нас.
ГЛАДЫЁЛУС. Што гэта?

Знаходзіць у пялёстках Цюльпана манету.

ДЗІЦЯ. Пакажы. Значыцца, з-за гэтага гінуць кветкі?

Размахваецца і кідае манету як мага далей. Зноў сярэбрана й журботна звініць Званочак.

КВЕТКІ. Глядзіце, наш маэстра!

З дома выходзіць Садоўнік. Ён увесь у белым. Услухоўваецца ў мелодыю, павольна ідзе да кветак.

Ён усміхаецца і быццам аддаляецца ад усіх.

Канец.

KAMUNIKAT.org

**МЕЧ АНЁЛА**

Калядныя настроі ў дзвюх дзеях

**Дзейныя асобы:**

ДЗЕВА МАРЫЯ.
СВЯТЫ ЯЗЭП.
РАХІЛЬ.
АНЁЛ.
ЦАР ІРАД.
ЧАРНАКНІЖНІК.
ПАСТУХІ.
МАГІ.
ВОІНЫ.
СМЕРЦЬ.
Д'ЯБАЛ.
ДЗІЦЯТКА.

KAMUNIKAT.org

## ДЗЕЯ ПЕРШАЯ

1.

Сцэна ўяўляе батлейку з двух ярусаў. Дзеянне пачынаецца ў верхнім ярусе. На сцэне Дзева Марыя з Дзіцяткам, святы Язэп, кароўкі, авечкі. Уваходзяць Пастухі. Падыходзяць да Дзіцятка, кланяюцца Яму.

ПАСТУХІ
Найшаслівейшай весткі
Яшчэ не бывала:
Над батлейкай зорка ясна
Светлая заззяла!
Хто там у пялюшках
У яслях павіўся?
То ад Дзевы Марыі
Хрыстос нарадзіўся!
Хрыстос нарадзіўся!
Хрыстос нарадзіўся!
Мы з добрым ягняткам
Перад малым Дзіцяткам
На калені ўпадаем,
Хрыста праслаўляем!..

МАРЫЯ
Я словы вашы збіраю,
У сэрцы сваім складаю.

ЯЗЭП
Нябесны Ўладару!
Даруй гады шчаслівыя
Нашаму Гаспадару.
Які добрым сэрцам і Боскай рукой
Павядзе да збавення
Народ бедны свой.

2.

KAMUNIKAT.org

Дзеянне пераносіцца ў ніжні ярус. На сцэне стаіць адмысловы трон, абабіты чырвоным сукном. Уваходзіць цар Ірад, садзіцца на трон.

ЦАР ІРАД
Кроў у жылах маіх стыне,
Калі чую аб народжаным Божым Сыне!
Непарушны трон царскі!
Аднак небяспечна,
Калі хто за мяне стане ўладарыць вечна!

Уваходзяць тры магі.

МАГІ
Мы – цары-мудрацы...

ІРАД
Я вас да сябе запрашаю,
Ці далёка ідзяце, пытаю.

МАГІ.
Ад усходу тры цары,
Мы нясём Хрысту дары,
Дары ў сям'ю дзіўну:
Золата, ладан і смірну.

Уладыку і Богу
Чэсць адаць многу,
Які аж да века
Ўмілаваў чалавека.
Як мёд сыціць соты –
Так Хрыстос бяссмяротны!

ІРАД
(сам да сябе)
Як мёд сыціць соты –
Так Хрыстос бяссмяротны?!
(Да магаў, з іншай інтанацыяй).
Да Народжанага ідзіце
І мне ўсё звясціце,
Каб і я пакланіўся,
Перад Хрыстом скарыўся.
Аддам чэсць і славу,

Якая цару да твару!

Магі з паклонам выходзяць.

3.

Цар Ірад сноўдае, усхваляваны, па палацы. Потым зноў садзіцца на трон.

ІРАД
Гэй, Чарнакніжнік!..

Невядома адкуль з'яўляецца Чарнакніжнік.

О мой род і ўлада мая!
Бессмяротным жадаю быць я!
Толькі як мне зрабіцца такім –
Уладаром усемагутным адным?

ЧАРНАКНІЖНІК
(сам да сябе, ціха)
Запаветная мара твая –
Аб чым мару таксама і я!
Аднак Ірада я падману,
Заганю яго хутка ў труну!
Кніга д'яблава мне дапаможа...
Так і плюнуў бы ў брыдкую рожу!

ІРАД
Што? Хто тут?

ЧАРНАКНІЖНІК
О грозны мой цару!
Усемагутны ўладару!
Навошта нікчэмнага чарвяка выклікаў?
Ці якія беды-турботы спазнаў?

ІРАД
О чарнакніжнік,
Я адчуваю:
На шляху маім нехта паўстаў!
Скажы, як уладу мне захаваць?

ЧАРНАКНІЖНІК
Што яшчэ цару адказаць?

ІРАД
Як, скажы, бессмяротным мне стаць?

У гэты момант усё працінае яркая ўспышка, трон цара Ірада хістаецца, аднекуль з-пад зямлі зеўрае пякельнае полымя.

ЧАРНАКНІЖНІК
Ш-ш... што яшчэ цару адказаць?

ІРАД
О-о! Адчаго ў вачах чарната?!

ЧАРНАКНІЖНІК
Адтаго ў вачах чарната,
Што заззяла зорка Хрыста!
Які ў Віфлееме нарадзіўся,
На цвёрдым сене павіўся,
Галодны, халодны, у батлейцы згалелы,
Усхвалены словам ясным!

ІРАД
Маўчаць, варажбіт няшчасны!
Я непераможны і вялікі ва славе!
Ці не ў Хрысце небяпека маёй дзяржаве?

ЧАРНАКНІЖНІК
(зазірае ў кнігу)
О вялікі цару!
Усемагутны ўладару!
Хоць сказаць я не маю права,
Толькі моцна хістаецца твая дзяржава.
Прышэсце Хрыста небяспечна,
Бо Ён уладарыць збіраецца вечна.
І цары-мудрацы тут плашчоў не развяжуць
І на Дзіцятка табе не пакажуць!

ІРАД
Ах, падманшчыкі!

KAMUNIKAT.org

Што мне рабіць?

ЧАРНАКНІЖНІК
Усіх дзяцей у Віфлееме – забіць!

ІРАД
Што?!.

ЧАРНАКНІЖНІК
Не забіць, дык кінуць у цямніцу –
Няхай і маленькі Ісус разам з усімі таміцца!
(Сам да сябе).
А там і да цябе дойдзе чарга!..
Бо кожны прадажны ў цябе слуга.
(Зноў да Ірада).
На што я забыўся яшчэ адказаць?

ІРАД
Скажы, як непераможным мне стаць?

ЧАРНАКНІЖНІК
Ёсць адзін сродак...
Толькі спярша
Адкажы, ці прадаецца твая душа.

ІРАД
За вечнасць гатовы ўсё я аддаць!

ЧАРНАКНІЖНІК
(падносіць Іраду нейкі скрутак)
Зрабі ласку вось тут падпісаць...

ІРАД
(ставіць подпіс)
І толькі?

ЧАРНАКНІЖНІК
Не, не толькі!
Подпіс твой пэўны
Мушу Чорнаму магу аддаць –
Узамен эліксір атрымаеш...

ІРАД

(задаволены)
Хоць чарвяк ты нікчэмны,
Але сёння добра гадаеш!
Ідзі прэч!

Ірад хоча прагнаць Чарнакніжніка, аднак той сам паспявае знікнуць.

4.

ЧАРНАКНІЖНІК
(адзін)
Хто душу сваю Д'яблу прадаў –
Назаўжды бессмяротны той стаў!
Толькі стаў такім бессмяротным,
Што й жывы ўжо ходзіць мёртвым!
Хе-хе-хе!..

Чарнакніжнік адвальвае камень ад пячоры, з якой палае агонь, дым, чуваць страхалюдныя гукі. Заходзіць туды.

5.

ІРАД
Гэй, воіны мае ўзброеныя!
Станьце перад тронам вашага цара!

ВОІНЫ
(выходзяць з розных бакоў)
Аць-два, аць-два!
Нашто, цару, воінаў выклікаеш?
Ці які разбой учыніць загадаеш?

ІРАД
У горад Віфляем ідзіце,
Дзяцей ад двух год ад мацярок адбярыце!
Каб малога Хрыста загубіць
І трона мне не пазбыцца –
Пасадзіце ўсіх у цямніцу!

ВОІНЫ
Твае словы – справа святая!
Толькі кішэні зусім пустыя...

ІРАД
Папрашайкі!
(Кідае некалькі манет).
Каб вам удавіцца!

ВОІНЫ
Навошта давіцца,
Калі можна мёду напіцца?

ЧАРНАКНІЖНІК
Ненажэрныя цюцькі, прэч!
А то паляцяць вашы галовы з плеч!
Направа кругом – марш!
(Выганяе воінаў).

ВОІНЫ
Аць-два, аць-два!
(Выходзяць).

6.

Дзеянне пераносіцца ў верхні ярус. У пячоры Язэп і Марыя з Дзіцяткам.

ХОР
Радуйся, Марыя,
Радуйся, Прыснадзева,
Аб нятленным
Раstве тваім!..

МАГІ
Уладыку і Богу
Чэсць даём многу,
Які аж века
Ўмілаваў чалавека!
(Да Марыі з Язэпам).
Перад вамі прыпадаем на калені...

ЯЗЭП
О магі!..

МАРЫЯ

KAMUNIKAT.org

Шчыры дзякуй за вашы прынашэнні!

Магі хочуць ісці, але тут ім насустрач у светлым выпраменьванні ляціць Анёл.

АНЁЛ
Магі-цары шаноўныя!
Іншым шляхам ідзіце,
Да Ірада не заходзіце!
Каб Дзіцятка Хрыста пазбыцца,
Хоча кінуць дзяцей у цямніцу!

МАГІ
Дзякуй, анёле,
Што нам шлях паказаў,
Толькі Ірада апошняга пральецца сляза!

Магі з паклонам выходзяць. Анёл з мечам падлятае да спячага Язэпа.

АНЁЛ
(над Дзіцяткам)
Якая радасць нам адкрылася!
Па супадзенні ўсіх прыкмет –
Надзея наша нарадзілася,
Збавіцеля спазнае свет!
(Будзіць Язэпа).
Язэпе, Язэпе, старча праслаўны!
Устань, вазьмі Дзіця і Матку Яго
І бяжы ў Егіпет, і будзь там,
Дакуль не скажу табе!
Каб Дзіцятка пазбыцца,
Хоча Ірад кінуць Яго ў цямніцу!

ЯЗЭП
(падымаецца)
Дзякуй, анёл, што крылом і рукой
Адганяеш змрочныя цені...
(Будзіць Марыю, пачынаюць збірацца ў дарогу).

МАРЫЯ
Бог адведаў народ свой,
Ды не даў яму выбаўлення...

Зацямненне.

ДЗЕЯ ДРУГАЯ

7.
Гучыць тужлівая музыка. Сцэна паступова святлее. Ідуць стомленыя Язэп і Марыя з Дзіцем.

ЯЗЭП
Ад Віфлеема да Егіпта
Доўгі шлях...

МАРЫЯ
У нагах пануе стома
І ў руках!

Знікаюць за пагоркам. Адразу паказваюцца Воіны, якія цікуюць па іх слядах. Таксама знікаюць за пагоркам. Зноў паказваюцца Язэп з Марыяй.

ЯЗЭП
Ужо сотні кіламетраў
Мы прайшлі...

МАРЫЯ
І нідзе сабе прытулку
Не знайшлі!

Знікаюць за пагоркам. Зноў паказваюцца Воіны. Бягуць следам. Язэп і Марыя паказваюцца з-за іншага пагорка.

І ніхто гаротным нам
Не дапамог.

ЯЗЭП.
На руках тваіх – Дзіцятка,
З намі – Бог!

Знікаюць.

8.



KAMUNIKAT.org

Паказваецца Рахіль. Яна моцна прыціскае сваё спавітае дзіця да грудзей. Аднекуль даносяцца жаночы плач, енкі дзяцей – усё бліжэй, гучней, адчайней... Раптам перад Рахіллю вырастаюць Воіны.

ПЕРШЫ ВОІН
Стой, жанчына!

ДРУГІ ВОІН
Мы храбрыя воіны цара Ірада, аць-два!

РАХЛЬ
Як дзіка, як страшна
Ў роднай жыць старане!
Скажыце, што трэба вам ад мяне?

ПЕРШЫ ВОІН
Ад дзетак Юдэя пазбаўлена ўся!
Аддавай і ты нам сваё дзіця!

РАХІЛЬ
Аддаць вам дзіця? Не, ніколі!
Да Ірада мяне вядзіце,
Буду ў яго прасіць лепшае долі...

ПЕРШЫ ВОІН
Ну, дык ідзі хутчэй!

ДРУГІ ВОІН
Ды жаліцца цару на нас ты не смей!

РАХІЛЬ
Як цяжка у роднай жыць старане!
Хіба толькі анёл абароніць мяне...

І тут нечакана з’яўляецца Анёл. Трубяць трубы, ліецца з вышыняў прамяністае святло.

АНЁЛ
Рахіль, не бойся!
У гэты час
Сам Госпад абароніць нас.

KAMUNIKAT.org

Дай мне зірнуць у твар дзіцяці –
Мой меч адрыне ўсе пракляцці!

Бярэ ў Рахілі скрутак з дзіцем, мяняе на свой, вельмі падобны.

РАХІЛЬ
Анёле¸ дзякую! Аднак
Не разумею штось ніяк
Я слоў тваіх...

АНЁЛ
Суцешся!.. І чакай збавення,
І разам з ім – і разумення.

Анёл знікае. Воіны вядуць Рахіль да Ірада.

9.

Ніжні ярус. Трон Ірада. Воіны штурхаюць перад сабой Рахіль.

ВОІНЫ
О гаспадзіне наш, гаспадзіне!
У Віфлееме мы былі,
Чатырнаццаць тысяч дзяцей схапілі!
Адна Рахіль не хоча дзіця аддаваць,
Прыйшла да цябе міласці шукаць.

РАХІЛЬ
(прыпадае да ног Ірада)
О найсвятлейшы мой цару,
О наймагутнейшы гаспадару,
Не губі майго адзінага сына,
Не кладзі мяне заўчасна ў дамавіну!

ІРАД
Жанчына, ідзі прэч!
А будзеш заступацца,
І на тваёй скуры змагу адыграцца!
Гэй, воіны!
Дзіцятка гэта хапайце,
Без міласці ў цямніцу кідайце!

ВОІНЫ

Тваё слова – справа святая!
Толькі кішэні зусім пустыя...

ІРАД
(раззлавана)
Я са службы вас пазвальняю!
(Запускае руку ў мяшок з грашыма).
Як?! Тут пуста!
То з-за вас, дармаеды, апусцела казна!
А ну, направа кругом – марш!

ВОІНЫ
Дзяржаву, дзе казна пустая,
Болей не абараняем!
(Кідаюць сваю зброю).

Рахіль адыходзіць у цемру.

ІРАД
О трон нашай царскай славы,
Бачу здраду я ў нашай дзяржаве!
Мне без войска надыдзе канец...
Дзе ж ты, мой чарнакніжнік-мудрэц?

Імгненна з'яўляецца Чарнакніжнік.

ЧАРНАКНІЖНІК
Найвялікшы манарша! Гатовы
Я абдзьмухваць пыл з тваіх броваў!

ІРАД
Слуга верны ў часіну гаротнасці,
Ты... прынёс эліксір бессмяротнасці?

ЧАРНАКНІЖНІК
Як, манарша, я абяцаў,
Чорны маг эліксір мне дастаў.
За прадажную душу тваю
Я табе яго аддаю!
(Дае Іраду нейкую бутэлечку. Убок, ціха)
Каб падману замесці сляды,
Налічыў чыстай туды я вады!
Белы дзень яшчэ будзе кругом,

Як я стану ўладаром!
Гэй, воіны! Бліжэй да мяне,
Ірад пракляты,
Пайшоў вон!
(Бразгае манетамі).

ВОІНЫ
Быццам чуецца бразгат манет?!

ІРАД
(з бутэлечкай, у захапленні)
Бессмяротнасць!
Вось слава, і грошы, і свет!
Ля маіх ён раскінецца ног.
Касавокая,
Я перамог!

ЧАРНАКНІЖНІК
Цьфу, лухта!
Воіны! Каб тырана хутчэй пазбыцца,
Кіньце Ірада вы ў цямніцу!
Направа кругом – марш!

ВОІНЫ
А колькі за гэта дасі,
Оваладар новы наш?

ЧАРНАКНІЖНІК
(кідае да ног Воінаў мяшэчкі з грашыма)
Калі выканаеце загад спраўна,
Дык і пагуляеце слаўна!
Не ведаў Ірад, нябога,
Што за яго душу дадуць так нямнога!
Хе-хе-хе!

ВОІНЫ
Ну, аспід пракляты,
Надыходзіць за ўсё расплата!
(Малоцяць Ірада).

ІРАД
А-а-а! Гэта здрада! Разбой!
Ну, Чарнакніжнік,

Ты адкажаш за ўсё галавой!

ЧАРНАКНІЖНІК
(смяецца)
У цямніцу яго!

Воіны валакуць Ірада. З яго галавы падае карона. Чарнакніжнік, падхапіўшы яе, садзіцца на трон.

10.

ЧАРНАКНІЖНІК
Хе-хе-хе!
А цяпер на манаршым троне,
У залатой кароне,
З кніжкай чорнаю і без клапотнасці
Я знайду эліксір бессмяротнасці!

Раскрывае кнігу, пачынае варажыць. Узнімаецца пара, мільгаюць цені зданяў, гучаць іхнія стогны ды нейкае вуркатанне.

ВОІНЫ
Магутны ўладару!
Непераможны гаспадару!
Як загадваў, так і зрабілі, -
Ірада ланцугамі ў склепе скруцілі!

ЧАРНАКНІЖНІК
(раззлаваны, што перашкодзілі)
Каб вы праваліліся!

З цемры выходзіць Рахіль. Яна па-ранейшаму прыціскае да сябе спавіты скрутак.

А яна адкуль тут з'явілася?

ВОІНЫ
Ды хацела яшчэ з намі біцца.
У-у! То Рахіль з дзіцяткам...

ЧАРНАКНІЖНІК
Кінуць іх у цямніцу!

Нечакана з’яўляецца Анёл.

АНЁЛ
Рахіль! Не бойся анікога!
І Богу верна паслужы:
У час пакутлівы і судны
Свае пялюшкі развяжы!

З нябёсаў вогненная кара
Абрынецца хай на таго,
Хто заслужыў яе па праву,
Хто згубца добрага ўсяго!

РАХІЛЬ
А зробяць зло майму дзіцятку?

АНЁЛ
На тое воля Госпада.
Усё ідзе сваім парадкам!

Рахіль распавівае свой скрутак, і адтуль раптам узлятае ў паветра вогненны меч.

РАХІЛЬ
Анёле, ах! Я разумею:
Ты бараніў маё дзіця,
А мне даў меч...

ЧАРНАКНІЖНІК
Абараніце маю шыю!

І абрушваецца меч на Воінаў і Чарнакніжніка, тыя з крыкам уцякаюць. Меч па чарзе адцінае ім галовы. У той жа момант быццам з-пад зямлі з’яўляецца Смерць і з рогатам забірае целы Воінаў і Чарнакніжніка.

СМЕРЦЬ
На полі, дзе ўзрастае злое,
Жніво збяру я неблагое!
(З рогатам знікае).

Меч вяртаецца ў рукі Анёла.

KAMUNIKAT.org

11.

На верхнім ярусе: Анёл з мечам у адной руцэ, побач – са светлай усмешкай Рахіль.

АНЁЛ
Цяпер і Усявышняга ўславіць можна –
Трымай дзіця сваё асцярожна!
(Перадае дзіця Рахілі).

РАХІЛЬ
Дзякуй, анёле!
Вой!..
(Бачыць, як з падзямелля выбіраецца цар Ірад).

АНЁЛ
Не бойся, Рахіль, я з табой!

Анёл адкідвае меч, падхоплівае Рахіль, яны адразу знікаюць.

12.

Ірад нарэшце выбраўся наверх. На руках яго грымяць разарваныя ланцугі.

ІРАД
Нахабства, здрада, разбой!
Варажбіт нікэчмны,
Ты адкажаш за ўсё галавой!
(Азіраецца).
Што такое? Мой вольны трон?
(Знаходзіць кнігу Чарнакніжніка).
Дух паскудных прыслужніаў, вон!
(Выкідвае кнігу, заўважае кінуты Анёлам меч).
Сілу ўлады мацуе хай меч!
(Некалькі разоў ім узмахвае).
Я – цар Ірад, цар несмяротны,
Свет заскача пад мае толькі ноты!
А хто ўспомніць Ісуса –
Замаўчаць я навечна прымушу!

З-пад зямлі з’яўляецца Смерць.

СМЕРЦЬ
Чаго ж мяне не ўспамінаеш,
Гожую паненку забываеш?
О ты, Ірад, цар пракляты!
Хопіць табе ўладарыць,
Пекла цябе чакае,
Чэрці косці табе папараць!

ІРАД
Не, Смерць, чортава маці,
Мне ніколі ўжо не ўміраці,
Хачу з табою я ваяваці!

Нападае на Смерць.

СМЕРЦЬ
Ах ты, Ірад, цар пракляты!
Не хочаш мне ў рукі аддацца,
Хочаш са Смерцю змагацца?
Як паклічу я брата
З пекла заўзята,
То будзеш знаць,
Як нявінных дзетак у цямнгіцу кідаць!
Д'ябал, брат!

Д'ЯБАЛ
Што, Смерць-сястра?

СМЕРЦЬ
Цар Ірад хоча са мною змагацца,
Не хоча Смерці ў рукі аддацца!

ІРАД
Не аддамся ні Д'яблу, ні Богу,
У мяне наперадзе гадоў яшчэ многа!

Д'ЯБАЛ
(паказвае скрутак)
О Ірад пракляты!
Ты прагадаў.
Твой подпіс?

KAMUNIKAT.org

ІРАД
Мой...

Д'ЯБАЛ
А значыць, душу ты сваю
Д'яблу прадаў!

ІРАД
Не, не жадаю!

Д'ЯБАЛ
Я з сабою цябе забіраю!
Вазьмі, сятра, касу,
Зрубі цару галаву!

СМЕРЦЬ
Спявайце яму магільную песню!

ХОР
О, страшна, страшна бачыць нам
Пякельныя мукі!
Смерць грэшнага чалавека
Бярэ ў свае рукі.

У гэты час Ірад мітусіцца паміж Смерцю і Д'яблам.

СМЕРЦЬ
Надмагільная песня табе прапета,
Пазбаўляю цябе я белага свету!
(Падносіць да Ірада касу).
Панюхай!

Смерць здымае Іраду галаву. Ён падае.

Д'ЯБАЛ
Хадзем, брат,
У пекла есці вінаград!
Будзем з табою ў карты гуляць
І старых баб забаўляць!
(Б'е Ірадава цела, калоціць і цягне).

Смерць знікае разам з імі.

kamunikat.org

13.

Выходзяць святы Язэп, Анёл, Дзева Марыя і Рахіль. Жанчыны трымаюць кожная сваё дзіця.

ХОР
У небе ўсе анёлы разам лікуюць,
Тры цары дары ахвяруюць.
Сёння нараджоны,
У яслях палажоны
Паміж сена і скоці
З'явіўся ў радасці й плоці!

Будзе і прарок вяшчаша:
Радзіла Дзева спасенне наша,
Што отрака без прарока!
Радзіла ў Віфлееме,
Марыя, Марыя,
З Язэпам у Егіпце скрываліся,
Разам з Дзіцяткам
Ад злых воінаў хаваліся;
Дзе бывалі, прабывалі
Паміж славай,
Паміж дубравай
Грознага цара Ірада!

Мы вас паздраўляем,
Доўга жыць жадаем.
Весела жывіце
І нас наградзіце.
Яшчэ шчырым
Сэрцам мілым
Прыступімо, прынасімо
Чэсць, хвалу многу
Хрысту Богу!

Канец.

## КІРМАШОВЫ БАЛАГАН
Камічныя падзеі ў дзвюх дзеях

**Дзейныя асобы:**

ДЗЕД ПАНАС.
БАБА ПАЛАШКА.

## ДЗЕЯ ПЕРШАЯ

### К А З К А  П Р А  К А Л А Б К А

Да гледачоў выходзяць ДЗЕД ПАНАС і БАБА ПАЛАШКА. Сьпяваюць:

Як на лялечны кірмаш
З бабай дзед патрапіў наш!
Як на гэтым кірмашы –
Усе робяць барышы!
Мы ж – артысты-сьмехачысты,
Гандляваць ня можам чыста;
Ды за тое на пацеху
Прапануем вам уцехі,
Прапануем казачку,
Не адну, а вязачку!..

ПАНАС. Ай, дык базар, вось дык кірмаш!.. Каго тут толькі ня маш!.. І мамы, і таты, бы цукерачкі зь мяты, і іхнія дочкі, бы мачоныя груздочкі, і сыночкі-чыжыкі, бы салёныя рыжыкі!..

ПАЛАШКА. Галоўнае, што ёсьць Дзед і Баба, то й справа пойдзе ня слаба!..

ПАНАС. А справа наша такая, што кожны сабака нас знае!..

ПАЛАШКА. Гэй, Панас! Што ты вярзеш?

ПАНАС. Тое, сэрцайка маё залатое, што ты, Палашка, -- здаецца, артыстка, а не манашка?..

ПАЛАШКА. Так, так! Нам гандляваць-шандыхляць не прыстала: нам бы людцаў павесяліць!..

ПАНАС. А нішто, Палашка, добра сказала!.. Гэй, шаноўная публіка! Рыхтуй скарэй свае грошыкі, даставай з торбачак сала!..

ПАЛАШКА. Шаноўнае панства! Прапануем штучкі без ашуканства!.. Лялечны балаганчык: тут вам і казка, тут вам і танчык!

ПАНАС. Паважнае спадарства! Зірніце на наша штукарства: дзеткам – на пацеху, дарослым – для сьмеху!.. *(Адчыняе куфэрчык.)* А вось і лялечкі!..

ПАЛАШКА *(забірае ініцыятыву ад Панаса).* Вось лялечкі драўляныя, рознымі фарбамі маляваныя! Глядзіце, дарослыя і дзятва, на гэтыя лялечкі не для хараства, на гэтыя лялечкі не для славы – для ўцехі душы і рознай забавы!

ПАНАС. Э, хараство-не хараство… Давай, Палашка, пакажам нашае рамяство!.. Якую сёньня казку расказваць будзем?..

ПАЛАШКА. Якую? Ды хоць пра гэтага… во! Калабочка!

ПАНАС. Значыць, так! Жылі-былі Дзед… *(Дастае ляльку ДЗЕДА).* Вось такі!..

ПАЛАШКА. І Баба!.. *(Дастае ляльку Бабы.)* Вось такая!..

ПАНАС. Дзед раскланьваецца на ўсе бакі *(раскланьвеецца разам з Дзедам)*, буськаю прыпадае на бабінае рукі.*(Прыпадае буськаю да рукі Палашкі.)*

ПАЛАШКА. Вой, дзед, ідзі ты!..

ПАНАС. Дзетак у іх не было…

ПАЛАШКА *(сумна ўздыхае).* Не было…

ПАНАС. А так хацелася!

БАБА. Я ўся аж зардзелася!..

ПАНАС. Тут Дзед і кажа…

ДЗЕД. А што, баба, сьпячы калабочка – будзе ён нам за сыночка!

БАБА. Дык з чаго пекчы, з якога маку, калі ўся мука яшчэ летась пайшла на блінцы ды прысмакі?

ДЗЕД. А ты ў засеку паскрабі…

БАБА. Скрабу, дзеду, скрабу…

ДЗЕД. У карабцах падмяці…

БАБА. Мяту, дзеду, мяту…

ДЗЕД. Мяшкі патрасі…

БАБА. Трасу, дзеду, трасу…

ДЗЕД. Дадай пылу, пяску…

БАБА. Ага!..

ДЗЕД. Пракіслага кваску, моху, чартапалоху, тоўчаных жабаў троху…

БАБА. Дзеду! Ты што?!. *(Палашка грукае па драўлянае галаве Дзеда.)*

ДЗЕД. Вой! Кінь солі драбок… Цеста замясі – і ў печ!

ПАЛАШКА. Усё Баба зрабіла, цеста замясіла, скатала калабок, абмазала масьліцам бок, паставіла ў печ, а ён – з печы скок!

КАЛАБОК. Добры дзень! Я – вясёлы калабок! Цукровыя шчочкі, мядовыя бачочкі, макавыя вочкі!..А вы хто?

БАБА. Я – твая матуля.

ДЗЕД. А я твой татуля.

БАБА. Ай, калабочак!

ДЗЕД. Родны ты наш сыночак!

БАБА. Які ладненькі!

ДЗЕД. Які гарненькі!

КАЛАБОК. Пф!.. І ў печы сьпякота, і ў хаце горача. У халадок ахвота.

БАБА. Што ты, мой калабочку? Зараз мы вакенца расчынім, на падваконьне цябе паставім – будзеш, бы пан, у садочку!

ПАЛАШКА. Паставіла Баба Калабка на вакенца, на яго з Дзедам дзьмухаюць, ручнічкамі абмахваюць. Вось так!.. *(Дзьме на Панаса, абмахвае ручнічком.)*

ПАНАС. И вось так!.. *(Таксама дзьме ды абмахвае Палашку.)*

КАЛАБОК. Я – вясёлы калабок! Калабок, калабок!
На сьмятане мешаны,
Ды на масьле печаны,
Мой бачок румяны,
Сам я – цукар з маннай!
Я – вясёлы калабок! Калабок, калабок!
Я з акенца – скок-паскок! Скок-паскок, скок-паскок!

*(Саскоквае з вакенца.)*

БАБА. Пастой, калабочак! Куды ж ты, сыночак!

КАЛАБОК. Хачу пагуляць, белы сьвет пабачыць!

БАБА. Калабок, вярніся! Яшчэ злыя зьвяры зьядуць.

КАЛАБОК *(даносіцца голас ужо здалёк)*. Не зьядуць! Бывай, татуся! Да сустрэчы, мамуся! *(Бяжыць і сьпявае:)*

Я – вясёлы калабок, калабок!
Па сьцяжыне – скок-паскок, скок-паскок!
І ад дзеда я уцёк, я уцёк!
І ад бабы я уцёк, я уцёк!..
Я – вясёлы калабок, скок, скок, скок!

ДЗЕД. Хай пабегае. Можа, і не зьядуць зьвяры нашага калабка…

БАБА. Цыц! Маўчы, дзеду!..

ДЗЕД. Маўчу, маўчу.

ПАНАС. А наш калабок далей скок-паскок, калюжыну пераскочыў, з дарожкі збочыў…

ПАЛАШКА. …перабег цераз кладку і трапіў… проста на зайкаву градку!

ПАНАС *(дастае ЗАЙЧЫКА).* На градцы – зайчык Міцяйчык, капусту-агурочкі палівае, як заморыцца – на гармоньцы песенькі грае!..

ЗАЯЦ. Ты зайграй, гармонь-трохрадка,
Палівайся, мая градка!
Хоць і поўна "шчэ работы,
Толькі мне іграць ахвота!

Будзе мала ураджаю,
Калі я тут не зайграю!
Палівайся, градачка,
Ты іграй, трохрадачка!

*(Заўважае Калабка.)*

Стой!

КАЛАБОК. А я і так стаю.

ЗАЯЦ. Ты хто?

КАЛАБОК. А ты хто?

ЗАЯЦ. Я – Заяйчык Міцяйчык. Працую з ранечы да самай цямрэчы: няма калі паабедаць нават.

КАЛАБОК. А я Калабок.

ЗАЯЦ. Калабок?..

КАЛАБОК. Ага.

Я – вясёлы калабок, калабок!
Па сцяжыне – скок-паскок, скок-паскок!
І ад дзеда я уцёк, я уцёк!
І ад бабы я уцёк, я уцёк!..

Я – калабок, цукровыя вочкі, мядовыя бачочкі, макавыя вочкі!

ЗАЯЦ. Цукровыя шчочкі, макавыя вочкі?.. Дык я цябе зьем!

КАЛАБОК. Мяне?! За што ж мяне есьці?

ЗАЯЦ. За цукровыя шчочкі, макавыя вочкі!

КАЛАБОК. Не, Зайчык Міцяйчык, так ты не наясіся.

ЗАЯЦ. Наемся. Яшчэ як наемся!

КАЛАБОК. Не. Пачнеш мяне есьці, толькі-толькі ў смак увойдзеш, а тут я і скончыўся. Лепей ты іначай зрабі.

ЗАЯЦ. Што іначай?

КАЛАБОК. Лепей пасадзі… калабковае дрэва!

ЗАЯЦ. Калабковае дрэва?..

КАЛАБОК. Так, калабковае дрэва!

ЗАЯЦ. А ты ня хлусіш?

КАЛАБОК. Не. Капай хутчэй!

ЗАЯЦ. Ну, добра… *(Пачынае хутка-хутка капаць ямку.)*

Эх, іграй, мая трохрадка!
Ты капайся, мая градка!..

КАЛАБОК. Толькі ты глыбей ямачку капай!

ЗАЯЦ *(ужо з глыбіні).* Капаю, капаю!

КАЛАБОК. Капай, капай!

ЗАЯЦ. Капаю, капаю!

КАЛАБОК. Глыбей, глыбей!

ЗАЯЦ. Капаю, капаю!

*(Заяц выкопвае глыбокую яму, з якой яму аніяк ня вылезьці.)*

КАЛАБОК. Яшчэ глыбей! А я табе сваю песеньку прасьпяваю!

Я – вясёлы калабок, калабок!
Па сьцяжыне – скок-паскок, скок-паскок!
І ад дзеда я уцёк, я уцёк!
І ад бабы я уцёк, я уцёк!..
І ад цябе, Зайчык Міцяйчык, пагатоў уцяку!

*(Уцякае.)*

ЗАЯЦ. Гэй, хто-небудзь! Дапамажыце! Дапамажыце, дастаньце мяне адсюль!..

ПАЛАШКА. А наш калабок са сьцяжынкі – убок, ды па лесе далей пакаціўся!..

*(Коціцца далей Калабок ды песеньку сьпявае:)*

КАЛАБОК.

Я – вясёлы калабок, калабок!
Па сьцяжыне – скок-паскок, скок-паскок!
І ад дзеда я уцёк, я уцёк!
І ад бабы я уцёк, я уцёк!
І ад зайчыка Міцяйчыка уцёк, я уцёк!!

ПАНАС *(дастае ВАЎКА).* Коціцца наш калабок, кругленькі, як клубок, а тут насустрач – Воўк Папіхач, стрэльбу на пузе трымае: бачна адразу, што не смаркач!

ВОЎК *(сьпявае).*

Баязьліўцы, на калені!
Я – Папіхач, воўк страшэнны!
Стрэльбу моцна я трымаю,
Рокі ўгору! Я страляю!

Толькі ночачка настане:
Мая справа – паляваньне!
Узьніму высока рулю,
Эх, здабычачку ўпалюю!

*(Заўважае Калабка.)*

Стой! Страляць буду!

КАЛАБОК. Стаю.

ВОЎК. Страляю! *(Стрэльба Ваўка страляе, і зьверху падае зьбіты жолуд.)* Ты хто? Рукі ўгору!

КАЛАБОК. Я – калабок, масьляны бок, замешаны на манне, печаны на сьмятане! *(Сьпявае:)*

Я – вясёлы калабок, калабок!
Па сьцяжыне – скок-паскок, скок-паскок!
І ад дзеда я уцёк, я уцёк!
І ад бабы я уцёк, я уцёк!
І ад зайчыка Міцяйчыка уцёк, я уцёк!!

А ты хто?

ВОЎК. А я – воўк Папіхач, іду з паляваньня, нічога ня еў… *(папраўляецца)* не ўпаляваў!.. з самага раньня. А можа, і з вечара… Дык на чым ты там сьпечаны?

КАЛАБОК. На сьмятане!

ВОЎК *(сам сабе)*. Добра каўтнецца, у горле ня стане!.. Здабыча сама ў лапы ідзе! Ну, калабок, я таго… я цябе зьем!

КАЛАБОК. Вой! За што?!

ВОЎК. Надта ты, я бачу, румяны! Пахушчы!.. М-м!.. Аж у носе засьвя-а… а!.. Апчхі! *(Воўк чыхае, нават стрэльба страляе, зьверху падае зьбітая варона.)* Засьвярбела!.. Апчхі! *(Воўк чыхае, стрэльба страляе, зьверху падаюць зьбітых дзьве вароны.)*

КАЛАБОК. Будзь здароў! А… а… а як жа тваё паляваньне?

ВОЎК. А што паляваньне? Вось зараз табой падсілкуюся і далей пайду паляваць! Бач, які ты пахушчы! Апчхі!

*(Воўк чыхае, стрэльба страляе! Зьверху падае таўшчэзы сук ды гэпае Ваўку проста па галаве. Ён падае, непрытомны.)*

КАЛАБОК *(уцякаючы, сьпявае:)*

Я – вясёлы калабок, калабок!
Па сьцяжыне – скок-паскок, скок-паскок!
І ад дзеда я уцёк, я уцёк!
І ад бабы я уцёк, я уцёк!
І ад зайчыка Міцяйчыка уцёк, я уцёк!!
І ад ваўка Папіхача уцёк, я уцёк!!!

ПАЛАШКА. Выляцеў з лесу наш каравайчык, глядзіць…

ПАНАС *(дастае ляльку МЯДЗЬВЕДЗЯ).* Кульгецькумільгець… Выходзіць насустрач яму сам Бурдулай-Мядзьведзь!

МЯДЗЬВЕДЗЬ *(сьпявае:)*

Кветачак на полі на маім даволі,
З чмелікам на пару я тут гаспадару.
Загулі-загулі па вясьне ўсе вульлі,
І даўно ня сьпіцца пчолкам-працаўніцам.

Люба на паляне слухаць пчолак граньне,
Добра ў халадочку паспытаць мядочку!

*(Пачынае лічыць пчол.)*

Першая пчолка, другая пчолка… трэцяя пчолка… чацьвёртая пчолка… пятая пчолка… *(Заўважае Калабка.)* О! А ты хто такі?

КАЛАБОК. Я – калабок! *(Сьпявае:)*

Я – вясёлы калабок, калабок!
Па сьцяжыне – скок-паскок, скок-паскок!
І ад дзеда я уцёк, я уцёк!
І ад бабы я уцёк, я уцёк!
І ад зайчыка Міцяйчыка уцёк, я уцёк!!
І ад ваўка Папіхача уцёк, я уцёк!!!
І ад цябе, мядзьведзь Бурдулай, таксама ўцяку!
Таму што гэта я – вясёлы калабок,
Цукровыя шчочкі, макавыя вочкі, мядовыя бачочкі!..

МЯДЗЬВЕДЗЬ. Мядовыя!.. Ты бач: і сам хлебны, і бачочкі мядовыя. А ў мяне мёду шмат, а хлеба – няма. Я цябе зьем!

КАЛАБОК. Вой! А можа, ня трэба?

МЯДЗЬВЕДЗЬ. Зьем, зьем, не сумнявайся! Даўно я сьвежага мякіша не каштаваў. З мядком ды ладком самы раз будзе.

КАЛАБОК. А… а… а як жа ты мяне есьці будзеш?

МЯДЗЬВЕДЗЬ. А во ў мёд умакну – і кусь-кусь, у мёд умакну – і гам-гам!

КАЛАБОК. Ну навошта табе, мядзьведзь Бурдулай, лішні раз над вульлямі нагінацца?

МЯДЗЬВЕДЗЬ. А што, мне ня цяжка.

КАЛАБОК. Вой, лепш пасядзі, адпачні, птушак паслухай! А я сам у вулей залезу, сам у мядок умакнуся. А потым сам і ў рот табе ўскочу!

МЯДЗЬВЕДЗЬ. Сам у рот ускочыш? *(Узрадавана.)* О, давай!

КАЛАБОК. Бяры вулей у лапы…

МЯДЗЬВЕДЗЬ. Бяру…

КАЛАБОК. Заплюшчы вочы…

МЯДЗЬВЕДЗЬ. Заплюшчваю…
КАЛАБОК. Адкрый рот…
МЯДЗЬВЕДЗЬ. Адкрываю…
КАЛАБОК *(грукае па вульлю, адтуль вылятаюць пчолы).* Гэй, пчолы!! *(Калабок хаваецца ў вулей.)*
МЯДЗЬВЕДЗЬ *(адбіваецца ад пчолак, якія адразу рынуліся на яго!..)* Ай, ай! А-я-я-яй!..
КАЛАБОК *(выскоквае з-пад крышкі вульля).* Ха-ха-ха!
Я – вясёлы калабок, калабок!
На пчальнік я скок-паскок, скок-паскок!
І ад дзеда я уцёк, я уцёк!
І ад бабы я уцёк, я уцёк!
І ад зайчыка Міцяйчыка уцёк, я уцёк!!
І ад ваўка Папіхача уцёк, я уцёк!!!
І ад мядзьведзя Бурдулая ўцёк, я уцёк!!!!
ПАНАС. Наш калабок – далей скок-паскок, у траве як мышка, далёка адбег ад нягеглага Мішкі!
ПАЛАШКА. Ай ты, гарэза, наш калабок! Коціцца сабе далей бы клубок, песеньку сваю сьпявае; а тут…
*(Дастае ляльку ЛІСЫ.)*
ЛІСА *(сьпявае:)*
Я – Анфіса, я карчмарка,
Мае справы ідуць шпарка:
Усё схоплена удала,
Там – прыбыткі, тут – даляры!

Хто заходзіць, той каштуе
Страву смачную, любую!
Ды пад вострую прыправу
З Ліскай вып”еце на славу!
*(Заўважае Калабка.)*
Малады чалавек, вам чаго?..
КАЛАБОК. Вой! А я не чалавек.
ЛІСА. А хто? *(Прынюхваецца.)*
КАЛАБОК. Калабок.
ЛІСА. Калабок! Мядовыя шчочкі, масьляны бок?..
КАЛАБОК. Ага!
ЛІСА. О, як добра! Як цудоўна! *(Сама сабе.)* Якраз такой стравы ў мяне яшчэ не было!
КАЛАБОК *(сьпявае:)*
Я – вясёлы калабок, калабок!
Па сьцяжыне – скок-паскок, скок-паскок!
І ад дзеда я уцёк, я уцёк!

I ад бабы я уцёк, я уцёк!
I ад зайчыка Міцяйчыка уцёк!!
I ад ваўка Папіхача я уцёк!!!
Ад мядзьведзя Бурдулая я уцёк!!!!
I ад цябе, Ліска Анфіска, пагатоў уцяку!!!!!

ЛІСА. Уцячэш? Не, з маёй карчмы проста так яшчэ ніхто не ўцякаў. Калабок, калабок, скокні, калі ласка, на талерачку!

КАЛАБОК. А… навошта?

ЛІСА. Хачу паглядзець, які ты на ёй прыгожанькі!

ПАЛАШКА *(дапамагае Калабку заскочыць на талерачку).* Скокнуў Калабок на талерачку…

ЛІСА. Вой! I праўда, прыгожанькі!.. Давай я цябе зелянінкаю абкладу…

КАЛАБОК. Абкладзі, абкладзі!..

ПАЛАШКА. Абклала Ліска Анфіска калабка зелянінкаю…

ЛІСА. Давай я цябе перчыкам папярчу…

КАЛАБОК. Папярчы, папярчы!..

ЛІСА. Давай я цябе кетчупам пальлю….

КАЛАБОК. Палі, палі!..

ЛІСА. Давай я цябе морквачкай упрыгожу!

КАЛАБОК. Упрыгож, упрыгож!..

ЛІСА. Давай я цябе ў рукі вазьму!

КАЛАБОК. Вазьмі, вазьмі!

ПАЛАШКА. Узяла Ліска Анфіска талерку з калабком у рукі… I раптам… гам-гам-гам!.. ням-ням-ням! – дый зьела нашага калабочка!

ЛІСА. М-м!.. Як смачна!

ПАНАС *(да Палашкі).* Ат, баба дурная! Што ты нарабіла? Як далей цяпер казку расказваць, чым публіку забаўляць?

ПАЛАШКА. Ай, Панаска, гэтых казак у нас – цэлая вязка! I да вязкі яшчэ *(паказвае)* – от такі мех!.. Хопіць на ўсіх розных пацех! *(Зьвяртаецца да гледачоў.)* Так што, дзеткі маленькія, а з дзеткамі – цёці й дзядзі бальшэнькія, ня вешайце насы на дручочкі: абвяшчаем антракт! А антракт – гэта вам ня ночка! Не пасьпееце халявы ў ботах паправіць, як пасьля перапынку вам новую казку справім! Пайшлі, Панас, ужо, чую, сала ды салёныя агурочкі зачакаліся нас!!!

З А С Л О Н А

К А Н Е Ц   П Е Р Ш А Е   Д З Е І

## ДЗЕЯ ДРУГАЯ

### К А З К А П Р А Б Ы Ч К А – С М А Л Я Н О Г А Б А Ч К А

Выходзяць Панас і Палашка.

ПАНАС. Ну, што, Палашка?.. Здаецца, чыста пайшла наша справа ды гладка!

ПАЛАШКА. Ці крыва, ці гладка, – пачнем, Панаска, спачатку!

ПАНАС. Спачатку?.. Ну, давай! Значыць, так! Жылі-былі Дзед... *(Дастае ляльку ДЗЕДА).* Вось такі!..

ПАЛАШКА. І Баба!.. *(Дастае ляльку Бабы.)* Вось такая!..

ПАНАС. Дзетак у іх не было...

ПАЛАШКА *(сумна ўздыхае).* Не было...

ПАНАС. А так хацелася!

ПАЛАШКА. Ай, Панас, так ужо было!.. Спачатку давай!..

ПАНАС. Спачатку? Ну, давай... Значыць, так. Жыў-быў дзед...

ПАЛАШКА. І баба!

ПАНАС. Дзетак у іх не было...

ПАЛАШКА. Не было!

ПАНАС. А так хацелася!

ПАЛАШКА. Ды што ты, Панасе?! Была ужо такая казка! Ня ўмееш толкам казкі расказваць – хоць скацінку якую зрабі. Я хаця б папасу яе ўволю!

ПАНАС. Ды з чаго рабіць, га? У засеках пуста, у мяшках мышы дзюркі даўно праелі!

ПАЛАШКА *(ідзе ў наступ на Панаса).* Ах ты, Панас, такі-сякі! Бач, які ўпарты: хоць лобам тваім набівай гузакі! Зрабі скацінку! Хачу скацінку! Зрабі мне скацінку!

ПАНАС. А я вось зараз тупну нагою, а затым другою! А ну, цыц!

ПАЛАШКА *(такога не чакаўшы...)* Скацінку...

ПАНАС. Я сказаў цыц! Зраблю я табе скацінку. А пакуль ідзі... мух пабі.

ПАЛАШКА. Пайшла Баба, лупіць мух заўзята, няслаба!..

ПАНАС. А Дзед узяў пук саломы, чатыры палкі, вяроўку-хвост, вядро смалы ды рожкі з картона: робіць Бычка – смалянога бачка. Рабіў, рабіў... ледзь-ледзь порткі свае не згубіў!.. Зрабіў, сушыцца паставіў.

ДЗЕД. Ну вось...

БАБА. Вой, бычок!

ДЗЕД. Ага, смаляны бачок. Будзе табе за скацінку.

БАБА. Дзякуй табе, дзеду! Дзякуй табе, родны!

ДЗЕД. Чаго там! Гэта ж табе… хацелася!

БАБА. Пайшлі, бычок, я цябе пасьвіць буду!

ПАЛАШКА. Павяла Баба бычка на лужок. Ідуць ды сьпяваюць:

Наш бычочак – як клубочак!
Смаляны яго бачочак!
І махастенькі хвасточак,
І крутасьценькі лабочак,
І капытцам – цок, цок, цок!
Цок, цок! Цок, цок, цок!
Ножкай Быця – тупу-тупу.
Вочкам Быся – лупу-лупу.
Ражком Целя – бука-бука.
Хвастом Мыка – махі-махі.
Горлам Быка – рыкі-рыкі.
Па садочку – грукі-грукі.
Па лужочку – стукі-стукі!

ПАНАС. А тут насустрач –зайчык Міцяйчык…

ЗАЯЦ *(сьпявае:)*

Ой ты, воля-волечка!
Выйду я у полечка!
А каб выйшаў я з бычочкам,
Было б ўсё ў мяне ладочкам!
А каб выйшаў я з цяляткам,
Было б ўсё ў мяне парадкам!

*(Заўважае Бычка.)*

О, бычок! Якраз мне поле араць.

ПАНАС. Глянуў Зайчык туды-сюды: ці не накліча якое бяды?.. Разьвёў вушы свае па баках ды лапкай… – бах!

ЗАЯЦ. Быцю, быцю! Хадзем са мной! Вой! О-ё-ёй! Адпусьці мяне, бычок!

ПАЛАШКА. Толькі наш бычок ножкай – топ-топ, капыточкам цок-цок, і прывёў зайца да бабы з дзедам…

ДЗЕД. Вось дык заяц! Паш”ю табе, баба, рукавіцы, сабе – шкарпэткі, а ўжо скварак колькі насмажым!.. *(Выкочвае бочачку з надпісам “СКВАРКІ”.)*

ЗАЯЦ. Адпусьціце мяне!

ДЗЕД. У склеп яго!..

БАБА. У склеп!

ПАЛАШКА. Схавала баба зайца ў склеп…

ПАНАС. Каб толькі, бядак, ад сполаху там не скалеў, не асьлеп!..

БАБА і ДЗЕД. Дзякуй табе, наш бычок! Паклон табе ў ножкі, смаляны бачок! Каб ня ты, наш бысю, дык зайцы б у нас зусім не вяліся!..

БАБА. Пайшлі, бычок, зноў на лужок!

*(Ідуць ды сьпяваюць:)*

Ножкай Быця – тупу-тупу.
Вочкам Быся – лупу-лупу.
Ражком Целя – бука-бука.
Хвастом Мыка – махі-махі.
Горлам Быка – рыкі-рыкі.
Па садочку – грукі-грукі.
Па лужочку – стукі-стукі!

ПАНАС. Выходзіць з лесу воўк Папіхач...

ВОЎК. Эх, каб меў бы я бычочка!
На яго б я хутка ўскочыў!
На дыбкі бычок як стане –
Вось дык будзе паляваньне!..

*(Зьбіраецца чыхнуць.)* А... а... *(Акуратна кладзе на траву стрэльбу ды голасна-смачна чыхае! Ужо спакойна бярэ ў лапы стрэльбу, і раптам яна страляе, а з неба падае зьбіты самалёт!.. Праводзіўшы яго поглядам, заўважае Бычка.)* О, бычок! Якраз мне на паляваньне езьдзіць! А ну, хадзем!

ПАНАС. Маргнуў-зіркануў па баках воўк, ды Бычка за смаляны бачок – зубамі шчоўк!

ПАЛАШКА. Воўк туды, воўк сюды: не адчапіцца, бедаку, ад бяды!

ВОЎК. Э-э... А-а-а! Гэй, бык, ты што?! Адпусьці!..

ПАЛАШКА. Толькі наш быкусенька – тапу-тапу-тусенькі – і прывёў ваўка да дзедавай хаткі...

ДЗЕД. О, будзе бабе ваўчыная шуба, мне – шапка, а ўжо скварак колькі насмажым! *(Выкочвае яшчэ большую бочку з надпісам “СКВАРКІ”.)*

ВОЎК. Адпусьці мяне, дзед! Я харошы! Я вашаму бычку нічога не зрабіў!

ДЗЕД. У склеп яго!

БАБА. У склеп!

ПАЛАШКА. І ваўка баба ў склеп глыбокі хавае; а той лапаю дрыгае, перажывае!

БАБА і ДЗЕД. Дзякуй табе, бычочак! Паклон табе ў ножкі, смаляны бачочак! Каб ня ты, наш бысю, дык зайцы з ваўкамі ніколі б у нас не вяліся!..

БАБА. Пайшлі, бычок, дам табе сьвежай траўкі!
ПАЛАШКА. Павяла Баба бычка зноў на лужок. Ідуць ды сьпяваюць:

Ножкай Быця – тупу-тупу.
Вочкам Быся – лупу-лупу.
Ражком Целя – бука-бука.
Хвастом Мыка – махі-махі.
Горлам Быка – рыкі-рыкі.
Па садочку – грукі-грукі.
Па лужочку – стукі-стукі!

ПАНАС. А тут ідзе з пчальніку Мядзьведзь…
МЯДЗЬВЕДЗЬ.

Эх, каб мне пад ночку раздабыць бычочка!
Каб вазіць ў бярлогу з мёдам мае бочкі!
Няхай пчолкі кружаць, а бычок мне служыць,
Вечаровым часам робіць мне запасы!

*(Заўважае бычка.)*

Бычок! Якраз мне мёд у бярлогу вазіць. Пайшлі, бычок, да мяне!
ПАНАС. Азірнуўся мядзьведзь – здаецца, нікога… Хап за Бычка і давай равець!..
МЯДЗЬВЕДЗЬ. У-а-аа! Адпусьці мяне, бычок!
ПАЛАШКА. Толькі Бычок-смаляны бачок: туп-туп, топ-топ – і мядзьведзя да Бабы з Дзедам за сабой прывалок!
ДЗЕД. Ну вось, будзе бабе мядзьвежая шуба, мне – кажух, а ўжо скварак –дык мерана-ня мерана насмажым! *(Выкочвае тры бочкі з надпісамі "СКВАРКІ", "СКВАРКІ", "СКВАРКІ".)*
МЯДЗЬВЕДЗЬ. Адпусьціце мяне. Я незнарок… Ён сам да мяне прыліп!
БАБА. У склеп яго!
ДЗЕД. У склеп!
ПАНАС. І мядзьведзя Дзед у склеп – кідзець! А ён там рычаць, а ён там равець!.. *(Чутно, як раве Мядзьведзь.)*
БАБА і ДЗЕД. Дзякуй табе, бычочак! Паклон табе ў ножкі, смаляны бачочак! Каб ня ты, наш бысю, дык зайцы і ваўкі, а разам мядзьведзі ніколі б у нас не вяліся!..
БАБА. Э-гэй, бычок-смаляны бачок! Пайшлі!
ПАЛАШКА. Павяла баба бычка на лужок ізноў. Ідзе бычок, рыкае, хвосьцікам матляе, ножку адстаўляе, песеньку сьпявае:

БЫЧОК. Ножкай Быця – тупу-тупу.

Вочкам Быся – лупу-лупу.
Ражком Целя – бука-бука.
Хвастом Мыка – махі-махі.
Горлам Быка – рыкі-рыкі.
Па садочку – грукі-грукі.
Па лужочку – стукі-стукі!

ПАНАС. А тут Ліска Анфіска, лапкамі сваімі –дрыб-дрыб-дрыб! – крадзецца да Смалянога Бачка зусім блізка!

ЛІСА. Дзе ж ты мой бычок, бычочак?
Павазіць усіх, хто хоча, --
Ўсё па кругу і па кругу!
Будзь Лісе найлепшым другам!

*(Заўважае Бычка.)*

О, бычок! Якраз мне такі трэба карусель круціць, публіку ў карчму залучаць-вабіць! Агу, агу, бысенька! Хадзем са мной!..

ПАЛАШКА. Азіраецца Ліска: ці няма каго блізка?.. Да бычка – крадком, цап-лап і…

ПАНАС. Прыліпла! Хоць і ня хоча – ды цягнецца сьледам за Смаляным Бачком!

ЛІСА. Вой-вой-вой! Ай-ай-ай! Адпусьці мяне, бысенька! Адпусьці, харошанькі!..

ПАЛАШКА. Толькі наш бычок: дрыг-дрыг, цок-цок! – цягне лісу да бабы з дзедам.

ДЗЕД. Глядзі, баба, якое футра табе з лісіцы будзе. А скварак… цьфу! Зусім ня будзе!..

ЛІСА. Адпусьціце! Пашкадуйце, мілыя людзі!

БАБА. Яшчэ чаго! У склеп яе!

ДЗЕД. У склеп!

ПАНАС. І Лісу ў склеп – шварк! Ну, браточкі, ужо цэлы тут заапарк! Не!

ПАЛАШКА. Што “не”?

ПАНАС. Бярэзінскі запаведнік!

ПАЛАШКА. Не!

ПАНАС. Што “не”?

ПАЛАШКА. Белавежская пушча!

БАБА і ДЗЕД. Дзякуй табе, бычочак! Паклон табе ў ножкі, смаляны бачочак! Каб ня ты, наш бысю, дык зайцы, ваўкі, мядзьведзі, а разам з імі лісіцы! – ніколі б у нас не вяліся!..

БАБА. Быся! Быся! Быся!

ПАЛАШКА. Баба бычку шыйку чэша…

ПАНАС. Дзед сьпінку гладзіць…

ПАЛАШКА. Разам пузанчык казычуць-цешаць!..

ПАНАС. Усхадзіўся тут дзед…

ДЗЕД. Баба! Давай абед!

БАБА. Ды што ж табе даць?

ДЗЕД. А ўсе твае прысмакі, верашчакі, кулябякі?

БАБА. Цю, успомніў! Усё пад"елі даўно.

ДЗЕД. А во ў склепе: і зайчаціна, і лісяціна, і нават медзьвяжаціна!.. Каго першым дастану – таго й засмажым!

ПАНАС. Дастае дзед зайчыка, перапуджанага Міцяйчыка…

ЗАЯЦ. Адпусьціце мяне. Я вам капусткі прынясу.

ДЗЕД. Капусткі? А не падманеш?

ЗАЯЦ. Не! Адпусьціце!..

ДЗЕД. Ну, бяжы, шарачок.

ПАЛАШКА. Зайца доўга ўгаворваць ня трэба, скача ад радасьці ледзь не да неба!..

ДЗЕД. Каго другім дастану – таго й…

ПАНАС. Дастае ваўка дзед, напалоханага, як сьлед!..

ВОЎК. Вой, стары, лепш адпусьці мяне. Я табе качку ўпалюю.

ДЗЕД. Качку? А як падманеш?

ВОЎК. Не! я воўк сумленны. Яшчэ нікога не падмануў!

ДЗЕД. Ну, ідзі. Ды глядзі!

ПАЛАШКА. Выскачыў воўк на волю ды й у лес цераз поле!

ДЗЕД. Каго трэцім дастану – таго…

ПАНАС. Каго там дастаў дзед? Ага, мядзьведзь – ад страху жывы ледзь-ледзь!..

МЯДЗЬВЕДЗЬ. Дзедка, бабка, не губіце мяне, адпусьціце! Я вам за гэта мёду прынясу.

ДЗЕД. Мёду? А як уцячэш?

МЯДЗЬВЕДЗЬ. Не. Прынясу.

ДЗЕД. Ну, давай, нясі свой мёд. Ды паболей, паболей!

ПАЛАШКА. Ту і мядзьведзь – кульгець! – і зьнік. Хутчэй пачылікаў, відаць, на пчальнік.

ДЗЕД. Хто там у нас застаўся? Цьфу, ліска!.. Худая, бы тая…

ПАЛАШКА. Кіргізка!..

ЛІСА. Ах, адпусьціце! Я вам кваску добрага прынясу!

ДЗЕД. А не падманеш?

ЛІСА. Ды каб я, ліска, карчмарка Анфіска, каго падманвала?..

ДЗЕД. Ну, бяжы.

ПАЛАШКА. Не пасьпелі міргнуць і вокам, як ліска Анфіска – наўцёкі!

ПАНАС. Падцягнуў тужэй пояс дзед – глядзіць, ці нясе зьвяр”ё ім абед?

ДЗЕД. Ну што, не відаць?

БАБА. Не, не відаць… А, не! відаць!

ДЗЕД. Дык не – не відаць, ці не-не – відаць?

БАБА. Як быццам і не відаць – а відаць, і як быццам відаць – а не відаць!

ДЗЕД. Што?!

БАБА. Відаць, відаць!

ЗАЯЦ. А вось і капустка!

ВОЎК. А во качка!

МЯДЗЬВЕДЗЬ. Ну, во і мядок!

ЛІСА. Вось і квасок!

ДЗЕД. Ну, малайцы! Не падманулі!

БАБА і ДЗЕД *(кланяюцца Бычку).* Ай, дзякуй табе, бычочку! Смалюсенькі наш ты бачочку! Дзякуй тваім ножкам! Дзякуй тваім вушкам! Дзякуй тваім вочкам! Дзякуй тваім капытушкам! Дзякуй твайму роціку! Дзякуй твайму жывоціку! Каб ня ты, наш бысю, ні капустка, ні качка, ні мядок, ні квасок – ніколі б у нас не вяліся!..

ПАЛАШКА. І пайшло ў іх там граньне, гуляньне…

ПАНАС. За сталом – піраваньне!

ДЗЕД і БАБА *(сьпяваюць:)*

А як сёньня піраваньне,
А як сёньня баляваньне!
А як сёньня ў нашай хаце –
Будзь здароў банкэтаваньне!

У чырвоным, у куточку
Пасадзілі мы бычочка;
Смаляны ты наш бачочак,
Зьеж румяны піражочак!

Запрашаем да банкэту
Ўсіх, хто зможа і хто хоча!
Даражэнькія гасьцейкі,
Баляваньне – хоць да ночы!!!

ПАЛАШКА. Ай, Панас, здорава мы пагулялі!

ПАНАС. І добра папілі, і здорава пагулялі, і казачак трохі з нашага балаганчыку паказалі!..

ПАЛАШКА. На гэтым кірмаш наш канчаецца…

ПАНАС. Лялечны балаганчык – чык-чык! чык-чырык! – зачыняецца!

ПАЛАШКА. Да хуткай сустрэчы – але не на печы!..

ПАНАС. Да новага сьвята – але ня там, дзе на пярыне ў дзьве дзюркі храпуць заўзята!

*(Панас і Палашка зыходзяць, сьпяваючы:)*

Як на лялечны кірмаш
З бабай дзед патрапіў наш!
Як на гэтым кірмашы –
Ўсе зрабілі барышы!
Мы ж – артысты-сьмехачысты,
Гандляваць ня можам чыста;
Ды за тое на пацеху
Паказалі вам уцехі,
Паказалі казачку,
Не адну, а вязачку!..

З А С Л О Н А

К А Н Е Ц.

KAMUNIKAT.org

## ЮНАК І ВЯДЗЬМАР

П’еса-казка ў дзвюх дзеях паводле твораў Якуба Коласа

**Дзейныя асобы:**

СЫМОН.
ГАННА.
ДЗЕД КУРЫЛА, пастух.
ВЯДЗЬМАР СКАРБАТУН, ён жа ВОЎК, ДЗЯДОК-ЖАБРАК, ШЛЁМА (галоўны чорт), КНЯЗЬ-ПАЛЯЎНІЧЫ.
СМЕРЦЬ.
БАЦЬКА.
МАЦІ.
ЧЭРЦІ, ВЕДЗЬМЫ (НАВЕДВАЛЬНІКІ КАРЧМЫ, потым СЛУЖКІ).
САБАКІ, ГАДЫ.

## ДЗЕЯ ПЕРШАЯ

### Карціна першая

### ***“Смерць прыйшла – і песня спета!..”***

#### Сцэна першая

Ціха, мірна, псакойна вакол... На ўзгорку сядзіць Сымон, грае на дудачцы. Побач – невялікі статак баранчыкаў. Малады музыка выводзіць то самотную, то вясёлую мелодыю.

Паказваецца дзяўчына Ганна, паволі падыходзіць да хлопца. Ён, раптам пачуўшы, спыняе гранне.

СЫМОН. Хто тут?
ГАННА (ад нечаканасці пужаецца). Вой!..
СЫМОН (бачыць Ганку, узрадавана). Ганка!..
ГАННА. Сымонка!..
СЫМОН (глядзіць то на дудучку, то на Ганку). Эх, Ганка!
ГАННА. Што, Сымонка? (Падыходзіць да яго, усаджваецца побач, сарамліва пасоўваецца бліжэй, ціха смяецца).
СЫМОН. Вой, Ганка!
ГАННА. Ну што, Сымонка?
СЫМОН ( гэтак жа нясмела пасоўваецца да Ганны, смяецца таксама). А то не ведаеш!..
ГАННА. Ох, ведаю! Але нам..
СЫМОН. Што?
ГАННА. Гадочкаў мала...
СЫМОН. Падрасцём!
ГАННА. Але бацькі...
СЫМОН. А што бацькі? Бацькі зразумеюць!
ГАННА. Але ж мы бедныя...
СЫМОН. А... (Хоча нешта сказаць ды раптам нікне, згаджаецца). Так, бедныя...

Няёмкая паўза. Толькі самотна гучыць дудка.

ГАННА (страпянулася). Паслухай, Сымонка! Чула я, што недзе на свеце...

У гэты самы момант з іншага боку ўзгорка да іх незаўважна падпаўзае Вядзьмар. Прагна настаўляе вуха.

Вой!..
СЫМОН. Што?..
ГАННА. Відаць, падалося... Дык вось, недзе на свеце ёсць незвычайная скрыпка!
СЫМОН. Якая скрыпка?..
ГАННА. Дзіўная скрыпка, чароўная! Кажуць, той, хто валодае скрыпкаю...
ВЯДЗЬМАР (прагна настаўляе вуха). Той, хто валодае скрыпкаю...
ГАННА. ...ведае, дзе ў зямлі...
ВЯДЗЬМАР. ...ведае, дзе ў зямлі...
ГАННА. ...схаваныя скарбы-багацці! Нямераныя-незлічоныя!
ВЯДЗЬМАР. О-о! скарбы-багацці! Нямераныя-незлічоныя!
СЫМОН (узрушана). Чароўная скрыпка! Дзе ж мне ўзяць яе, Ганка?
ГАННА. Вой, не ведаю! Але і ў галечы-нястачы з тоблю жыць – таксама, любы мой, не жадаю!
СЫМОН. Дык... А дудка?
ГАННА. А што твая дудка? Твая дудка нам багацця не прынясе. На ёй толькі авечкам-баранчыкам граць!..
СЫМОН. А калі...
ГАННА. Тады... (Капрызліва адварочваецца ад Сымона).
СЫМОН (пасля роздуму). Э-э! Зямля вялікая, поле шырокае, рэчка глыбокая – пайду пашукаю!
ВЯДЗЬМАР. А я – ха-ха! – следам: вузкай вужакаю, хіжым сабакаю, вострым секачом, чорным крумкачом!.. Маёю скрыпачка будзе!

І рушыў у шлях хлапчына, падганяючы наперадзе свій невялічкі статак. І следам за ім пацёгся, павалокся вядзьмар Скрабатун.

## Сцэна другая

Ды толькі недалёка адышоў Сымон: стары пастух дзед Курыла ідзе насустрач і на скрыпцы для душы сваёй грае. Заўважыў пастух хлапца, спыніў гранне.

ДЗЕД КУРЫЛА. ***Ну, рассказвай! Кажы смела:***
***Мой музыка малады:***
***Што ў цябе там зноў наспела?..*** *

---------------
* Усе цытаты з твораў Якуба Коласа прыведзены чорным курсівам.

СЫМОН. Эх, мой дзед Курыла любы!
Закахаўся ў Ганку я.
Ды, відаць, яно на згубу!..
ДЗЕД КУРЫЛА. Што такое?..
СЫМОН. Загадала Ганя мне
Адшукаць чароўнай скрыпкі,
Той, што скарбы дастае!
ВЯДЗЬМАР (яны не чуюць яго і не бачаць). Так! Той, што скарбы дастае!..
ДЗЕД КУРЫЛА. Ты глядзі, якая справа! (На хвілінку задумваецца. Працягвае Сымону скрыпку). А ну, хлопец, паспрабуй…
СЫМОН. Эх, дзядуля! Твая скрыпка – надта простая…
ДЗЕД КУРЫЛА. А ты зайграй…

Правёў асцярожна, недаверліва Сымон смыкам па струнах, а потым… Зайграў хлапчына, так зайграў, што кветкі заслухаліся, аблокі затрымцелі, травы шэпт свой прыцішылі. Нават баранчыкі траву не скубуць – Сымонку слухаюць. Не гранне, а цуд сапраўдны! Нарэшце спыніўся Сымон і сам дзівіцца майстэрству свайму.

***Добра граеш, хвацка граеш!***
***І вялікі талент маеш!..***
***Я, брат, зразу здагадаў,***
***Што музыкам ты радзіўся…***

СЫМОН. Які сэнс з таго, дзядуля? Які сэнс з майго грання, калі Ганка глядзець на мяне пакуль не хоча?!.
ДЗЕД КУРЫЛА. А ты лепш сюды зірні!..

Раптам падняўся ў паветра таўсматы дуб, раскрыліся карані, а пад імі заблішэчла золата, заіскрыліся каштоўныя дыяменты!..

СЫМОН. Ух ты! Вось дык маеш! Вось дык скрыпка!.. Колькі разоў яе слухаў, а не ведаў, што яна – чароўная!
ВЯДЗЬМАР (таксама ўсё бачыць). О-о!.. У-у!.. (Пачынае варажыць). Чары-мары, пах смалы і чорнай гары!.. Прыляціце!.. Прыпаўзіце!.. Дапамажыце скрыпкаю чароўнаю завалодаць!

Але зноў закрываюцца карані, хаваюцца пад імі дыяменты.

СЫМОН. Эх, прапала!..
ДЗЕД КУРЫЛА. Малады ты яшчэ, Сымон. Таму скарбы проста так табе не дадуцца…
СЫМОН. Тады якая карысць мне аэ скрыпкі гэтай?..
ДЗЕД КУРЫЛА. Пачакай, не спяшайся, хлопча! Скарбы выйдуць табе з-пад зямлі, калі стрэнеш яшчэ трысячу трыста і тры світанкі.
СЫМОН (расчаравана). Тысячу трыста і тры світанкі!..
ДЗЕД КУРЫЛА. Так. Гэта – выпрабаванне! Скрыпка слухаецца толькі таго, хто не выракаецца яе. І бароніць-ратуе нават ад гібелі!
СЫМОН. Праўда?.. (Разглядвае скрыпку, потым глядзіць на дзеда). Дзед, паслухай… Калі яна такая чароўная, дык чаму сам – у лахманах нейкіх?!.
ДЗЕД КУРЫЛА. Эх, Сымонка! Мая раскоша – у зямлі нашай…
СЫМОН. Зноў ты, дзедку, загадкамі нейкімі гаворыш…

Раптам нібы з ніадкуль з'яўляецца паміж імі Смерць ды паказвае Курылу на стары зламаны гадзіннік. Вядзьмар, страшэнна напалоханы, хаваецца.

СМЕРЦЬ. Гэта я тут загадваю ўсе загадкі!
***Смерць прыйшла – і песня спета,***
***І прыложана пячаць.***
ДЗЕД КУРЫЛА (працягвае скрыпку Сымону):
Грай жа, хлопча!..
***Скрыпка – хлеб твой і апора,***
***Дык шануй яе, мой сын:***
***Скрыпка верна ўсім служыла,***
***Каб і ты ёй верны быў!..***

Асцярожна бярэ Сымон скрыпку, быццам баіцца разбіць ці страціць… Быццам бярэ ўсе тыя скарбы, якія паказаліся з-

пад зямлі падчас яго дзіўнага грання… Але нешта яшчэ хоча сказаць яму перд тым, як пацягне яго за сабою няўмольная Смерць.

І яшчэ запомні, Сымон! Добра запомні: не ўсе скарбы зямныя цану маюць. Некаторыя з іх – бясцэнныя… Дык абяцай жа мне, абяцай…
СМЕРЦЬ (цягне Курылу за сабою).

***Смерць прыйшла – і песня спета,***
***І прыложана пячаць.***

Не паспявае сказаць апошнія словы дзед, бо прападае разам са Смерцью.

СЫМОН (кідаецца на той пагорак, пад якім знік дзед Курыла).

***Дзедка, міленькі дзядуля!***
***Нашто ты памёр? нашто?***
***Хто ж мяне цяпер прыгорне?***
***Хто мне слоўка скажа? хто?***

(А потым адрывае галаву ад пагорка).

Дзядуля!.. Што я табе абяцаць павінен? Маўчыш!.. Эх, дзядуля! Бывай, дзядуля!..

І зноў зайграў на скрыпцы Сымон. Шмат чаго чулася ў тым гранні: і развітапльная песня жальбы, і бура-віхура, што страсае лісце з восеньскіх дрэў, і жывая мелодыя душы, чуйнай ды закаханай у кранальнае свята жыцця…

## Карціна другая

## ***“Людзі, воўк!..”***

### Сцэна трэцяя

СЫМОН. Шкада дзедку!.. (Глядзіць на скрыпку). Але ж і скрыпку ты мне падарыў! Вось дык скрыпка!.. Вось дык цуд! Шкада толькі, доўга чакаць давядзецца, пакуль скарбы з-пад зямлі выйдуць!.. Тысячу трыста і тры світанкі! Але нічога. Статак хутка дапасу – і да Гані!.. Разам скарбаў чакаць будзем.

Ударае Сымон смыкам па струнах, дзіўныя гукі ляцяць над зямлёю, далятаючы туды, дзе дзявочыя думкі апанавалі Ганну. Пачула яна Сымонава гранне, заслухалася…

***Калі вясною***
***Над зямлёю***
***Раняла сонейка праменні,***
***Яно сказала ім тады:***
***“Ляцеце, промені, туды,***
***На баль мой выклічце стварэнні,***
***Ўдыхнеце дух іх маладых,***
***Цяплом сагрэйце і каменні,***
***Няхай зямля на ўсе лады***
***Спявае радасць адраджэння,***
***Няхай там знішчыцца сутонне,***
***Адбітак смерці і жуды”.***

Раптам абрываецца нота, жалобна ўсхліпвае скрыпка.

ВЯДЗЬМАР (паказваецца з-за хмызоў). Дарэмныя спадзяванні, хлопча! Не дачакаецца цябе Ганка, няшчасны пастушок!.. А там!.. Я цябе – ха!.. (Паказвае, што мае намер загубіць Сымона). А скрыпку – хэ!.. (Паказвае, як адбірае скрыпку). Хе-хе-хе! А-г-гр-ррр!

Раптам Вядзьмар чапляецца за пень, перакульваецца цераз яго сапраўдным Ваўком. Якраз у гэты момант статак баранчыкаў падыходзіць да гэтага праклятага месца, і Воўк хапае самую маладзенькую авечачку.

СЫМОН. ***Га! ага! Ты-га, паскуда!***
***Людзі, воўк! Сюды! сюды!***

На крыкі бягуць людзі, у натоўпе – Бацька і Маці Сымона.

БАЦЬКА (падымае задраных баранчыкаў). Ну, Сымон!..
***Добра выпасвіў авец!***
***Дзе ж баранчык?.. Ось і шкурка,***
***Ось і мяска!.. маладзец!***
***Страты – добрая палова…***
***Скубянуў, дык скубянуў!***
***Ты ж чаго глядзеў? дзе быў?***

СЫМОН. Тут я быў, павер мне, татка! Толькі воўк – наляцеў, быццам вурдалак нейкі!
БАЦЬКА (раптам заўважае скрыпку, хапае яе ды адкідвае прэч).

***Вон адгэтуль, каб і смроду***
***Мне твайго тут не было!***
***Бяры скрыпку, смык – і вон!***

СЫМОН (кідаецца туды, дзе жалобна дзынькнула аб зямлю скрыпка, асцярожна падымае яе ды прыціскае да сэрца). Эх, татуся!
БАЦЬКА. ***Ідзі з дому, куды хочаш –***
***Больш не сын ты мне, Сымон!***
СЫМОН. Пайду, татуся... (Ідзе прэч).
ВОЎК-ВЯДЗЬМАР (частуючыся за хмызамі задранай авечкай). Пр-р-рагналі?!. Добр-р-рра! Пр-рэч! Пр-р-ррэч адсюль, няшчасны музыканцік!

Разыходзяцца з паляны сяляне. Бразнуў дзвярыма, схаваўшыся ў хату, Бацька. І толькі Маці стаіць на парозе ды заве-гукае ў сінь-далячынь.

МАЦІ. Го-о, Сымоне! Вярніся!.. Гэй, Сымонку! Сынку мой любы...

Аднак далёка адышоў хлапчук; ужо не чуе ён зыкаў Маці. А можа, і чуе, толькі не азываецца, не адгукаецца... Ідзе ён, і скрыпка плача, а сам ён спявае.

СЫМОН. Ой, пайду, пайду я полем,
Там і вецер, там і воля,
Надвячоркам ці світаннем
Там забуду пра растанне.
Ой, пайду, пайду я лесам,
Хай гучыць мая там песня:
Песня сумнай адзіноты,
Песня гора і маркоты.

ВЯДЗЬМАР (прыслухоўваецца да песні Сымона). Бач, спявае! Ну, нічога!.. Хутка скончыш спевы свае, Сымон! Як і жыццё сваё скончыш! (Ужо не Ваўком, а збяднелым Дзядком-жабраком цягнецца следам за Сымонам-музыкам).

Карціна трэцяя

## ***“На прасторы сэрцу люба!..”***

Сцэна чацвёртая

Замарыўся Сымон, доўга ідучы, сумныя песні спяваючы. А тут і лес вакол ужо нейкі змрочны, злым і тужлівым подыхам вее… Кінуўся Сымон у адзін бок, кінуўся ў другі – цёмна, страшна; заблукаў, бедачына!.. Але вось ціхая паляна, вось шырокі крышлы пяночак – можна спыніцца, адпачыць ды пад’есці… Эх, каб было чаго!..

СЫМОН. Нешта змрочна, страшна… І салаўі ў жываце спяваюць!

Раптам проста перад ім вырастае Дзядок-жабрак. Вокам міргае сляпым, страшны, бледны, абарваны.

ЖАБРАК. ***Хто ты, хлопча?..***
***Чый сынок? якіх бацькоў?***
СЫМОН. ***Я… так… хлопец… падарожны,***
***Праз сябе сам… Я… нічый!***
ЖАБРАК. Нічый! Заблукаў?
СЫМОН (са скрухай). Заблукаў!
ЖАБРАК. А зваць цябе як?
СЫМОН. Сымонам…
ЖАБРАК. Есці хочаш, Сымон?
СЫМОН. Вой, хачу! Так хачу, што, здаецца, усё аддаў бы, каб хоць якую бульбінку разам з шалупіннем з’есці!
ЖАБРАК. Бач, як агаладнеў! А… скрыпку аддаў бы?
СЫМОН. Скрыпку? (Смяецца). Не! Скрыпку, нават калі з голаду паміраць буду, і тады не аддам!
ЖАБРАК. Няўжо? Чароўная яна ў цябе ці што?
СЫМОН. Так, дзядок, чароўная!
ЖАБРАК. А што яна ў цябе можа?
СЫМОН. Ды ўсё!.. (Праводзіць смыкам па струнах. І адказваюць ёй птушкі, і схіляюцца да яе кветкі).
ЖАБРАК. А болей?..
СЫМОН. Скарбы з зямлі даставаць!
ЖАБРАК. Вой, штосьці не верыцца! Быць такога не можа!.. Пэўна, хлусіш ты, хлопча.
СЫМОН. Тады – глядзі!..

Правёў другі раз смыкам ён па струнах – і заспявала скрыпка. А проста пад тым самым пнём, ля кога яны спыніліся, загарэліся-заіскрыліся камні-дыяменты... Глядзіць на ўсё гэта багацце Вядзьмак-жабрак ды прагных сваіх вачэй адарваць не можа!.. Раптам спыніў Сымон гранне, і даразу прапала ўсё, быццам і не было ніколі.

ЖАБРАК. Ого, вось дык скрыпка! Цуд дый годзе!.. (Яго рукі бы самі сабою цягнуцца да скрыпкі, але ён усё ж знаходзіць сілы адвесці іх). А... куды ж ты ідзеш, Сымон?
СЫМОН. Эх, дзедку! Я і сам не ведаю!
ЖАБРАК. Як гэта не ведаеш?!
СЫМОН. Пакахаў я прыгожую дзяўчыну Ганку...
ЖАБРАК (з болем у голасе). О, прыгожую дзяўчыну Ганку!..
СЫМОН. А яна загадала дастаць чароўную скрыпку! Паміраў пастух дзед Курыла і пакінуў мне ў спадчыну гэтую самую скрыпку! Ужо, шчаслівы, збіраўся пайсьці я да Ганкі, каб пакласці да яе ножак совй падарунак, ды страшэннываўчына накінуўся на мой статак, падраў бараноў ды авечак, а бацька за гэта прагнаў мяне з дому!

***Я, дзядок, прагнаны з хаты,***
***І іду... куды? у свет!***

А дакладней, ужо нікуды, бо заблукаў і не ведаю, як мне выбрацца з гэтай глушэчы!
ЖАБРАК (аж падскочыў на месцы). Як табе, хлопча, пашанцавала! Бо ведаю я сцяжыну...
СЫМОН. Няўжо?!
ЖАБРАК. Праўда, праўда!
СЫМОН. Вось дзякуй дык дзякуй!..
ЖАБРАК (спяшаецца пайсці з паляны, аднак толькі заглыбляецца ў гушчэчу). Наперад, Сымоне! Твая Ганка даўно сумуе без твайго цудоўнага грання!.. (Адрываецца ад Сымона і зноў набывае звычнае аблічча Вядзьмара). Твайго грання, якое будзе апошнім!.. (Пачынае нешта вядзьмарыць).

Гэй, цяжка коўдры хмараў,
Вас склікае дух вядзьмара!

Набягаюць цёмныя хмары, закрываюць сабою ўсё неба. Яшчэ страшней ды больш змрочна робіцца ў лесе.

СЫМОН. Дзедку, дзе ж ты?!.

ВЯДЗЬМАР. Я тут, тут я! (Працягвае сваю гідкую справу).
Грымні, гром і навальніца,
Зрабі з хлопца баязліўца!..

Пачынаюць бліскаць ды джгаць маланкі, узнімаецца вецер. Прыгінаюцца дрэвы да самай зямлі, міжволі ўціскае Сымонка галаву ў плечы. Здаецца хлопцу, вось рукі яму насустрач працягнула родная Маці – ды ветрам адносіць Матулю прэч. Вось, падалося, Бацька стаіць на сцяжыне і хоча абняць Сымона – ды і Бацечку закрывае сабою залева. А вось і мілае сэрцу дзяўчо – любая Ганка – ледзь не па небе ляціць, каб з Сымонам злучыцца, ды і яе круціць-адкідвае ад муўыкі шалёная, няўмольная віхура…

А Вядзьмар заглыбляецца ўсё далей, заманьваючы яго за сабою.

СЫМОН (са страхам у голасе). Нешта мне стра-а-шна… Дзед, азавіся!..
ВЯДЗЬМАР. Агу, я тут!
СЫМОН. Ці хутка скончыцца лес?
ВЯДЗЬМАР. Хутка, ужо хутка! Хутка нарэшце ўсё скончыцца для цябе! (Зноў варожыць над хмарамі ды маланкамі).
Гэй, маланка, як варона,
Рынься з неба на Сымона!
Спапялі музыку, гром!
Каб заснуў ён вечным сном!..

І пасля гэткага праклёну Вядзьмара расколваецца самая грозная хмара. Страшнай, імклівай стралою вылятае адтуль маланка ды няўмольна цэліць проста ў Сымона-музыку. Хоча ўцячы Сымон ад маланкі, ды няма ні ратунку ад яе, ні збавення… Нідзе не схавацца яму ад маланкі, неміласэрна джгае яна ў Сымона!..

СЫМОН (ускрыквае). Бывай, мая Ганка!

Сымон падае нерухомым кулём у траву. А побча жаласна дзынькнула скрыпка, нібыта парвалася на ёй адна струна… Ды па-ранейшаму шуміць навальніца, бліскаюць у небе маланкі, у шалёнае радасці скаланаецца злы Вядзьмар.

Сцэна пятая

ВЯДЗЬМАР. Быў музыка – і забіты!.. Быў Сымон – і ўжо няма! Плачце, чорныя ядлоўцы! Плач, скрыпічная струна! Ха-ха-ха-ха!.

Паволі сцішваецца залева, сціхае гром.

Мая, мая скрыпка!.. (Хоча Вядзьмар дакрануцца да скрыпкі, ды ўзлятае яна ў паветра – не даецца яму ў рукі). Што такое?!. (А тут яшчэ густы туман наплывае, пакрываючы ўсё сабою. Такі густы – што ўжо і не відаць нічога...) Што такое?! А каб на цябе ліха! Дзе ж яна?.. Ага! А ну, стой! Стой, каму сказаў!.. А-а, папалася, цацачка! (Ужо зусім хапянуў Вядзьмар скрыпку, але вырвалася яна з яго рук, знікла з вачэй; потым зноз з'явілася, але ў іншым месцы, такім, што ніякім чарам не падуладна). Ды што ж такое?! Жывая яна ці што?..

ГОЛАС. Скрыпка слухаецца толькі таго, хто не вырыкаецца яе!..
ВЯДЗЬМАР. Ага, дык вось у чым справа!

Раптам бачыць, як скрыпка ў тым жа тумане нерухома застыла над Сымонам-музыкам, як зайграла самотна; і дакрануліся да яго твару дзявочыя рукі, пацалавалі ў заплюшчаныя вочы зоры, узнялі над зямлёй і паставілі на ногі моцныя сакаляты. Зайграла весялей скрыпка, пырснулі сонечныя прамяні, страпянуўся Сымон, скалануўся і... ажыў! І зноў чуецца голас дзеда Курылы.

ГОЛАС. ***І бароніць-ратуе нават ад гібелі!***
ВЯДЗЬМАР. Ты глядзі – уратавала!.. Толькі я ўжо ведаю, што мне трэба! Ох і штука чакае цябе, няшчасны Сымон!.. Хутка ты так зайграеш, што не будзеш ведаць палёгкі сабе, ні супынку! (Адпаўзае, знікае, прападае прэч).

## Сцэна шостая

СЫМОН (адзін). Вой! Што са мною? Ці забіты, ці жывы?.. Быццам бліснула маланка... Ці ўджаліла гадзюка? А куды адсюль падзеўся дзед-жабрак?.. Дзіўны нейкі, падазроны... (Раптам проста ў рукі яму апускаецца скрыпка, прыціскаецца да хлапчыны пяшчотна). Мая скрыпка!.. Гэта ты ўратавала

мяне? (Скрыпка адзываецца). Ты мяне ад маланкі абараніла?.. (Скрыпка адзываецца больш трывожна, быццам хоча нешта расказаць пра злога Вядзьмара). О-о, ты нешта мне расказаць хочаш?

І тады ўзлятае скрыпка ды пачынае сама граць-распавядаць Сымону, што ідзе за ім неадступна Вядзьмар – агідны, паскудны, які хоча завалодаць скрыпкаю і дзеля гэтага гатовы зрабіць што заўгодна… Усё бачыць у скрыпічным граннi-мроі Сымон; задумаўся моцна.

Дык, значыць, жабрак – не жабрак, а вядзьмар агідны? (Станоўча дзынькае скрыпка). І прагне ён табой завалодаць, каб усе скарбы з зямлі дастаць? (Станоўча рыпіць смык). Ды каб шчасце наша з Ануляй разбіць?! Ну не! Пакуль ты ў маіх руках (праціскае скрыпку да сябе) – не будзе такога ніколі!..

Раптам з-за чорнай хмарыны паказваецца абрыс Вядзьмара.

ГОЛАС ВЯДЗЬМАРА. Будзе! Яшчэ як будзе!.. (Імкліва знікае, як не было).
СЫМОН. А во і лес скончыўся! Пайду, вярнуся – няўжо сам не знайду сваёй мілай красачкі-Ганначкі?! (Пачынаецца поле. Сымон ідзе сабе то шпарка, то нетаропка; і грае весела скрыпка, і хораша-вольна хлапчыне!..)

***Я пайду, пайду адзін я.***
***Вольны вецер хай гадуе***
***Мае думкі, мае мары.***
***Мае песні, казкі-чары.***
***Я пайду, міну лясочкі,***
***Што чарнеюць, нібы бровы:***
***Там пабачу свет я новы,***
***Там пацешу свае вочкі,***
***Там другія ўчую словы…***
***Я міну, міну лясочкі.***
***……………………………***
***На прасторы сэрцу люба!***
***Прывітаюць мяне краскі***
***І мне будуць баяць казкі,***
***Мне ўсміхнецца постаць дуба,***
***Чараў поўная і ласкі, -***
***На прасторы сэрцу люба!***

***Пабажыць у свет дарога***
***Праз узгоркі, праз лагчынку;***
***Будзе ветрык гнуць былінку,***
***І павеюць думак многа***
***Мне пра мілую дзяўчынку***
***Далі тыя і дарогі.***

ДЗЕЯ ДРУГАЯ

Карціна чацвертая

***“А Сымонка, як пракляты,***
***Ім да трэціх пеўняў граў...”***

Сцэна сёмая

Недзе ўдалечыні гучыць песня Сымона. А Вядзьмар сярод поля прагне-стараецца наваражыць заклятае месца – шумную-тлумную карчму, дзе шмат наведвальнікаў, безліч пляшак, разліванае мора пітва. Рогат ды крыкі там, і хто трапляе туды – прападае…

ВЯДЗЬМАР. Тут – карчомка! Кубкі, чаркі, мора горкага пітва! Ох, Сымон!..
Тут змарнуеш век хлапчыны,
Талент здрудзіш тут на пыл!..
(Надзявае маску гаспадара карчмы Шлёмы, танчыць разам з усімі наведвальнікамі).

Да карчмы падыходзіць Сымон. Спыняецца. Здзіўлена слухае ды глядзіць на ўсё гэта.

СЫМОН. Бач ты, дзіўная карчомка! Мо зайсці?..

І адразу налятаюць на яго наведвальнікі-заўсёднікі – гожыя паненачкі, хвацкія малойчыкі; тармосяць, смяюцца, цягнуць у карчму.

ПАНЕНКІ ДЫ МАЛОЙЦЫ. О! здаецца, музыка!
- Давай да нас, хлопча!..
- Заходзь да карчомкі!
- Тут табе ежа, пітво, дзевак харошанькіх незлічона!

- ***Го, музыка тут, музыка!***
***А ну, хлопча, - тра-ля-ля!***
***Каб аж бухала зямля!***

Але не спяшаецца зайсці ў карчму Сымон. Бо і самому неяк страшнавата, і скрыпка штосьці рвецца з рук ягоных адсюль.

ШЛЁМА. ***Ну не бойся: не з'ядуць!***
***Паіграй жа, пане браце,***
***У кішэню накладуць!***

СЫМОН (смяецца). ***А чаго ж баяцца тут!***

І ўрэзаў па скрыпцы смыкам Сымон! Так урэзаў, што ходарам усё захадзіла, затлумілася, закуралесіла. І пайшлі па карчме танчыць-віхурыць парачкі, з гікам, свістам, з падвыкруткамі. А Сымон усё болей, усё паддае, такую полечку-кадрылю са струн выціскае, што толькі трымайся!..
Урэшце скончыў ён гранне, перакуліў у рот чарачку заслужаную.

ШЛЁМА. Ай, добра граеш! Вай, хвацка! (Працягвае яму грошык). Трымай, заслужыў-зарабіў, хлопча!

Раптам амаль усе наведвальнікі абступаюць яго, кожны манеты дастае, кожны яму грошы працягвае.

НАВЕДВАЛЬНІКІ КАРЧМЫ.
- Ой, добра пайграў!
- Я ледзь на падлогу не павалілася!
- А на мне спаднічка перакруцілася!
- Трымай залатоўку!
- Дзяржы талер, хлапыска!..
- Зарабіў, дык бяры, пакуль назад не забралі!
- Бо як забяруць – застанецца табе дуля з макам!

Аднак не спяшаецца ўзяць грошы Сымон, адступае ад іх усіх, круціць галавою адмоўна. А потым як рубане смыкам па скрыпцы – аж усе ад яго і адрынуліся!..

СЫМОН. Ды не трэба мне вашы грошы!
НАВЕДВАЛЬНІКІ КАРЧМЫ.

- Як гэта не трэба?
- Грошы ўсім трэба!
- Зірні на сябе, хлопча, - на табе ж лапсярдак абарваны! Ды атопкі дзіравыя!..

СЫМОН. Затое ў мяне… (Хоча нешта сказаць, толькі оаптам скрыпка спрабуе спыніць яго, слова не дае сказаць). Затое я… (Зноў не дае яму сказаць скрыпка. Але схапіў яе Сымон, схаваў за плечы). Затое я магу такія багацці мець, што вам і не сніліся!

УСЕ. Багацці?..

- Якія такія багацці?!.
- Ты, лапсярданец, - і багацці?..

СЫМОН (смяецца). Нямераныя ды незлічоныя!

Наведвальнікі карчмы раптам грымнулі вар'яцкім, зневажальным рогатам.

УСЕ. Вой, нямераныя!.. Вой, незлічоныя!

- Гэта ж трэба!.. Ну варона-выхвальбона!
- Жывата парвеш – насмяшыў, хлопча!
- Ну багатыр!..
- Жабрак, валацуга, басота, абдзіра галапузая!..

СЫМОН (сярдзіта). Не верыце?! Ну ж, глядзіце!.. (І зноў ударыў па скрыпцы Сымон! На гэты раз яна дзіўна-чароўным гукам зайграла, і паказаліся глыбока з зямлі тыя самыя зачараваныя скарбы). Ну як?

Толькі яшчэ большы рогат-гоман-свіст падняўся ў карчме – такі, што хоць вушы затыкай ці ўвогуле ўцякай адтуль.

Чаго ж вы рагочаце? Мне гэтую скрыпку сам пастух Курыла падарыў! Калі паміраў – завяшчаў мне яе, чароўную!..

ШЛЁМА. А таго, няшчасненькі наш Сымонка, што падмануў цябе дзед Курыла!.. Ніякая яна не чароўная, а так…

СЫМОН. Што – так? Што – так?!.

ШЛЁМА. Ты багацці тыя, што ў зямлі ляжаць, так блізка ад сябе, як гэтыя грошы (зноў працягваек манеты) бачыў?

СЫМОН. Не…

ШЛЁМА. А ў руках, як гэтую залатоўку (укладае яму ў рукі манету), трымаў?

СЫМОН. Не…

ШЛЁМА. А пасля кожнага грання табе гэтыя скарбы з-пад зямлі выходзілі?

СЫМОН. Але дзед Курыла сказаў, што спярша трэба перачакаць… трысячу трыста і тры світанкі… І… і… і не выракацца…
ШЛЁМА. Э-э, Сымоне, Сымоне! Ці мала чаго мог чтары дзед табе наплявузгаць? Ну навошта, падумай, табе чакаць тысячы трохсот ды яшчэ трох світнакаў, каб дачакацца невядома чаго ці нічога не дачакацца? Грай сабе тут, у карчме, і жывыя залатовачкі штодня будуць сыпацца табе ў торбу!
СЫМОН. А… А… А як жа Га…

Толькі не паспявае ён дагаварыць, бо з гамам-тлумам усаджваюць яго ў ганаровы кут, працягваюць яму з усіх бакоў поўныя чаркі, з іх што ў рот, а што і за каўнер л'юць. Выпіў Сымон, абцёрся і… змяніўся раптоўна тварам, бы блазан, усміхнуўся. Ды ўзяўся хлапчына за скрыпку. І – эх!.. Толькі чарачкі грымяць, толькі сценачкі трасуцца, толькі чэрці з ведзьмамі скачуць!!!

А ён давай болей, а яны давай яшчэ весялей-страшней-жахлівей. І чым болей грае – тым болей манет сыплецца яму ў торбу; ужо побач залатая горка расце. А Сымонка грае, а чарачкі льюцца, а Шлёма-вядзьмар ручкі задаволена паціраае, а чэрці віскацяць-счкачуць!.. Тут табе й полька, тут і мазурка, ды розныя дрыгі-дзыгі-выдзыліньванні. Ужо змарыўся Сымонка – а тут новая чарка, яшчэ жменька грошыкаў. І носам клюе, і ледзь-ледзь ужо смыкам водзіць…

ШЛЁМА-ВЯДЗЬМАР (падбіраецца да дрымотнага Сымона). Не давалася твая скрыпачка ў рукі – дык цяпер сам мне яе аддасі!.. (Раптоўна мяняецца ды ўжо паўстае ў абліччы Ганны). Шукаў ты сваю любую Ганку, а яна сама да цябе прыйшла!..

## Сцэна восьмая

ВЯДЗЬМАР (у вобразе Ганны). Сымонка!..
СЫМОН (з цяжкасцю расплюшчвае вочы). Ганка… Гануля?.. Гэта ты?..
ВЯДЗЬМАР. Так, Сымонка, я! Твая красачка-дзяўчынка, я – Ганулечка твая!
СЫМОН. Адкуль ты?..
ВЯДЗЬМАР. Адтуль, Сымонка, адтуль!.. Ці знайшоў ты чароўную скрыпку?
СЫМОН. А-а! Знайшоў, Ганка, знайшоў! Вось яна!..

ВЯДЗЬМАР. Дай, дай мне яе, май харошы музыка!..

Сымон тлумна-няўцямна глядзіць то на скрыпку, то на Вядзьмара ў вобразе Ганкі, як быццам вагаецца, аддаць скрыпку ці не…

Давай! Чаго ж ты?!

Урэшце Сымон матлянуў галавою і ўжо амаль працягнуў Вядзьмару скрыпку, аднак за сталом прачнуўся нейкі Чорт ды кінуў Сымону залатоўку.

ЧОРТ. Эй, музыка! А ну, зайграй кракавяка!..

І толькі пабачыў грошы Сымон, як зноў рубануў смыкам па струнах, зноў замільгацела-закруцілася ў карчме!.. Нават Вядзьмара ў дзявочым абліччы падхапіла гэта віхура, нават ён не можа даць чарцям-ведзьмам рады. А Сымон дае, а Сымон наярвае!..

Вось ужо ўсё круцімца-коціцца, бы ў зачараваным коле, неяк тужліва рыпяць скрыпічныя струны, рухаецца віхура, быццам у звамаруджаным сне, нібы пад музыку сапсаванай кружэлкі, якое, аднак, не спыніць ніколі нікому…
І раптам невыносным, пранізлівым жалем усхліпнула скрыпка, вырвалася з Сымонавых рук, і задрыжэла-затрымцела адна струна трывожна-трывожна…

СЫМОН (абводзіць больш разумным паглядам карчму і бачыць, што адны нячыскікі побач). Ай, чэрці рагатыя!.. Ведзьмы калматыя!

І няма ўжо побач блішчастага золата – адно чорнае дыміць вуголле…

Вой, а дзе ж золата?

І раптам злятае з Вядзьмара падманнае аблічча, ды ўся мярзотнасць яго кідаецца хлопцу ў вочы.

О, дык гэта ж не Ганка!.. Гэта подлы вядзьмар Скарабатун! Уцякаць адсюль трэба!.. (І ўжо памкнуўся, але спыніўся, бо нре можа ён уцячы – без скрыпкі…)

І раптам – дзынькнула струна, здаецца, адказала яму сама скрыпачка.

ГОЛАС СКРЫПКІ. За мяне не бойся: я знайду цябе дзе заўгодна!..

Страсянуў галавоб Сымон, падхапіўся ды кінуўся проста ў вакно! А скрыпка зайграла вясёлым маршам, каб усялякія чэрці ды ведзьмы ніколі ўжо ў шаленстве сваім не спыняліся…

## Сцэна дзевятая

Толькі першым вымкнуўся з зачараванага кола, ужо ў сваім звычайным абліччы, Вядзьмар. Хоча ўхапіць ён скрыпку, але і яна раптам знікла, прапала. Выскачыў Вядзьмар з карчмы, а тут і карчма прапала, як не было зусім. Вялікая злосць яго распірае.

ВЯДЗЬМАР. Уцёк, падшыванец! Збег, лапюжнік! І скрыпка, скрыпачка, скрыпулечка – таксама прапала!.. (Забегаў, замітусіўся туды-сюды). Што ж рабіць? Што ж рабіць? (Раптам ляцяць два груганы). Ага!.. Вось і памочнікі мае верныя!..

Схапіў Вядзьмар іх дзвюма рукамі ды аднаго за адным браўнуў проста аб камянюкі. Ператварыліся груганы ў двух страшэнных чорных сабак, круцяцца вакол ног Вядзьмара, голасна брэшуць.

Наперад! На ловы! У пагоню!.. Схапіце Сымона-музыку ды прынясіце мне жывога ці мёртвага!

Сабакі кідаюцца наперад.

Не!!

Сабакі вяртаюцца назад.

Лепей мёртвага!..

Сабакі кідаюцца наперад.

Не!!!

Сабакі вяртаюцца назад.

Толькі жывога!..

Сабакі кідаюцца наперад.

Не!

Сабакі кідаюцца назад.

Мёртвага!

Сабакі кідаюцца наперад.

Не!!!

Сабакі кідаюцца назад.

Жывога!!!

Сабакі кідаюцца наперад.

А я пакуль падарунак яму падрыхтую! Такі падарунак, што ні ў казцы сказаць, ні пяром апісаць, ха-ха-ха!

І гучыць над усім абшарам дзікунскі рогат Вядзьмара.

Карціна пятая

***“Божа мой! О сон цяжэзны,***
***Дай мне сілы чары зняць!..”***

Сцэна дзесятая

На лузе ў адзіноце кветкі збірае Ганна. Складае адну да адной, пляце адмысловы вянок, нешта ціха спявае.

ГАННА. Ападае лісточак
На жоўты пясочак,
Дзевачцы на вяночак.

(Цяжка ўздыхае). Ах, дзе ты цяпер, мой Сымонка? І на што я, дурніца, табе пра тую скрыпку чароўную гаварыла? Як-небудзь і без яе пражылі б... Нічога, што бедныя. Затое баяцца нічога не трэба: яшчэ знойдзецца які прагны багацей ці вядзьмар, адбярэ ўсё ў нас. Дый хіба ў багацці шчасце? Можа, і няма ўвогуле на белым свеце ніякай чароўнай скрыпкі. Можа, казка ўсё гэта... А нават калі не казка, нават калі ты і напраўду яе знайшоў, то, відаць, папрашу, каб аддаў яе каму заўгодна! Бо адна бяда будзе нам з гэтым багаццем... Так, так, вось так проста яму і скажу: не трэба мне ўжо чароўная скрыпка, галоўнае, каб ты заўсёды быў побач са мною, Сымонка мой любы!

І не бачыць, не чуе, як падбіраецца да яе Вядзьмар, ці то ў ранейшым абліччы Ваўка, ці то калтматага Чорта... Вось нахілілася яна за самай прыгожай кветкаю – і скочыў з-за хмызу Вядзьмар, схапіў, павалок за сабою дзяўчыну.

ГАННА (адчайна крычыць). Сымон!.. Сымонка! Дапамажы, каханенькі, родненькі!..

Толькі ніхто не чуе, ніхто не ўратуе Ганку; апусцеў лужок, прывялі кінутыя кветкі...

## Сцэна адзінаццатая

У гэты час Сымон бегма бяжыць-уцякае ад раз'юшаных, лютых сабак; і ляціць за ім скрыпка ды, як можа, бароніць Сымона, адбіваецца ад страшыдлаў. Але і яна ўжо не можа даць ім ніякай рады... А сабакі насядаюць, гырчаць, вось-вось схопяць Сымонку. Хоча ён пераскочыць ручаіну ды раптам падае, голасна крычыць, а на яго накідваюцца сабачыдлы. Раптам выязджае з-за дрэў Князь-паляўнічы на прыгожым кані.

КНЯЗЬ (над Сымонам). Вось дык, браце, паляванне! Вось дык птушка!.. (Прыкрыквае на сабак, сцябае іх пугаўём). А ну, прэч!..

Сабакі с віскатам адпаўзаюць ад Сымона.

СЫМОН. Дзякуй, пане дабрадзею! Якія страшныя гэтыя сабакі! Вось дзякуй дык дзякуй!..
КНЯЗЬ. Годзе дзякаваць! (Бярэ Сымона за каўнер). Хто такі? Ды скуль ты, хлопе?..
СЫМОН (са страхам, прыціскаючы да сябе скрыпку). Я – Сымон… Сымон-музыка… Уцякаю ад вядзьмара злога!..
КНЯЗЬ. Ад вядзьмара?!. (Неяк лісліва да пагардзліва). Ты глядзі!.. Але са мною не бойся! (Паказвае на скрыпку). А-ну, хлопча, зайграй!

Сымонка, хвілінку павагаўшыся, праводзіць смыкам па струнах, пачынае граць. І адразу пырснулі прамяні на змрочную паляну, пацягнуліся да музыкі з-за дрэў расчуленыя сабакі, нават грозны Князь маркотна апусціў галаў, патануў чорнай душой у чароўных гуках… Але вось абарвалася нота, страпянуўся Князь.

Дасканала, дасканала! Проста цудоўна! За такое выдатнае гранне я бяру цябе ў свой двор! Гэй, фурман!

І адразу, нібы ніадкуль, з’яўляецца на паляне карэта, запрэжаная параю гарачых, няўрымслівых коняў, імі кіруе важнецкі, пыхлівы фурман; на запятках – надзьмутыя слугі.

СЫМОН (хоча нешта запярэчыць). Дзякуй, пане… Толькі…

Але не паспеў нічога сказаць музыка, бо гікнуў-свіснуў Князь, падхапілі Сымона служкі, вокамгненна ўкінулі яго ў карэту. Сцебануў пагую фурман па конях, і адразу ператварыліся яны ў свіней, а сам фурман ды служкі – у агідных рагатых чарцей; ды паімчала ўся гэта віхура са змрочнага лесу прэч!.. Ды панёсся за імі нязмоўклы рогат пыхлівага Князя.

І ўсё гэтак жа рагочучы, расхаджвае Князь у раскошным палацы, чакаючы, калі закоціцца віхура нячысцікаў у залу, калі кіне да ўладных яго ног няшчаснага Сымона-музыку. Вось і яны, заляцелі, закружылі, загікалі, залапаталі, вось і бразнуўся аб падлогу Сымон, але па-ранейшаму скрыпкі не выпускае, трымае яе моцна.

КНЯЗЬ. Ха-ха-ха! Ну што, падшыванец? Уцёк ад злога вядзьмара? Захаваў вернасць сваёй пісклявачыцы?!. Ха-ха-ха!

(І раптам аблятае паляўнічае ўбранне з Князя, паўстае перад Сымонам усё той жа страшны, мярзотны Вядзьмар).
СЫМОН. Чаго ты хочаш ад мяне, пачвара?
ВЯДЗЬМАР. А то не ведаеш?.. (Працягвае свае прагныя рукі). Скрыпку!.. Аддай мне чароўную скрыпку!
СЫМОН. Не!
ВЯДЗЬМАР. Аддай! Адрачыся!..
СЫМОН. Не!!! Не адракуся!
ВЯДЗЬМАР. Дык, значыць, не аддасі?
СЫМОН. Няхай мяне гады стопчуць, ды полымя спаліць – але і тады не аддам чароўнае скрыпкі!
ВЯДЗЬМАР. Ну, калі так – то хай будзе па-твойму!

Сцэна дванаццатая

Пляснуў сухімі далонямі Вядзьмар – і адразу папаўзлі з усіх бакоў да Сымона страшныя гады, засыкалі, заекаталі, яшчэ хвіліна – і раздушаць, разарвуць, праглынуць Сымона. Але раптам зайграла скрыпка – і праваліліся ўсе гады скрозь мармуровыя пліты палаца, як іх і не было… Засмяяўся звонка Сымон! Тады зноў пляснуў далонямі Вядзьмар – і адразу загуло, зашугала проста пад музыкаю гарачае, яркае полымя. Закрыў ён рукамі твар, вось-вось успыхне, як сухая галавешачка. Але зноў заспявала скрыпка, уратвала яго і ў другі раз. І зноў разляцеўся па ўсім палацы звонкі ды гучны Сымонаў смех!

ВЯДЗЬМАР. Радуешся? Смяешся? Ну, пачакай! Зараз наплачашся ў мяне, няшчасненькі музыканцік! Гэй, слугі!

Толькі крыкнуў Вядзьмар, як адразу валакуць да яго ног чэрці вялікі мех з красачкай-Ганнай. Тузаецца яна, хоча нешта выкрыкнуць, але не выпускаюць яе чэрці, ні слова не разабраць. Памкнуўся было да яе Сымон, толькі тыя ж чэрці і яго назад адцягваюць.

СЫМОН. Ганка! Дзяўчынка мая каханая!..
ВЯДЗЬМАР. Была!.. Была тваёю дзяўчынка! А зараз мне аднаму Ганка твая будзе належаць! Захачу – пакараю яе, захачу – памілую! А захачу – напушчу на яе мёртвы, спрадвечны сон!
СЫМОН. Злітуйся над Ганкаю, Скрабатун!
ВЯДЗЬМАР. Памілую толькі тады, калі аддасі мне скрыпку! Адрачыся ад скрыпкі, Сымон! І Ганка зноў стане тваёю!..
СЫМОН. Не!

ВЯДЗЬМАР. Не?.. Ну, калі так…
СЫМОН. Стойце!
ВЯДЗЬМАР. Што, перадумаў?
СЫМОН. Лепей спаць мне самому спрадвечным сном, толькі адпусці яе, Скрабатун! Памілуй дзяўчо нявіннае!..

Як пачула гэта Ганка, яшчэ больш затузалася.

ГАННА (спрабуецца вымкнуцца з круга чарцей). Ах, Сымонка! Паслухай… Я пераду…

Але па-ранейшаму моцна трымаюць яе чэрці, зноў хаваючы ў мех.

ВЯДЗЬМАР. Заснуць вечным сном жадаеш? А скрыпка твая? Яна ж змоўкне тады назаўсёды.

Ірвецца Ганка, упарта нешта сказаць хоча!

СЫМОН. І няхай! Няхай змоўкне – толькі адпусці маю любую Ганулю на волю!
ВЯДЗЬМАР. А-а-а! Дык, значыць, выракаешся скрыпкі сваёй?
СЫМОН. А вось гэтага не будзе ніколі!
ВЯДЗЬМАР (раззлавана). Нешта я нічога не разумею!.. Навошта табе скрыпка твая, калі ты мёртвым сном спаць будзеш?!.
СЫМОН. І ніколі не зразумееш, няшчасны вядзьмар! Бо дастае яна зусім не тыя скарбы, пра якія ты думаеш!
ВЯДЗЬМАР. Якія яшчэ не такія?!
СЫМОН. А ткія, што рукамі не абмацаць і за грошы ніякія не прадаць! (Раптам голасна, шчыра смяецца). Адпусці Ганку, пачвара!
ВЯДЗЬМАР. Ну, дык спаць табе – не прачнуцца да самага скону!

І адразу накрывае Сымона густы, атрутны туман; коратка ўскрыквае музыка ды, амаль непрытомны, апускаецца на мармуровыя пліты. Вядзьмар дые знак чарцям-служкам, яны адпускаюць Ганку.

ГАНКА (адчайна крычыць). Сымон, Сымонка! Не трэба мне скарбаў-багаццяў, пражывём і без іх, мой любы!.. Аддай, аддай яму скрыпку, не йдзі на пакуты!
СЫМОН (ужо амаль скрозь сон). Позна, Ганка… Ужо позна…

ГАНКА (апускаецца каля яго, горка плача). Што ты нарабіў, Сымонка? Што ж ты нарабіў?.. Што ж ты, мой мілы, зрабіў?..
ВЯДЗЬМАР. Цьфу! Не разумею! Хоць забі мяне гром – ані не разумею! (Раптам з віхураю чарцей вымятаецца прэч).
СЫМОН. Ганка… Ганка…
ГАННА. Я тут, тут я, Сымонка!
СЫМОН. Мая скрыпка… (Засынае).

Хоча нахіліцца Ганка, каб падняць Сымонаву скрыпку, як раптам узлятае тая ў паветра ды замірае нерухома. А потым, спачатку нясмела, зусім-зусім асцярожна выдае некалькі гукаў, бы намацвае іх, бы спрабуе на смак, бы не рашаецца загаварыць-заспяваць на поўныя грудзі. Але прайшло імгненне, другое, і… Загаварыла яна, заспявала! Так заспявала, як ніколі раней не спявала; ніхто на ўсім белым свеце не чуў яшчэ такога грання.

І раптам грымнула навальніцаю скрыпка! Раптам зайшлася-абрынулася на вядзьмарскі палац такім грозным гневам, што задрыжалі тоўстыя сцены ды разваліліся ўшчэнт, завальваючы сабою на векі вечныя і злога Вядзьмара, і ўсіх яго служак-нячысцікаў.

І тоне ўсё ў белым-белым тумане; толькі адзіны ярка-чырвоны прамень прабіваецца скрозь туман ды выразна высвятляе спачатку нерухомага Сымона, а затым недзе ў далечыні прападае лес, сплывае поле, махае хусцінкаю Ганка, самотна знікаючы прывідам.

ГОЛАС (калі прамень спынаецца над Сымонам).
***Спі ж спакойна – сонца ўзыйдзе,***
***Блізка дзень – ты будзь гатоў.***
***А калі наш час надыдзе –***
***Мы сустрэнемся ізноў.***
***Вунь за лесам ноч віднее,***
***Ноч праходзіць, любы, глянь!***
***І памалу ўсё бляднее***
***І знікае Ганна-здань.***
СЫМОН. ***Божа мой! О, сон цяжэрны,***
***Дай мне сілы чары зняць,***
***Каб мой сум і жаль бязмерны***
***Жару раніцы аддаць.***
ГОЛАС. ***Спіць Сымон і разважае,***
***Хоча голаву падняць,***
***Толькі сіл яшчэ не мае***

***Крылле вольнае разняць.***
***Ды устане ён, ачнецца:***
***Круг не скончыў свой Сымон,***
***На шырокі шлях праб’ецца,***
***Хоць мо й доўгі будзе сон.***

Самотна, але нескарона гучыць Сымонава скрыпка.

Канец.

KAMUNIKAT.org

# ВІРТУАЛЬНАЕ ЗУБРАНЯ

Фантастычныя прыгоды ў двух актах

**Дзейныя асобы:**

ЗУБРАНЯ.

РЭАКТЫЎНАЕ БАБРАНЯ.

АСТРАЛЬНАЕ ВОКА.

ЛАВЕЦ.

САНАТУРЫЁНЫ.

ЖЫВЁЛА-РОБАТЫ.

ПЕРАКУЛЕНЫЯ З НОГ НА ГАЛАВУ.

КЛОНА-МОНСТРА-ВІРУС.

МУШКІ.

KAMUNIKAT.org

# А К Т І.

## З”ява першая

Дым, булькаценьне, хрыпеньне, сакатаньне, якатаньне ды змрочна-чортавае сьвятло... Гэта логавішча-лабараторыя ЛАЎЦА. Вось ён і сам, схіліўся ды нешта хімічыць-вядзьмарыць над рознымі кольбачкамі, лямпачкамі, шкельцамі, трубачкамі й пімпачкамі. Перад ім – вялікі экран, гэта Экран Касых Промняў. Вось Лавец дастае пінцэтам з кольбачкі вялізную Муху, прымацоўвае яе да нечага клейкага на шкельцы. Затым накрывае яе шкляным каўпаком ды напускае туды гумавай грушай густога дыму. Дым паступова развейваецца і... раптам на шкельцы гудуць, прыклеенымі, ужо дзьве Мухі!..

ЛАВЕЦ *(так і падскоквае, так і пляскае ў ладкі ад замілаваньня).* О! О-о! Атрымалася! Атрымалася! *(Робіць “казу рагатую”).* Ах вы ж мае мушачкі! Ах вы ж мае клончыкі-кланюшачкі!..

Раптам Мушкі пачынаюць паводзіць сябе вельмі агрэсыўна. Мушкі адрываюцца ад клею, у іх зьяўляюцца вялізныя сківіцы, вырастаюць вялізныя лапы і вочы, паміж імі ўсчыняецца жорсткая бойка.

О! Я нарэшце знайшоў! Я вынайшаў тое, да чаго яшчэ не дадумаўся мозг чалавецтва! Мой сакрэтны праэкт атрымаўся!.. Я вынайшаў клона-монстра-вірус! О! О!!! Вы ўяўляеце, што гэта

такое?! Я цяпер магу злучыць яго з любым зьверам, з таго зьвера зрабіць яшчэ аднаго такога ж звера, а потым яшчэ!.. і яшчэ!!. і яшчэ!!! І кожны з іх будзе самым лютым, самым хіжым і самым жорсткім! Гэта будзе цэлы статак, цэлае войска аднолькавых і непераможных зьвяроў! І тады я з іх дапамогаю заваюю ўсю планету і стану яе адзіным, непадзельным валадаром!

(Міжтым, Мушкі пад каўпаком працягваюць біцца, пакуль бязжальна не загрызаюць адна адну.)

Вось гэта сіла! Вось гэта вынік!.. *(Лавец прыбірае са стала шкельцы з Мушкамі.)* Вось толькі з кім цябе злучыць, маё вірусятка?.. Нічога, зараз нешта прыдумаем... *(Пачынае націскаць на нейкую пімпачку, а на Экране Касых Промняў зьяўляюцца выявы розных зьвяроў ды прыродных краявідаў. Аднак, карціны паўстаюць досыць сумныя: засьмечаныя, забруджаныя тэрыторыі, гарэлыя лясы, атручаныя рэчкі, або кволенькія ці нават выродлівыя жывёлы, якія спаўна адчулі на сябе ўзьдзеяньне сучаснай "цывілізацыі".)* А, д"ябал! У нашым дваццаць першым стагодзьдзі немагчыма нічога знайсьці! А што, калі... А што, калі пашукаць... *(Выявы-карцінкі імкліва зьмяняюць адна адну. І раптам на экране – постаць велічнага, гордага, прыгожага зубра.)* Эўрыка! Зубр! Пушчанскі зубр зь пятнаццатага стагодзьдзя! Гэта тое, што трэба! Гэта дасьць проста цудоўны вынік! Гэй, мае верныя заганятыя!..

На Экране ўуспыхваюць постаці Памочнікаў Лаўца.

Я накіроўваю вас у пятнаццатае стагоддзе і загадваю вам падняць і загнаць сюды, у нашае дваццаць першае стагодьдзе, магутнага пушчанскага зубра! Толькі не забівайце, ён мне патрэбны жывым! Ды варушыцеся, варушыцеся!.. *(Постаці Памочнікаў зьнікаюць. Лавец прыпадае да Экрана Касых Промняў.)* О, пачынаецца!

ГОЛАС.

*Водзіцца зубр у дрымучых лясах на землях літоўскіх,*
*Ён аграмадны і ў рост, і ўпярочкі, і ўдоўж.*
*Так што калі сканае ад ран, унурыўшы голаў,*
*Сядуць да трох малайцоў купай адной між рагоў.*
*Дый галава можа здацца каму не задужа вялікай,*
*Як параўнаць з галавой частак астатніх памер.*
*Поўсьць вісіць памялом, барада вытыркае пагрозна,*
*Чырванью злоснай гарадзь зрэнкі, наводзячы жах.*
*Ўюцца на ім касмылі ад карка да самых лапатак,*
*Лоб закрываюць, паўзуць аж да грудзей і кален.*[1]

ЛАВЕЦ. Так што хутка, вельмі хутка!.. Хутка я буду валодаць самым неперараможным і самым лютым зубрыным статкам! Хутка я буду валадарыць усёй Зямлёй!..

(Чуваць гучныя крыкі Заганятых, іржаньне коней, дзікі рык разьюшанае жывёлы.)

1 Зонг Лаўца

---

[1] Усе ўрыўкі, прыведзеныя з «Песьні пра зубра» М. Гусоўскага, пададзеныя курсівам.

Скрозь дні і стагодьдзі,
Лясы і бязводьдзе
Ідзе паляваньне і гон
На зьвера, на зьвера!
Мы ў літасьць неяверым
І вечнасьць ставім на кон.

Як выйдзем на ловы –
Ня схілім галовы!..
Хай доўжыцца, доўжыцца гон
На зубра, на зубра!
Адчайна і груба
Мы пішам пушчанскі закон!

ГОЛАС ПЕРШАГА ПАГАНЯТАГА. Гэта ня зубр!
ГОЛАС ДРУГОГА ПАГАНЯТАГА. Ня зубр?..
ГОЛАС ТРЭЦЯГА ПАГАНЯТАГА. Так, гэта зубрыха! О, Сонца Сусьветаў! Яна носіць пад сэрцам маленькае зубраня!..

З"ява другая

Сярод зямное, паўрэальна-дзіўнае прасторы – маленькае зьверанятка. На выгляд – зубраня, аднак не зусім матэрыяльнага аблічча...

ЗУБРАНЯ. Вой!.. Хто я? Дзе я? Як я сюды патрапіў? *(Прабіраецца скрозь сьмецьце, усё тыя ж адкіды "цывілізацыі". Напорваецца на нейкую мэталічнасьць.)* А-а!.. Колькі сьмецьця! Бр-р!.. Дык хто ж я такое?

Раптам над ім раскрываецца-выпраменьваецца АСТРАЛЬНАЕ ВОКА.

АСТРАЛЬНАЕ ВОКА. Ты – віртуальнае зубраня!

ЗУБРАНЯ. Віртуальнае зубраня? А ты хто?

АСТРАЛЬНАЕ ВОКА. Я – Астральнае Вока планеты Зямля. І ты знаходзісься на Зямлі ў дваццаць першым стагодьдзі.

ЗУБРАНЯ *(матляе галавою).* У дваццаць першым стагодьдзі? Цікава, цікава! А навошта я сюды патрапіў?

АСТРАЛЬНАЕ ВОКА. Каб спыніць вельмі небясьпечнае паляваньне!

ЗУБРАНЯ. Небясьпечнае паляваньне?.. Вой, не! Не хачу я ніякага паляваньня. Мяне яшчэ, чаго добрага, на ім прыстрэляць. А я трошкі пажыць хачу.

АСТРАЛЬНАЕ ВОКА. Ты абавязаны!

ЗУБРАНЯ. А я – не хачу!!!

АСТРАЛЬНАЕ ВОКА. Гэта вельмі сур”ёзна!

ЗУБРАНЯ. А я – не хачу, не хачу, не хачу!

АСТРАЛЬНАЕ ВОКА. Чаго ж ты хочаш, Зубраня?

ЗУБРАНЯ. Чаго?.. Я да мамы хачу.

АСТРАЛЬНАЕ ВОКА. На жаль, гэта пакуль немагчыма.

ЗУБРАНЯ. Чаму?.. Як спыняць нейкае небясьпечнае паляваньне – так магчыма, а як вярнуцца назад, да сваёй мамы – дык ужо немагчыма?!.

АСТРАЛЬНАЕ ВОКА. Так. Таму што паляваньне йдзе на тваю родную маці, пушчанскую зубрыху зь пятнаццатага стагодьдзя! І зараз яна носіць цябе, сапраўднага, пад сваім сэрцам.

ЗУБРАНЯ. Носіць пад сэрцам? А чаму ж я тут?

АСТРАЛЬНАЕ ВОКА. Толькі дзякуючы майму ўмяшаньню. На шчасьце, я валодаю здольнасьцю надаваць істотам і рэчам віртуальныя абліччы. Але, утрымліваць тваю віртуальнасьць я магу толькі да апоўначы. Таму, калі ты да апоўначы ня спыніш гэтае паляваньне – здарыцца страшнае, вельмі страшнае! Таму слухай уважліва, Рагачок.

*ЗУБРАНЯ. Рагачок?..*

АСТРАЛЬНАЕ ВОКА. Так, Рагачок.

ЗУБРАНЯ *(дурасьліва матляе галавою туды-сюды).* Рагачок, Рагачок, Рагачок!.. А што – мне падабаецца!

АСТРАЛЬНАЕ ВОКА. Паслухай, Рагачок! Ты павінен знайсьці Лаўца і прабіць ягоны Экран Касых Промняў. Інакш ён прагоніць тваю маці праз усе стагодзьдзі й злучыць з небясьпечным клона-монстра-вірусам!

ЗУБРАНЯ. Ну й што?..

АСТРАЛЬНАЕ ВОКА. Тады Лавец зробіць з тваёй мамы цэлыя войска- статак аднолькавых зуброў, якія ня будуць ведаць ні літасьці, ні дараваньня. Лавец завае ўсю планету, а цябе самога самі ж зубры заколюць або загрызуць!

ЗУБРАНЯ. Бр-р!.. А хто такі, гэты Лавец?..

АСТРАЛЬНАЕ ВОКА. Вельмі небясьпечны вучоны-паляўнічы. Гэта ён вынайшаў гэты падступны вірус і арганізаваў паляваньне на тваю маму-зубрыху. Таму трэба сьпяшацца, рагачок! Інакш табе ўжо ніколі ня дыхаць водарам пушчанскага лесу!..

ЗУБРАНЯ. Нішто сабе!.. А… А як жа мне здолець прабіць той нейкі касы экран, калі я – віртуальны? У мяне нават і рагоў сапраўдных няма.

АСТРАЛЬНАЕ ВОКА. У цябе ёсьць усё, што трэба. Ты – віртуальнае! І ты можаш мяняцца.
ЗУБРАНЯ. Мяняцца?.. Як гэта?

Аднак Астральнае Вока цямнее, а потым імкліва зьнікае, патанае ў цемры… Толькі здалёк даносіцца голас: "У цябе ёсьць усё, што трэба! У цябе ёсьць усё, што трэба!.."

З"ява трэцяя

ЗУБРАНЯ. Ну й з чаго я павінен пачаць? Гэй! Вока! Дзе ты там?..

**Цішыня – у адказ…**

Змылася!.. *(Хутка-хутка круціць галавою вакол, бегае туды-сюды, тупаціць на месцы…)* Ну, нічога! Спраўлюся й без цябе! Гэй, Лавец!
ЛАВЕЦ *(седзячы перад Экранам, падкормлівае Вірус нейкімі жоўтымі пігулкамі. Той вуркаціць ад задавальненьня. Побач з Лаўцом – клетка, дзе сядзіць РЭАКТЫЎНАЕ БАБРАНЯ. )* Што я бачу?.. Нейкае маленькае віртуальнае зубранятка?.. Ха-ха-ха-ха!.. Ну што ж! Яшчэ адна нагода пазабавіцца! Ці ня так, маё рэактыўнае Бабраня?..
БАБРАНЯ. Ведаю я вашыя забавы… Зноў дрэнь якую-небудзь утворыце.
ЛАВЕЦ. Ага! Абавязкова! Прычым з тваёй дапамогаю.
БАБРАНЯ. З маёй дапамогаю… Я ж у клетцы сяджу…

ЛАВЕЦ. А я цябе выпушчу.

БАБРАНЯ. Выпусьціце, як жа!.. Можа, яшчэ й ранейшым мяне зробіце – звычайным лясным бабраняцем?

*ЛАВЕЦ. Навошта табе быць звычайным лясным бабраняцем? Ты ж само калісьці прыйшло да мяне і папрасіла зрабіць рэактыўным! Вось і лётай цяпер, куды хочаш.*

БАБРАНЯ. Ага! Палётаеш тут… *(Зноў адчайна кратае лапкамі пруткі клеткі.)*

ЛАВЕЦ *(сьмяецца)*. А гэта каб ты не залётала надта далёка!

БАБРАНЯ. А я далёка і не хачу. Я ў лес хачу. Да сваіх родных брацікаў…

*ЛАВЕЦ. Вось дапаможаш мне ў адной справе – тады адпушчу!.. Слова Лаўца!*

БАБРАНЯ *(бурчыць сабе нешта пад нос)*. Слова Лаўца… Слова Лаўца… Ведаем мы гэтыя словы. Вокам не міргнеш, як зноў у клетку патрапіш. *(Гучней.)* А… што зрабіць трэба?

ЛАВЕЦ *(паказвае на Экран)*. Бачыш гэтае віртуальнае Зубранятка? Здаецца, яно накіроўваецца сюды, да майго логава. Дык вось, ты павінна зрабіць так, каб яно сюды не дайшло!..

БАБРАНЯ. І ўсё?

*ЛАВЕЦ. І ўсё! Замані яго хоць куды, але каб ад гэтае віртуальнасьці засталіся рожкі ды ножкі…*

БАБРАНЯ *(сабе пад нос)*. Гэта ад шэрага козьліка рожкі ды ножкі засталіся, а з гэтым Зубранём можа быць ня ўсё так проста…

ЛАВЕЦ. Што ты там усё мармычаш?

БАБРАНЯ. Ды так, нічога. Значыць, як я зразумела, мне трэба яго заманіць... каб не дайшло... каб рожкі ды ножкі..., і тады вы мяне адпусьціце, Ваша Вучонасьць?

ЛАВЕЦ. А як жа!..

БАБРАНЯ. І зноў зробіце не рэактыўным, а звычайным?

ЛАВЕЦ. Слова Лаўца!

*БАБРАНЯ. Ну, хоць гэта... і не зусім добра... Гэта нават... і вельмі нядобра... Можна сказаць, што...вельмі дрэнна!.. Ды толькі... я згоднае.*

ЛАВЕЦ *(прыадчыняе клетку з Бабраняцем).* Вось і цудоўненька! Вось і ладненька! Давай! Зараз ты хутка перанясесься да гэтага самага Рагачка!.. *(Хоча націснуць на сьпіне Бабраняці нейкую пімпачку.)* Э, стой! Пачакай... Каб ты выпадкам ня зьбег раней часу, дай я надзену на цябе вось гэта. *(Надзявае на Бабраня адмысловыя чорныя акуляры.)* Во!

БАБРАНЯ. Вой! Нешта мне нікуды адсюль ня хочацца ісьці. Нешта мне зноў назад у клетку хочацца...

*ЛАВЕЦ. Ага! У гэтых акулярах усім назад у клетку хочацца. Так што ў іх ты ўжо дакладна ад мяне не зьбяжыш. Але памятай! Калі ты іх здымеш само, дык здарыцца такое, такое!..*

БАБРАНЯ *(з жахам).* Што здарыцца?..

*ЛАВЕЦ. Твой рэактыўны рухавік узарвецца, і ўжо ад цябе самога застануцца рожкі ды ножкі. Не, нават ножак не застанецца! Зразумела?*

БАБРАНЯ *(сумна ўздыхае).* Зразумела...

ЛАВЕЦ. Тады рыхтуйся! Зараз я адпраўлю цябе куды трэба. Да Рагачка, папярэдне зрабіўшы яму суцэльную цемру!

…На той самай паляне, дзе засталося Зубраня ў адзіноце, раптам усё вакол патанае ў поўным чарноцьці. Бачна, як толькі ў цемры сьвецяцца вочы ды абрыс цела Зубраня.

З"ява чацьвертая

ЗУБРАНЯ. Вой! Што за жарты? Гэй, уключыце назад сонца!

Лавец націскае пімпачку на сьпіне Бабраняці, і ў той жа міг яно зьнікае прэч ды аказваецца побач з Зубраняцем.

БАБРАНЯ. Уф, чуф!.. Ты таго… ня бойся.
ЗУБРАНЯ. А ты хто такі?
БАБРАНЯ. Ты што – ня бачыш?..
ЗУБРАНЯ. Ага, у гэткай цемры пабачыш!..
БАБРАНЯ. А, ну так… Я – Рэактыўнае Бабраня.
ЗУБРАНЯ. Рэактыўнае Бабраня? Першы раз пра такое чую!
БАБРАНЯ. Але ж і ты, я бачу, не зусім сапраўднае Зубраня…
ЗУБРАНЯ. Ага! Я – віртуальнае. Слухай, а як ты сюды патрапіла?
БАБРАНЯ. Ды вось ляцела, ляцела – бачу: ты ў цемры блукаеш. Дай, думаю, сяду, добраму стварэньню адсюль выбрацца дапамагу…
ЗУБРАНЯ. Ха, цікава. Навокал – суцэльная ноч, а ты да таго ж – у чорных акулярах!.. Як жа ты мне дапаможаш адсюль выбрацца?
БАБРАНЯ. А я, можа, у іх лепей бачу. Можа, у мяне хобі такое – у чорных акулярах лётаць… Ну, што? Ляціш ты ці не?
ЗУБРАНЯ. Лячу, вядома!

БАБРАНЯ. Тады давай, чапляйся!

Зубраня працягвае лапку Бабраню, і яны разам спрабуюць узьляцець з паляны. Аднак зрабіць гэта ня так проста: яны неяк навобмацак, наштурхоўваючыся на розныя пні-калоды, хмыз і дрэвы, паступова набіраюць вышыню. Але раптам Зубраня трансфармуецца ў нейкае падабенства лятальнага апарату, і скрозь цемру даносіцца ягоны голас: “О, я лячу, лячу! Я таксама ўмею лётаць!” Нарэшце, яны выбіраюцца на сьвятлейшае месца. Ці гэта сьвятлее на той жа самай паляне?.. Магчыма, гэта вядома пакуль толькі аднаму Лаўцу, які, пасьмейваючыся, сядзіць ля Экрана Касых Промняў, ды казыча-лашчыць сваё Вірусятка.

ЗУБРАНЯ *(прымаючы ранейшае аблічча)*. Ух ты, як здорава!.. Паслухай, а можа, ты яшчэ і дарогу да логавішча Лаўца ведаеш?
БАБРАНЯ. Можа, і ведаю...
ЗУБРАНЯ. Праўда?! Дык можа, і пакажаш?!
БАБРАНЯ. Можа, і пакажу...
ЗУБРАНЯ. Дык ляцім хутчэй!
БАБРАНЯ. Дык вось ляцім, ляцім... Усё, прыляцелі!

Яны зьніжаюцца, Бабраня раптам адрываецца ад Зубраняці ды некуды зьнікае. Рагачок застаецца адзін на паляне. Азіраецца вакол сябе.

### З”ява пятая

ЗУБРАНЯ. Цікава, цікава!.. Ну й дзе гэтае логавішча? Гэй, бабраня! Куды ты прапала?

У гэты час Зубраня з усіх бакоў абступаюць ЖЫВЁЛА-РОБАТЫ.

ЖЫВЁЛА-РОБАТЫ.
*Увага, увага! Аб”ект невядомай мадэлі.*
Правесьці апазнаньне.
Правесьці індэфікацыю.
ЗУБРАНЯ. Які аб”ект невядомай мадэлі?! Я – Зубраня!
СЛОНА-БУЛЬДОЗЭР *(відаць, галоўны сярод усіх).* Зубраня? *(Нешта раздумвае-пераварвае ўнутры.)* Мадэлі з такой назвою няма ў каталогу.
ЗУБРАНЯ. Ну, я – не зусім зубраня. Я – віртуальнае зубраня!
МАЛПА-СЬВЯЦІЛЬНЯ. Усё роўна: ты ёсьць жывёла.
ЗУБРАНЯ. Ну й што?..
ТЫГРА-КАМЕНЯРЭЗКА. Тое, што ты – у Краіне Жывёла-Робатаў.
ЗУБРАНЯ. У якой яшчэ Краіне Жывёла-Робатаў?
ТЫГРА-КАМЕНЯРЭЗКА. У той краіне, дзе не павінна быць проста жывёл! У Краіне Жывёла-Робатаў усе павінны быць жывёла-робатамі. Як, скажам, я – Тыгра-Каменярэзка! Гр-р! Гры-р-ррр! *(Паказвае, як рэжа камяні.)*
СЛОНА-БУЛЬДОЗЭР. Або я – Слона-Бульдозер! *(Паказвае, як расчышчае-бульдозерыць гэтыя камяні ды іншы друз.)*
МАЛПА-СЬВЯЦІЛЬНЯ. Або я – Малпа-Сьвяцільня! *(Раз-пораз то ўключаецца, то выключаецца.)*
ДЗІК-ВАЙСКОВЕЦ. Або я – Дзік-Вайсковец! *(Тупа крочыць на месцы ды спрабуе лупіць капыткамі ў вайсковы барабан.)*
ЗУБРАНЯ. Ой, якія ж вы няшчасьненькія!

МАЛПА-СЬВЯЦІЛЬНЯ. Няшчасьненькія? Гэта чаму мы няшчасьненькія? Чаму гэта?

*ЗУБРАНЯ. Як чаму? Як я разумею, калі ты малпа – дык павінна малпаваць, есьці бабаны ды скакаць па дрэвах. Калі слон – дык махаць вушамі, адганаючы авадней, ды паліваць з хобату кветкі! Калі дзік – рыцца лычам у зямлі, дастаючы смачныя карэньчыкі ды тлустых чарвячочкаў! Калі тыгра – дык табе самая справа быць каралём у джунглях!*

ТЫГРА-КАМЕНЯРЭЗКА *(нават летуценна)*. М-м, каралём у джунглях!.. *(Аднак адразу адганяе ад сябе мроіска.)* Не! Мы – Жывёла-Робаты!!!

ЖЫВЁЛА-РОБАТЫ *(дружна разам)*. Так!!!

*ЗУБРАНЯ. Але чаму вы павінны абавязкова быць Жывёла-Робатамі?!*

ЖЫВЁЛА-РОБАТЫ. Так загадаў Лавец!

ЗУБРАНЯ. Што?!

ДЗІК-ВАЙСКОВЕЦ. Так, Краіна Жывёла-Робатаў прыдумана Яго Найвялікшай Вучонасьцю панам Лаўцом.

ЗУБРАНЯ. Ха!.. А калі я не жадаю быць жывёла-робатам?

ДЗІК-ВАЙСКОВЕЦ. Тых загадана зьесьці. За шэсць гадзін да апоўначы.

(Жывёла-Робаты пасоўваюцца бліжэй на Зубраня.)

ЗУБРАНЯ. Што?.. Да апоўначы – толькі шэсць гадзін?..

ЖЫВЁЛА-РОБАТЫ *(ня чуючы Рагачка)*.

Тых загадана зьесьці. За шэсць гадзін да апоўначы.

Тых загадана зьесьці. За шэсць гадзін да апоўначы.

Тых загадана зьесьці. За шэсць гадзін да апоўначы.

*(Адзін зь іх паказвае на нейкія голыя вялізныя шкілеты, якія валяюцца на пустцы.)*

Як гэтых мамантаў.
*Яны не хацелі пертвараца ў жывёла-робатаў.*
Яны занадта выпендрываліся.

Зубраня ўважліва аглядвае шкілеты. Бачна, што яно трохі ў разгубленасьці… Раптам аднекуль звышынь да яго даносіцца голас Астральнага Вока: “Ня бойся іх, Зубраня! У цябе ёсьць усё, што трэба!..

ЗУБРАНЯ *(раптам весела матляе галавою, нечаму ўсьміхаецца. )* Ну, і добра!.. Давайце! Ешце, калі ў вас у галовах – адны мэталёвыя клепкі!..
СЛОНА-БУЛЬДОЗЭР. Ты не жартуеш? Ты напраўду хочаш быць зьедзеным?
ЗУБРАНЯ. Ага!
ТЫГРА-КАМЕНЯРЭЗКА. І не пашкадуеш?
ЗУБРАНЯ. Аніколечкі!
ТЫГРА-КАМЕНЯРЭЗКА. Ну, тады… *(Абарочваецца да іншых Жывёла-Робатаў).* Ён выбраў лёс гэтых мамантаў!

Усе Жывёла-Робаты дружна шчоўкаюць сківіцамі й ўсё бліжэй падступаюць да Зубраняці.

Гам!

ІНШЫЯ ЖЫВЁЛА-РОБАТЫ. Гам! Гам!! Гам!!!

**Зонг Жывёла-Робатаў**

Мы – жывёла-робаты,
Мы – жывёла-робаты,
Мы – жывёла-робаты, ха-ха.
У нас ёсьць шлангі-хобаты,
У нас ёсьць лапы-шкробаты,
У нас ёсьць іклы-дробаты,
Нам мозг заменяць чобаты,
Ха-ха, ра-ха, ха-ха!..

А хто ня стане робатам,
Па пысе – брудным чобатам,
Таго засмокчам хобатам, гам-гам!
Зжарэм таго з вантробамі,
Як мамантаў – угробаем!..
Бо хто не жывёла-робаты,
Мы тых з гарчыцай лопаем!
За шэсьць гадзін да апоўначы – гам, гам, гам!

Тыгра-Каменярэзка хіжа шчоўкае сківіцамі, спрабуючы ўкусіць Зубраня. Аднак тое раптам ператвараецца ў падабенства гордага Воя-Зубра, які мае грозную зброю і

лёгка peралятае ад аднаго Жывёла-Робата да другога, наносіць ім рашучыя ўдары, пераносіцца на бясьпечную адлегаласьць. Жывёла-Робаты ў разгубленасьці, некаторыя з іх ужо ляжаць, нізрынутыя…

ЗУБРАНЯ (зноў робіцца маленькім і нібы бездапаможным). Ха-ха! Ну што – зьелі? Укусілі?..
ДЗІК-ВАЙСКОВЕЦ. Штосьці мне не зразумела! Гам!
ЖЫВЁЛА-РОБАТЫ. Гам! Гам!! Гам!!!
ЗУБРАНЯ *(весела сьмеючыся).* А, дык вам яшчэ мала! (Зноў у постаці Воя-Зубра працягвае бітву.)
*ДЗІК-ВАЙСКОВЕЦ. Штосьці мне не зразумела!*
ТЫГРА-КАМЕНЯРЭЗКА. І мне!
СЛОН-БУЛЬДОЗЕР. І мне…
МАЛПА-СЬВЯЦІЛЬНЯ. І мне, і мне!..

Нечакана з Жывёла-Робатамі робіцца нешта неверагоднае: яны пачынаюць трашчаць, іскрыцца, трэсцыціся ды гудзець, зыходзяць курodымам і нарэшце проста на вачах узрываюцца, трэскаюцца, рассыпаюцца… Ад іх застаюцца толькі нікчэмныя рэшткі дэталяў, шкла ды пластмасы.

ЗУБРАНЯ *(у сваім ранейшым абліччы).* Ну вось!.. Самі выпендрываліся… як тыя маманты! *(Азіраецца вакол сябе.)* Аднак куды падзелася гэтае Бабраня? Дарма, аднак, начапіла яно чорныя акуляры. Відаць, само заблудзілася. Пайду шукаць!.. *(Зыходзіць з паляны, на якой застаюцца толькі рэшты Жывёла-Робатаў…)*

К а н е ц   п е р ш а г а   а к т у

# А К Т   I I

## З”ява шостая

Перад Экранам Касых Промняў сядзіць Лавец, назіраючы, як доўжыцца паляваньне на пушчанскую Зубрыху-Маці. Адначасова ён падкідвае ў пашчу Монста-Вірусу жоўтыя пігулкі, ад які той сыцее-тлусьцее проста на вачах!.. Вірус задаволена чмякае-жвакае.

ЛАВЕЦ. У, ненажэрнасьць!..

ГОЛАС.

*...Ценькія стрэлы здалёк у зубра сьпярша паляцелі,*
*Ўпіліся колкім васьцём зьверху, на хібе яго.*
*Гнеўна зірнуў на людзей паранены зьлёгку палоньнік,*
*Ровам магутным зароў, ноздрамі трэплючы рык.*
*Потым крутнуўся назад, дзе бегма, а дзе і падскокам,*
*Мерыўся бык уцякаць, каб ухіліцца ад стрэл.*
*Верхнікі сьледам хутчэй са сьвістам і лямантам гучным,*
*Пушча ад крыкаў дрыжыць, рэха сягае да зор.*
*Ледзь толькі ён даімчаўся туды, дзе сьцяна паўставала,*
*Дзе яму тын заступаў шлях на абшары лясоў,*
*Гучныя крыкі людзей і там бегляка сустракаюць.*
*Зьвер прыпыніўся. Куды ж трэба цяпер уцякаць?..*

ЛАВЕЦ. А, ага! Ату яе, ату!.. Ну, чаго сталі? Чаго спыніліся? Давайце, давайце! Ганіце яе далей!..

Раптам на Экране выяву паляваньня зьмяняе выява разбураных Жывёла-Робатаў.

*О, а гэта што?!. Дзе гэтае нягоднае Бабраня?..*

*У гэты момант з іскрэньнем ды трэскам проста ледзь не на галаву Лаўцу аднекуль зьверху падае Рэактыўнае Бабраня.*

БАБРАНЯ *(паказваецца з-за Экрану)*. Я тут... Усё зрабіў, як вы загадалі, Ваша Вучонасьць. Давайце, рабіце мяне нармальным...
ЛАВЕЦ *(раззлавана)*. О, зараз! Я цяпер нават і сам ня ведаю, што з табою зраблю! *(Паказвае на Экран)*. Паглядзі!..
БАБРАНЯ *(хаваецца за сьпіну Лаўца)*. Вох! Гэта ня я...
ЛАВЕЦ. Вядома, ня ты! Гэта віртуальнае Зубраня! Якая гнюснасьць! Ён зьнішчыў маю Краіну Жывёла-Робатаў! Маю ўлюбёную, прыгожую краіну супэр-сучаснай цывілізацыі!.. Але нічога! Гэй, Бабраня, дзе ты там?
БАБРАНЯ *(амаль навобмацак у чорных акулярах клэпае вакол Лаўца, робячы некалькі кругоў.)* Ды тут я, тут...
ЛАВЕЦ. Дзе?!
БАБРАНЯ. Тут, тут...
ЛАВЕЦ *(нарэшце хапае Бабраня за футравы каўнер)*. Ха! А дзе ж цябе яшчэ быць? Давай, адшукай мне зноў гэтае Зубранятка ды замані яго туды, адкуль яно ўжо ня выйдзе!..
БАБРАНЯ. Гэта куды?..

ЛАВЕЦ. Куды хочаш! Але каб з Рагачком было скончана яшчэ надвячоркам!

БАБРАНЯ. І чаго вы яго так баіцёся, Ваша Вучонасьць?

ЛАВЕЦ. Што?! Каб я – і некага баяўся? Тым больш, нейкае нікчэмнае віртуальнае Зубраня!.. Ха-ха! Яму ніколі ня ўдасца прабрацца ў маё логавішча!..

БАБРАНЯ. Гэта чаму?..

ЛАВЕЦ. Таму што на ягоным шляху тады паўстане мой Клона-Монстра-Вірус, якога немагчыма зьнішчыць!..

БАБРАНЯ. Так ужо й немагчыма...

ЛАВЕЦ. Ну, ёсьць адзін сродак... *(Бярэ з палічкі дзьве скляначкі з пігулкамі: у адной – жоўтыя, у другой – чырвоныя.)* Вось ад гэтых жоўценькіх пігулак мой монстра-вірусік толькі расьце, расьце!.. Але варта вірусу зьесьці хоць адну пігулку вось з гэтай скляначкі *(паказвае скляначку з чырвонымі пігулкамі)*, як ён адразу пачне зьмяньшацца. Зьмяньшацца і зьмяньшацца да той пары, пакуль ня зьнікне зусім. І пра гэта ніхто ня ведае, акрамя мяне, Вялікага Вучонага, які вынайшаў усё гэта!.. *(Лавец, відаць, разумее, што збалбатнуў нешта лішняе. )* Але ты нічога ня чула, занадта балбатлівае Бабраня! *(Далей шэптам.)* Бо калі я даведаюся... што ты... каму-небудзь пра гэта... я скармлю цябе майму Монстра-Вірусу!..

БАБРАНЯ *(адразу прыкідваецца глухім)*. А?.. Што?.. Вы нешта сказалі? Ці гэта мне падалося?

ЛАВЕЦ *(хавае скляначкі. Бабраня ўважліва назірае за ўсім гэтым)*. Падалося! Вядома ж, падалося. *(Зноў прыпадае да Экрана, дзе разварочваецца далейшая сцэна паляваньня.)* А, ату яго, ату! Ганіце яго, ганіце! Ганіце яго сюды!.. *(Адрываецца*

*ад Экрана.)* Аднак, бабраня, за справу! Давай, рабі ўсё так, як табе загадана!

БАБРАНЯ. Ды ўжо ж зраблю, зраблю... Давайце, націскайце сваю пімпачку...

ЛАВЕЦ. Тваю, тваю пімпачку!

Лавец націскае пімпачку на сьпінцы Бабраняці, і тое, узравеўшы турбінкаю, імгненна ўносіцца прэч.

З"ява сёмая

Зубранятка ідзе-брыдзе скрозь густы лес, там-сям пераскокваючы-пералятаючы скрозь купіны, жалезьзе ды ламачча. Бачна, што яно ўжо трохі заморанае.

ЗУБРАНЯ *(на нешта напорваецца).* А!.. Гэта ж трэба – так збэсьціць-здратаваць зямлю за нейкіх там сем стагодьдзяў!... *(Азіраецца па баках.)* Ну й дзе мне шукаць гэтага вучонага Лаўца зь ягоным касым экранам?.. А куды падзелася Рэактыўнае Бабраня? Абяцала паказаць мне дарогу. А часу застаецца так мала!.. А паляваньне на маю мілую мамульку-зубрыху ўсё доўжыцца й доўжыцца!.. А можа... ужо?!. *( Раптоўна спыняецца. Прыпадае вухам да зямлі. Усё бліжэй чутны гукі небясьпечнага паляваньня...)*

ГОЛАС.

*...Зыканьне, гойканьне зноў поўняць зьвярэджаны лес.*
*Нельга ўцячы напрасткі, адкінь нават гэту надзею.*
*Хочаш сябе ўратаваць, ломаным шляхам скачы.*
*Ярасьць, шалёны імпэт шпурляюць бычыну далёка,*
*Зь целам такой грувізны крута ня збочыць яму.*

*Вокала зьвера штораз нахабныя верхнікі шныраць,*
*Ён жа за кожным бяжыць, пэўна, ня можа інакш.*
*Выцягся нейк, пабольшаў яшчэ, сігае ўтрапёна,*
*Быццам на злом галавы, ровам глухім равучы.*
*Вецер калыша і гне пачварную грыву наРоскід,*
*Грозны і страшны цяпер гэты лясны велікан…*

Раптам на тое самае месца, дзе чутна прыслухоўваецца да зямлі Зубраня, заходзіць на крутую пасадку Рэактыўнае Бабраня.

БАБРАНЯ. Уф!.. Пуф! Прызямлілася…

ЗУБРАНЯ. Бабраня! Куды ты падзелася? Ты што – заблудзілася? Дзіва што – у гэткіх чорных акулярах. Зьняло б ты іх ці што… (Як бы спрабуе зьняць з Бабраня акуляры.)

БАБРАНЯ *(у сполаху адстараняецца)*. Яшчэ чаго!.. Проста трохі пераляцела наперад, каб лепей дарогу ўспомніць.

ЗУБРАНЯ. І як, успомніла?

БАБРАНЯ. А як жа. Давай, Рагачок. Логавішча Лаўца ўжо блізка…

ЗУБРАНЯ. Праўда?!. Дык наперад!

Зноў узносяцца над палянаю. Бабраня хапае Рагачка й раптоўна ідзе ў крутым піке некуды ўніз.

## З”ява восьмая

ЗУБРАНЯ. А-а!.. О-о!.. *(Нарэшце прызямляюцца.)* Ого!..

Вакол іх – досыць нечаканы, можна сказаць, перакулены пейзаж. Усё тут стаіць ды вісіць дагары нагамі, нават дрэвы растуць неяк крыва ці дагары карэньнямі, а многія жывыя істоты таксама ходзяць на галаве.

*(Азіраецца вакол сябе.)* Нешта як бы ня тое…

БАБРАНЯ. Ну… гэта… таго… гледзячы як паглядзець.

Раптам сярод іх зьяўляюцца грозныя САНАТУРЫЁНЫ зь нейкімі прыборамі ў руках. Усе, хто яшчэ стаяў на нагах, неадкладна куляюцца.

*(Заўважыўшы Санатурыёнаў).* Вой!.. *(Не марудзячы, таксама куляецца).* Куляйся хутчэй!
ЗУБРАНЯ. Куляцца? А навошта?
1 САНАТУРЫЁН. Таму што тут – Краіна Перакуленых з Ног на Галаву, дзе ўсе павінны куляцца!..
ЗУБРАНЯ. Куляцца? Куды куляцца? Навошта куляцца?..
АДЗІН З ПЕРАКУЛЕНЫХ. Давай, Зубраня, куляйся!.. Калі не жадаеш патрапіць пад санатар Санатурыёнаў! Яны праходзяць тут кожную гадзіну!..
2 САНАТУРЫЁН (*заўважае Зубраня, якое стаіць на нагах).* Імем Яго Найсьвятлейшай Вучонасьці Лаўца! Загадваю перакуліцца!

kamunikat.org

ЗУБРАНЯ. Што? Ізноў Лавец? Ён і сюды дацягнуўся?

ПЕРАКУЛЕНЫЯ *(з розных бакоў).* Куляйся хутчэй! Куляйся! Да апоўначы перакуліцца засталося ўсяго тры разы!

ЗУБРАНЯ. Як?! Да апоўначы – усяго тры гадзіны?..

Санатурыёны пачынаюць накіроўваць свае санатары на Зубраня.

*1 САНАТУРЫЁН. Увага! Аб"ект лясовае канфігурацыі Зубраня падлягае татальнай Санацыі! Аб"ект лясовае канфігурацыі Зубраня падлягае татальнай Санацыі!*

**Зонг Санатурыёнаў**

Татальная санацыя
З агульнай дэтанацыяй
Усіх, хто не куляецца,
Хто подла усьміхаецца,
Ад службы хто ўхіляецца,
Хто ходзіць на нагах!
Вам вырак: распыляцыя
Ва ўмовах акупацыі,
І уваччу каб – жах!

Татальная санацыя
Плюс цур-цурбанізацыя –
Даверылі нам акцыю,
Каб болей выбіць кальцыю
Для галавастай нацыі
З тых гадаў на нагах!

Загад: стаяць! Ня дрыгацца,

Каб нам да вас наблізіцца,

**І каб зрабіць трах-бах!**

Санатурыёны маўкліва накіроўваюць санатары проста на Зубраня.

ЗУБРАНЯ. Пачакайце, пачакайце!..

САНАТУРЫЁНЫ. Што такое?

ЗУБРАНЯ *(падыходзіць бліжэй да перакуленых).* Вой, якія яны ўсе сьмешныя!.. А, дзюба, дзюба, дзю! А бо-ба, бо-ба, бо!..

Зубраня нечакана пачынае казытаць рожкамі пяткі перакуленым. Тыя, стоячы на галовах, дрыгаюць нагамі, курчацца, сьмяюцца. Паступова сьмех пераходзіць у суцэльны рогат. Санатурыёны, спачатку разгубленыя, таксама пачынаюць рагатаць.

САНАТУРЫЁНЫ. Ха-ха-ха!.. Во даюць! Во сьмехата! І нам!.. І нам таксама!.. Таго... хочацца!..

ЗУБРАНЯ. Дык куляйцеся!

САНАТУРЫЁНЫ. Ага! Зараз! Паказыч і нам пятачкі!

*Санатурыёны куляюцца, выстаўляючы на агульны агляд свае вялізныя голыя пяткі.*

ЗУБРАНЯ. Гэта мы можам! Гэта мы мігам!.. *(Пачынае казытаць пяткі Санатурыёнам. Гукае Перакуленых.)* Гэй! Давайце, дапамагайце!..

Перакуленыя спачатку асьцярожна, а потым усё сьмялей падымаюцца, далучаюцца да Зубраня. Санатурыёны рагочуць так, што ўсё трасецца... Увогуле, навокал стаіць суцэльны рогат.

*1 САНАТУРЫЁН. Ха-ха-ха! Вой, не магу!..*

2 САНАТУРЫЁН. Го-го-го! Вой, дастаткова!

ЗУБРАНЯ. Казычце, казычце! Так трымаць, панове! *(Самое ж борздка раскатурхвае Бабраня, якое ўсё яшчэ стаіць перакуленым.)* Гэй, Бабраня, уцякаем!..

БАБРАНЯ *(узьнімаючы галаў).* А?.. Што?..

ЗУБРАНЯ. Уцякаем хутчэй, пакуль яны не ачомаліся! *(Проста сілаю адрывае Бабраня ад зямлі ды хаваецца зь ім хутчэй за бліжэйшае дрэва...)*

З"ява дзявятая

БАБРАНЯ. Ой! *(Хоць і амаль навобмацак, таму як яму ня надта зручна ў чорных акулярах, зьдзіўлена разглядвае Зубраня).* Так ты жывое?..

ЗУБРАНЯ. Ну, вядома, жывое! Ды скінь ты гэтыя чорныя акуляры!.. *(Рашуча зрывае акуляры з Бабраня.)*

БАБРАНЯ. А-вой!.. *(Зарываецца ў траву ў чаканьні самага жахлівага...)* Усё, я ўзарвуся! Вой, мая мамачка! Я ўзарвуся!.. *(Аднак, на дзіва, зь ім нічога не адбываецца. Ну абсалютна нічога, і ўсё тут!)*

ЗУБРАНЯ. Узарвесься? А чаму ты павінен ўзарвацца?

БАБРАНЯ *(узьнімаючы голаў з травы).* Таму што!.. Таму што так папярэдзіў Лавец!

ЗУБРАНЯ *(падыходзіць да Бабраня, нейкі час уважліва глядзіць яму ў вочы).* Што?.. Лавец?.. Дык, значыць, і ты... А я... табе... А ты!.. *(Зь вялізнай скрухаю.)* Эх, ты!

БАБРАНЯ. Я што – не ўзарвалася?.. *(Нешта, відаць, зразумеўшы...)* Значыць, гэта падман?! Зубранятка, міленькае, даруй мне, калі ласка! Хітрэнны Лавец начапіў на мяне гэтыя чортавыя акуляры, каб я слухалася яго ды выконвала ўсе загады! І ён мне загадаў... ён мне загадаў... *(хлюпаючы носам)* заманіць цябе туды... туды... адкуль... адкуль ужо не вяртаюцца!

ЗУБРАНЯ. А навошта ты яго паслухалася?

БАБРАНЯ. Таму што Лавец даўно трымае мяне ў клетцы. І таму што я хачу зноў стаць нармальным, звычайным Бабранём, а ніякім там рэактыўным! А зрабіць гэта можа толькі ён – пан Лавец!

ЗУБРАНЯ. Эх, ты! Я так табе верыла! А хоць ведаеш ты, што гэты самы Лавец ўзьняў паляваньне на маю маці-зубрыху?

БАБРАНЯ. Не...

ЗУБРАНЯ. І што ён хоча яе злучыць са сваім монстра-клона-вірусам, каб зрабіць зь яе цэлы статак хіжых і страшных зубраў?

БАБРАНЯ. Не...

ЗУБРАНЯ. І што калі да апоўначы я не спыню Лаўца, дык ён рана ці позна заваюе з гэтым пачварным статкам усю зямлю і будзе тварыць-вычвараць на ёй, што захоча!..

БАБРАНЯ. Вой!.. Ты прабач... Я ня ведала... Лавец подлым чынам... мне загадаў... прымусіў...

ЗУБРАНЯ. Каб само не схацела, дык ніхто б цябе не прымусіў! Э, ды што з табою гаварыць!.. *(Адварочваецца ад Бабраня ды ідзе прэч.)*

БАБРАНЯ *(з тугой глядзіць усьлед Зубраняці. Раптам на нешта рашаецца.)* Рагачок, пачакай! *(Рагачок не спыняецца.)* Даруй мне, калі можаш. *(Рагачок толькі адмахваецца.)*

*ЗУБРАНЯ. Як я магу табе даравваць, калі ты дамагаўся маёй пагібелі? Не!*

БАБРАНЯ *(адчайна).* Не?!.

ЗУБРАНЯ. Не!!!

БАБРАНЯ. Ну, тады... бывай?! *(Ужо хоча адляцець, але яшчэ раз абарочваецца на Зубраня.)* Калі хочаш знайсьці логавішча Лаўца – трымайся старой разбуранай вежы!.. *(Адлятае.)*

ЗУБРАНЯ. Дзякуй і на гэтым...

Зубраня ідзе-брыдзе прэч...

З"ява дзясятая

Гікі, сьвіст, улюлюканьне. Чуваць, як брэшуць сабакі, як іржуць коні, як раве паранены зьвер. На вялікім Экране Лаўца бачна, як набліжаецца дзікае, няспыннае паляваньне.

ГОЛАС.

*...Рэдкім крывым ланцужком наўкола верхнікі скачуць,*

*Зьвера бунтуюць усяк: пострахам, ганай, кляцьбой.*

*Кожны у гонах штукар!.. Але й тут не бывае бязь ліха,*

*Гіне, на жаль, і спрытняк, звыклы да розных нягод...*

.....................................................................

*Хмарышчы коп”яў і стрэл, галёканьне, крыкі і посьвіст Зьбеглага ў самы гушчар гналі са сховы далей.*

*ЛАВЕЦ. Цудоўна! Выдатна! Брава, брава! Бравісіма! Гон! Гэта гон!!! Вялікае паляваньне ўжо мінае васемнаццатае стагодьдзе! Хутка, ужо зусім хутка!.. Хутка я злучу цябе, маё вірусятачка, з гэтым магутным зубрам, які ператворыцца ў сапраўднага монстра! А потым я пачну вас кланаваць, размнажаць, гадаваць-вырошчваць! О, які ж гэта будзе статак!.. О, якая ж страхотная моц! Якое гэта будзе войска! Такога сапраўды яшчэ не было на Зямлі!* (Зноў прыпадае да Экрана.) *Цікава, а што там у нас з гэтым маленькім зубраняткам?*

Лавец ловіць “карцінку” Краіны Перакуленых. Там па-ранейшаму стаіць суцэльны рогат.

Што?! Яно ўзбунтавала маю Краіну Перакуленых з Ног на Галаву! Гэй, Санатурыёны!.. *(Санатурыёны, аднак, рагочуць, як і ўсе астатнія, і зусім ня чуюць Лаўца.)* Яно ўзбунтавала маіх верных санатурыёнаў! А гэтае агіднае стварэньне Бабраня, відаць, зьбегла зь ім разам! Але ж я яго папярэджваў!.. Ну, трымайцеся! *(Кладзе руку на нейкую рукавятачку.)* Пяць, чатыры, тры, два, адзін!.. Пуск!!! *(Рэзка паварочвае рукавятку. І адразу ў паветра ўзьлятае маленькая крылатая ракета, бяручы курс на той самы куст, дзе Зубраня сарвала з Бабраняці чорныя акуляры, і дзе яны зараз ляжаць у гордае адзіноце. Ракета зьніжаецца, трапляе ў*

*акуляры, адбываецца страшэнны выбух. Чорныя шкельцы ды рэшткі акуляраў нейкі час лунаюць у курадымным паветры…)*

Чорны Зонг Лаўца

Чорнае стагодьдзе, чорнае неба, чорная хмара –
Чорнае хараство.
Чорная ежа, чорныя людзі, чорныя твары,
Чорнае-чорнае зло!

Чорныя ночы, чорнае раньне, чорныя зоры,
З чорнага рысу – ваш плоў.
Чорнае ўчора, чорнае сёньня, чорная заўтра –

**Чорная радасьць бяз слоў!**

Вось і ўсё! Вось і ўсе праблемы! Бывайце, дурненькія зьвераняткі!.. *(Але раптам бачыць, што Зубраня ўпарта працягвае свой шлях.)* Як?! Так ты жывое, упартае Зубраня? Ну, нічога. Зусім хутка я з Монстра-Вірусам займуся табой ушчыльную!.. Ха-ха-ха! Паляваньне! Мы прадоўжым нашае вялікае паляваньне!..

Зноў чуюцца гукі няспыннага паляваньня: рык раз"ятранае ды стомленае жывёлы, іржаньне коней, гучныя зыкі Паганятых.

ЛАВЕЦ *(перад Экранам).*

…Можна бадай што канчаць з натомленым гонамі зубрам,
Ярасьці буйнай запал добра яго змардаваў.

Потам сьцякаючы ўвесь, калоціць нагамі пад брухам,

Пены ашмоцьце густой падае часта на дол.

Глянь, ужо цяжка сапе і чэрава лупіць няшчадна,

Пена ідзе адусюль, так яго выматаў гон.

Млявасьць у рухах відаць, хадою няцьвёрдаю крочыць,

Зрок засьцілае туман, часта міргае вачмі.

Каб не цягнула у рот дыханьнем парывістым грыву,

Свой жа настырны касмыль, злосна кусаючы, рве!.

А-а, гэта канец!.. Канец вялікаму паляваньню! *(Гукі паляваньня чуваць зусім блізка.)* О, яны ўжо загналі зубрыху ў наша родненькае дваццаць першае стагодьдзе! Ха-ха, ха-ха-ха! *(Трэпле Вірус па загрыўку.)* Вірусятка, рыхтуйся!.. Хутка пачнецца!.. Зусім хутка ты станеш Зубра-Монстрам – самым страшным зьверам, які быў на зямлі!! *(Кідае яму ў рот ласунак. Вірус шчокаўе сківіцамі так, што ледзь не адкусвае Лаўцу пальцы.)* У-у, ненажэрнасьць!

ВІРУС *(згодна хітае галавою, пажырае ласунак).* Гр-р, гам, гам, гам!..

У гэты час Зубраня аказваецца на рэштках нейкіх збудаваньняў, сярод якой – старая вежа. Азіраецца вакол. Раптам у гэты час на вежы пачынае трашчаць і хрыпець стары гадзіньнік, рыхтуючыся да бою.

ЗУБРАНЯ. Ага! Вось і старая вежа з гадзіньнікам! Колькі там часу? Што?.. Да апоўначы – усяго пяць хвілін?!. Усё прапала!

ЛАВЕЦ *(з"яўляецца перад сваім логавішчам зь вялізным Монстра-Вірусам на ланцугу).* Ну вядома ж, прапала! Як зараз

прападзеш ты, няшчаснае Зубраня!.. А ну, маё вірусятка, адарві яму галаву! Фас! Кусі яго, кусі! *(Спускае з ланцуга Монстра-Віруса, той рашуча кідаецца ў атаку.)*
ЗУБРАНЯ *(не марудзячы, ператвараецца ў Воя-Зубра)*. Гэта мы яшчэ паглядзім, хто каму адарве голаў!

Пачынаецца рашучая схватка. З пераменным посьпехам атакуюць то Клона-Монстра-Вірус, то Вой-Зубр. Аднак з кожнай хваляй Монстра-Вірус усё болей насядае на Воя-Зубра, якому даводзіцца вельмі ж несалодка…

ЛАВЕЦ *(назіраючы за схваткаю з парогу свайго логавішча, якое крыху прыадчынена)*. Гэта канец! Гэта сапраўды твой няшчасны канец, няшчаснае Зубраня! А ну, падмацуйся сваёй смачнай пігулачкай, маё вірусятка!

Лавец кідае яму жоўтую пігулку, якую Вірус наляту хапае ды праглочвае. І адразу ён нібы раздаецца ўшыркі, набіраючыся яшчэ большае моцы. Проста з жахлівай неміласэрнсьцю атакуе Воя-Зубра!.. Здаецца, яшчэ імгненьне – і Вой-Зубр будзе паверcharacterжаны.

Аднак у гэты момант нейкі незразумелы слуп-віхура праносіцца міма Лаўца, пранікаючы ў ягонае логавішча.

А?! Што такое?.. Што гэта было?..
БАБРАНЯ *(вылятаючы з логавішча, трыумфальна трымаючы ў руках скляначку з чырвонымі пігулкамі.)* Я чуў, тут нехта сказаў, што гэта канец?.. Здаецца, Лавец, ты пасьпяшаўся. *(Адкрывае скляначку ды кідае чырвоную пігулку Монстра-Вірусу. Той наляту гэтак жа прагна ловіць ды праглочвае яе. )*

ВІРУС. У-у! Ш-шмаката!!!
ЛАВЕЦ. А-а! Што ты нарабіла, дурное рэактыўнае бабраня?!

У гэты момант Вірус з ранейшым імпэтам накідваецца на Воя-Зубра, аднак зь ім імкліва пачынаюць адбывацца жахлівыя перамены: ён адразу робіцца маленькім, нікчэмным ды... проста сьмешненькім.

ВОЙ-ЗУБР *(рашуча адкідвае ад сябэ прэч Вірус).* Не шмаката, а шмакадзяўка!.. Прэч з дарогі, Лавец! *(Урываецца ў логавішча.)*
*ЛАВЕЦ. А-а! Мой вірус! Мой Экран! Маё паляваньне!..*
ВОЙ-ЗУБР. Скончана тваё паляваньне! *(Прымае ранейшае аблічча Зубраняці. Рожкамі ўшчэнт разьбівае Экран Касых Промняў.)* Мама!.. Я пасьпеў! Мы ўсё ж пасьпелі ўратаваць цябе!
ВЫЯВА МАЦІ-ЗУБРЫХІ *(аднекуль здалёк).* Рагачок!..

Раптам чуваць разгубленыя галасы Заганятых.

ГОЛАС ПЕРШАГА ЗАГАНЯТАГА. Што такое?!. Куды падзелася гэта зьвяруга?
ГОЛАС ДРУГОГА ЗАГАНЯТАГА. А-а! Я нічога ня бачу! Мне нешта трапіла ў вока!..
ГОЛАС ТРЭЦЯГА ЗАГАНЯТАГА. Вось табе й паляваньне! На тым самым суку й паселі!..

З”ява адзінаццатая

ЛАВЕЦ. А-а! Гэта канец!.. Мой Экран! Мой вірус!.. Маё паляваньне!.. А, гэта канец!..

ЗУБРАНЯ *(хапае маленечкі вірус ды кідае яго за каўнер Лаўца.)* Так, на гэты раз гэта твой канец, няшчасны лавец нікчэмных шкодных кузурак! *(Лавец зь лямантам спрабуе вытрасьці Вірус з-за каўнера, уцякае прэч. Зубраня крычыць наўздагон:)* Вось цяпер, калі ласка, – рабіце адзін з аднаго страшных монстрыкаў, колькі вам пажадаецца!..

БАБРАНЯ. Лёгкага ветру ў сьпіну! *(Да Зубраняці. Трохі разгублена.)* Дык што ж – я цяпер застануся рэактыўным назаўсёды?!

РЫЦАРОК. На жаль, відаць, ужо нічога нельга зрабіць, о, слаўнае Бабраня! Дзякуй табе! Вялікі дзякуй за дапамогу. І… прабач, што раней сердаваў на цябе.

БАБРАНЯ. Ды чаго там… Можа, яшчэ каму тэрміновая дапамога спатрэбіцца. Калі так – дык згодны быць рэактыўным Бабранём хоць вечна!..

І тут зноў яркім сьвятлом успыхвае Астральнае Вока.

АСТРАЛЬНАЕ ВОКА. Ты хутка зьнікнеш, віртуальнае Зубраня. Але не сумуй – ты народзісься маленькім, жывым зубраняцем у слаўнай сваёй пушчы, у цёплым логавішчы тваёй мамы. Там, у тваім лесе, зараз вольна, чыста і сьветла. Чаго нельга, на жаль, сказаць пра палі і лясы нашай сучаснасьці… Але кожны з нас яшчэ можа зрабіць… яшчэ можа пасьпець… яшчэ можа… уратаваць… *(Астральнае Вока паступова сьцішваецца, цямнее, цямнее… пакуль не зьнікае зусім.)*

Пабраўшыся разам, Зубраняі Бабраня адлятаюць прэч.

### Зонг пра вольных дазорцаў часу

Нясем дазор, нясем дазор,
І шлях наш – не спыніць.
Ляцім да зор, ляцім да зор,
І лёсу тчэцца ніць.
Мы – вольныя, мы – вольныя
Палоньнікі хвілін.
Касьмічнымі законамі
Зьвязаны, як адзін!

Ляцім да зор, ляцім да зор,
І лёсу тчэцца ніць.
Нясем дазор, нясем дазор,
І шлях наш – не спыніць!

На Зямлю апускаецца віртуальная рэальнасьць.

З А С Л О Н А

К А Н Е Ц.

Лістапад, 1998 г., 1999 г.

м. Кобрынь

KAMUNIKAT.org

## ЗАЛАТАЯ ТАБАКЕРКА
Казка ў двух актах

**Дзейныя асобы:**

ЯНКА.
КАТОК ПЯРЭСТАРХ.
СЛУГА З ТАБАКЕРКІ.
РАПУШКА.
МЫШКА.
КАРАЛЕЎСКАЯ ВАРТА.
КАРОЛЬ.
КАРАЛЕЎСКАЯ ДАЧКА.
ЗЬМЕЙ.
ПРЫГАЖУНЯ.

АКТ І

З”ява першая

У сялянскай хаце – цягнуцца традыцыйныя вячоркі. Занятак таксама традыцыйны: магчыма, адна дзяўчына прадзе кудзелю, другая сядзіць за кросенкамі. Хлапец можа дратаваць боты, яшчэ адзін плясьці лапці ці драць лыкі. Самы старэйшы мужчына, дзед, рамантуе балею. Юнак і дзяўчына, маладзейшыя за астатніх, завіхаюцца з жаронцамі, перамолваючы гарох на муку. Карціну значна ажыўляе каток, які круціцца неяк адразу ва ўсіх пад нагамі.

Усе сьпяваюць песню, уласьцівую падобнаму моманту.

І толькі адзін дзяцюк нічога ня робіць, а толькі ляжыць на пячы – гэта ЯНКА.

1 ДЗЯЎЧЫНА. А што гэта наш Яначка ўсё на печы ляжыць, як быццам яму і ня трэба нічога?

Янка пераварочваецца на другі бок. Дзед недвухсэнсоўна кашляе-перхае.

1 ЮНАК. Зараз як мука перамелецца ды аладкамі на ўсю хату запахне – хутка ўскочыць. (Адганяе Катка.) Апсік!..

Янка пераварочваецца на другі бок.

2 ДЗЯЎЧЫНА. А ён у нас асаблівы – за ўсіх нас на печы бакі адлежвае! (Таксама адганяе Катка, які церабіць клубок з ніткамі.) Ды супакойся ты, Пярэстарх!..

Янка зноў пераварочваецца на другі бок. Дзед кашляе ужо зусім выразна.

2 ЮНАК. Глядзі толькі, Янка, каб якой панскай хваробы сабе не нажыў: там на печы, можа, і мулка, але каб азадак ня стаў мяккі, як булка! (Адганяе Катка.) Ат, Пярэсьцік, пайшоў! (Да Янкі.) Злазь, Янка! Годзе табе мух на столі лічыць!

1 ДЗЯЎЧЫНА (зусім ціха). Вось лайдак!..

ЯНКА (аднак пачуў. Але і ня думае злазіць з печы). Гэта я лайдак?! (Каток скача яму на грудзі, Янка адкідвае яго ад сябе прэч. Каток пакрыўджана мурчыць, нібы выгаворвае Янку ўсё, што пра яго думае, і залазіць пад печ.) Ды мне вашыя лапці… (праводзіць рэбрам далоні пад шыяй) …во дзе сядзяць! Надакучыла ўсё тут – сілаў нямашака!

2 ДЗЯЎЧЫНА. Надакучыла? А чаго ж тады табе хочацца?

ЯНКА. Чаго мне хочацца? Мне… чаго хочацца?.. (Невялічкая паўза.) Эх, а хочацца мне на каралеўскай дачцэ ажаніцца ды ў каралеўскім палацы пажыць! Во!..

УСЕ (разам). Во, чаго захацеў!

Раптам з-пад печы чутно гучнае мяўканьне Катка. Яшчэ праз імгненьне ён выкочвае адтуль нейкі дзіўны прадмет, на які ўсе адразу звяртаюць увагу.

Гучаць рэплікі:

--А што гэта?

--Цікавая штучка!..

--Здаецца, і не было такога ў хаце ніколі.

--Як быццам на партабаку падобна…

--Вой, можа, яна залатая?

ДЗЕД (просіць аднаго з Юнакоў). А ну, хлопча, адчыні.

Адзін з Юнакоў адчыняе табакерку. Раптам адтуль вырываецца выразнае воблачка дыму, і ўсе гучна тройчы чхаюць. І нечакана ўсё рэзка мяняецца: людзі ператвараюцца ў казачных персанажаў – Рапушку, Мышку, Караля ды іншых і пакуль некуды прападаюць.

У хаце на печы застаюцца толькі адзін Янка і Каток Пярэстарх.

З”ява другая

ЯНКА (зьдзіўлена азіраецца вакол). Куды гэта ўсе падзеліся?
КАТОК. А ліха іх ведае! (Сам да сябе.) І трэба ж было мне туды залезьці!..
ЯНКА (пачынае калаціцца ў дрыжыках.) Ох, ох! Х-холадна…
КАТОК (калоціцца таксама). Мр, бр-р, ня цёпла… Трэба ж было мне гэтую табакерку на хату выкаціць!..
ЯНКА (пераварочваецца на другі бок). Ох, ох! Х-холадна…
КАТОК (пераварочваецца таксама). Мр, бр-р, ня цёпла… А каб трасца яе забрала! Каб пярун яе ляснуў! Вой, і з кім жа я тут застаўся! Што ж я цяпер з гэтым нягеглым Янкам адзін рабіць буду!..
ЯНКА. Ох, ох! Х-холадна…
КАТОК. Мр, бр-р, ня цёпла!
ЯНКА. Эх, а яно і праўда добра было б пажыць у каралеўскім палацы! Паспаць пад пухнатаю коўдраю, паесьці ўсялякіх прысмакаў!..
КАТОК. Вось дадзім хутка дуба – будзе табе каралеўскі палац! Свая хата ёсьць – і жыві ў ёй гаспадаром!
ЯНКА. А я б і ў каралеўскім палацы няблага пагаспадарыў.
КАТОК. Бачу, які ты, Янка, гаспадар. Вунь, у печы зусім ня па'лена…
ЯНКА (адмахваецца ад Катка). Вуй, холадна!..
КАТОК (скручваецца клубочкам, накрываецца хвастом.) А ты хвастом накрыйся.
ЯНКА. Якім хвастом?! Ты што, Пярэсьцік, зусім з глузду зьехаў?
КАТОК. Зьедзеш тут, калі есьці няма чаго… (Чутно, як у жываце Катка нешта вуркоча…)
ЯНКА. Чаго ж ты так вуркочаш задаволена?
КАТОК. Гэта ня я вуркачу – гэта мой жывот ад голаду вуркоча.
ЯНКА (раптам і ў яго ў жываце нешта аж падскоквае). Вой, у мяне ў самога кішкі лявоніху рэжуць. І холадна!.. Ох, ох!

(Сьпяваюць разам з Катком:)

Ох, сьцюдзёна наша хатка!
Ох, і голыя палаткі!
Ох, няма чаго у місах!
Ох, жыцьцё – хоць удавіся!

Эх, ты доля, наша доля!
Сьвішча вецер ў пустым полі,
Сьвішча вецер у прарэхах,

У каморы – толькі рэха!

ЯНКА. Слухай, а што ты там пад печкай знайшоў?
КАТОК (адмахваецца). Ат, нічога! (Сам да сябе.) Знайшоў на свой няшчасны каціны голаў!..
ЯНКА. Давай паглядзім – можа, там што ядомае ёсьць.
КАТОК. Ды што там глядзець – партабака нейкая…
ЯНКА. Партабака? А ну, пакажы!..

Янка саскоквае зь печы. Каток зь ня надта вялікай ахвотаю злазіць за ім. Янка падыходзіць да табакеркі і працягвае да яе рукі.

Ух, ты! Ды яна ж залатая!

КАТОК (раптам сыкае). Можа, не бяры?..

ЯНКА (адбірае назад рукі). Гэта чаго?

КАТОК. Можа, мы з гэтай табакеркаю яшчэ гора хапнем.
ЯНКА ( трошкі падумаўшы, раптам сьмяецца). Каб з золатам – і гора хапнуць? Ну, не!.. А раптам тут яшчэ й дыяменты якія!.. (Рашуча адкрывае табакерку. Але знаходзіць там малюсенькую-малюсенькую табачынку.)
КАТОК. Во, знайшоў дыяменты…
ЯНКА (расчаравана). Памаўчы, Пярэстарх! (Падносіць табачынку да вока, каб лепей разгледзець, і адразу гучна чхае. Потым яшчэ і яшчэ.)

Раптам невядома адкуль сярод хаты з"яўляецца здаравенны дзяцюк. Гэта СЛУГА з табакеркі.

З"ява трэцяя

СЛУГА З ТАБАКЕРКІ. Што загадаеш, мой гаспадар?
ЯНКА. Ух ты! Ды хто ж ты такі?
КАТОК (да Янкі). А табе якая справа, хто ён такі? Падазроны фрукт! (Прынюхваецца да Слугі.) І мохам пахне.
СЛУГА (пакрыўджана). Я ня фрукт, а Слуга. Раблю ўсё, што мне загадаюць.
ЯНКА. Усё, што загадаюць? (Хвілінны роздум.) Во! Вельмі мы з катком галодныя. Калі маеш кавалак хлеба, то дай.
СЛУГА. Хлеба кавалак… Зараз дам. (Бярэ ў рукі жаронцы, пачынае флегматычна іх пакручваць. І раптам проста на стол

сыпляцца баранкі, пампушкі ды іншыя печаныя прысмакі.) На, Янка, еш.
ЯНКА. Вось дзякуй! (Слуга зьнікае. Янка са смакам есьць, прапануе далучыцца Катку.) Давай, Пярэстарх, наваліся.
КАТОК. Ага, навалісься – а потым хвост ці вушы адваляцца.
ЯНКА (сьмяецца). Не адваляцца, еш!

Каток асьцярожна спрабуе есьці.

ЯНКА (пагладжвае жывот, але потым глядзіць на свае старыя нагавіцы. Зноў адчыняе табакерку, зноў чхае.)
СЛУГА (зьяўляецца). Што загадаеш, гаспадар?
ЯНКА. Эх, а каб мне яшчэ... ды новыя нагавіцы?!.

Слуга разы са два бразгае кросенкамі і з-пад іх з”яўлюцца новыя нагавіцы. Янка адразу нацягвае іх. Слуга зьнікае.

Ух, ты! Я цяпер не раўнуючы агліцкі барон!
КАТОК (крытычна аглядвае Янкавы старыя лапцікі). Ага, барон – сярод поля пужаць варон!..
ЯНКА (адмахваецца ат Катка). Ат, Пярэстарх!.. (Таксама глядзіць на лапці. Раптам зноў адкрывае табакерку.) Чха, чха, чха!
СЛУГА (зноў з”яўляецца). Што загадаеш, гаспадар?!
*ЯНКА. А ці можна мне да новых нагавіцаў – ды яшчэ новыя боты?!*

Слуга моўчкі бярэ дзве драўляныя калодкі пад галёшы, грукае імі адна аб адну. І адразу перад Янкаю з”яўляецца пара новых шыкоўных ботаў.

Ух, ты! (Адківае старыя лапці, абуваецца ў новыя боты). Во! Хоць зараз у каралеўскі палац!
КАТОК (падбірае старыя лапцікі, закідвае сабе за плечы). М-р, убраўся ў жупан і думае, што пан! Ды яшчэ лапцямі раскідваецца... Пайшлі лепш за дровамі, ахвотнік да каралеўскіх палацаў!..
ЯНКА. А чароўная табакерка навошта? (Бярэ табакерку, адкрывае яе і адразу тройчы чхае).
СЛУГА (зьяўляецца). Чаго загадаеш зрабіць, гаспадар?
ЯНКА. Будзь так ласкавы: зрабі нам тут такую гарачыню, як у лазьні турэцкае, во!
СЛУГА. Як у лазьні?.. Ну, то няхай... (Бярэ чугунны прас, некалькі разоў узмахвае ім у сябе над галавою. Прас адразу

наліваецца яркаю чырваньню, якая разьліваецца па ўсёй хаце. Слуга зьнікае. Прас так і застаецца сам вісець у паветры.)

Янка і Каток залазяць на печ, сьпяваюць:

ЯНКА і КАТОК (разам):
Ох, і ўтульна наша хатка!
Ох, гарачыя палаткі!
Ох, і поўна ў нашых місах!
Ежы столькі – хоць ўдавіся!

Эх, ты доля, наша доля!
Тлуста ў роце, густа ў полі,
На штанах няма прарэхаў,
І разносіць песьню рэха!

З”ява чацьвертая

ЯНКА (раптам абрывае сам сябе.) Каток, ты дзе?
КАТОК. Ды тут я, тут.
ЯНКА. І я тут.
КАТОК. Ну й ляжы сабе.
ЯНКА (саскоќвае з печы, задаволена аглядвае сябе з усіх бакоў). Не. Ведаеш, каток, хачу я ў сьвет пайсьці, людзей паглядзець, сябе паказаць. А то сяджу адзін у гэтай хаце, аж моташна робіцца! КАТОК. Які сьвет, якія людзі?!
ЯНКА. Звычайны – вялікі, шырокі! І людзі розныя…
КАТОК. Ды куды ты пойдзеш? Ты ж лайдак лайдаком!
ЯНКА (пакрыўджана). Гэта я раней быў лайдаком, калі ня меў нічога. А зараз – во!.. (Узьнімае высока табакерку, якая сьвеціцца-пераліваецца чароўным сьвятлом.)
КАТОК (сам да сябе). Божа мой! Божа мой! І за што мне такое пакараньне?!. (Да Янкі.) Зараз у нас і цёпла, і ўтульна, і прысмакаў можа быць усялякіх! А сьвет табе слуга з табакеркі ў тваёй жа хаце які хочаш зробіць.
ЯНКА. Э, у хаце сваёй мне не цікава! Хачу сам пайсьці, сам дзівосаў усялякіх пабачыць. Можа, і ў палац каралеўскі патраплю.
КАТОК. Глядзі, каб як жаба дурная пад воз не патрапіў…
ЯНКА (крыху раздумвае). Усё ж пайду! Ну што, каток? Ідзеш са мною ці не?

КАТОК. Ды пайду, пайду – куды я ад цябе дзенуся? Цябе аднога пускаць – усё роўна што ступу ў неба без таўкача запускаць.

Янка бярэ табакерку і з Катком выходзяць.

З"ява пятая

Янка і Каток ідуць, скажам, вакол печы, стала, лаўкі ды зэдлікаў, сьпяваючы сваю падарожную песьню:

ЯНКА І КАТОК.
У шлях ідзем – такой бяды!..
Мінаем вёскі, гарады
І бачым шмат чаго:
Азёры, рэчкі і лугі,
Ў зялёных травах берагі,
І рознае "ого"!..
Ого, ого, го-го!!!

Яны, сапраўды, выходзяць да сіняга возера. Ім можа быць звычайная драўляная балея, якую ставяць сярод хаты. Раптам высокая хваля выносіць на азёрны бераг РАПУШКУ. Рапушка спрабуе даць нырца назад у возера, аднак у яе нічога не атрымліваецца – яна зачапілася за край балеі. Янка падыходзіць да Рапушкі, хоча ўзяць яе ў рукі.

КАТОК. Асьцярожна, Янка. Асьцярожна!.. (Выпускае кіпці, натапырвае вусы.)
ЯНКА. Э, Пярэстарх!.. Гэта ж не цмок страшэнны які – рапушачка! Плыві, маленькая!.. (Кідае ў ваду Рапушку.)
РАПУШКА (высоўвае галоўку з вады). Дзякуй табе, малойча, што ты мяне ад сьмерці пазбавіў. Можа, калі-небудзь і я дапамагу табе.
ЯНКА (сьмяецца, ляпае па кішэні з табакеркаю). Навошта мне, жабка, твая дапамога, калі ў мяне ў кішэні не такі памочнік!
КАТОК (пакрыўджана). Ох, Янка, каб ты яшчэ меньш балбатаў!
ЯНКА. А чаго мне нейкай рапушкі баяцца? Яна ж у азерцы!..
КАТОК. У азерца таксама лішнія вушы ёсьць.
ЯНКА. Ай, каток, усяго ты страшысься.
КАТОК. Не страшуся, а асьцярожнічаю. Зусім розныя рэчы!..
ЯНКА. Пайшлі далей, асьцярожнік!

Янка і Каток ідуць далей. Сьпяваюць:

ЯНКА і КАТОК.
І зноў у шлях, у доўгі шлях,
Па пералесках і палях,
Па роснае траве.
Вакол шмат птушак і зьвяр"я.
Люблю цябе, зямля мая!
Схіляюся к табе.
К табе, табе, табе!!!

З"ява шостая

Раптам з норкі выбягае шэрая МЫШКА. Каток імгненна кідаецца на яе, хапае зубамі за сьпінку.

ЯНКА. Пярэстарх, пачакай!
КАТОК (з Мышкаю ў зубах). Ш-што такое?..
ЯНКА. Ня еш яе, адпусьці.
КАТОК. Яшчэ ч-шаго! Мая з-ждабыча!..
ЯНКА. Не, адпусьці. Шкада мне яе.
КАТОК (са шкадобаю адпускае Мышку). Шкадуеш… Усё шкадуеш! Каб так цябе пашкадавалі, як што якое… Ну, хіба я… крыху…
ЯНКА. Эх, каток! На гэтым сьвеце трэба ўсіх шкадаваць. (Пяшчотна гладзіць Мышку, садзіць сабе ў кішэню. У другой кішэні знаходзіць скарынку хлеба, дае Мышцы пагрызьці.) Еш, ты ж, мусіць, галодная.
МЫШКА (тоненька пішчыць). Ах, дзякуй табе, чалавеча! (Чуваць, як яна з імпэтам грызе скарынку.)
КАТОК. Во, грызе!
ЯНКА. Ну й няхай грызе.
КАТОК. Мне што!.. Але глядзі, Янка, каб яна табе дзюру ў новых штанах не прагрызла. Яшчэ табакерку згубіш.
ЯНКА. Не згублю! А з мышкай разам нам весялей будзе. Пайшлі, каток, далей!

З"ява сёмая

Ідуць далей. Апускаецца сонца, на вокнах захінаюцца фіранкі, вечарэе.

КАТОК. Яно, можа, і весялей. Але й з мышкаю нам начаваць няма дзе.
ЯНКА (трохі разгублена азіраецца. Але тут перад імі паўстае высокі й прыгожы палац, які можа быць збудаваны з некалькіх зэдлікаў, якія ставяцца на стол і на якія накідваюцца квятастыя тканіны.) А гэта што? Во! Палац! (Сунецца да брамы.)

Раптам ім насустрач выступае грозная ВАРТА.

1 ВАРТАЎНІК. Куды?!
2 ВАРТАЎНІК. А ну, асадзі назад! Гэта каралеўскі палац!
ЯНКА. Каралеўскі?!.. Ух ты, усё жыццё марыў у каралеўскім палацы пераначаваць.
КАТОК. Зараз як дадуць у каршэнь, дык перменячуеш…
ЯНКА (да Вартавых). Дык дасцё нам начлегу ці не?
1 ВАРТАЎНІК. Яшчэ чаго! Каб побач з каралём – ды начаваў нейкі валацуга?
2 ВАРТАЎНІК. Можа, ты злодзей які, а цябе ў палац пускаць? А ну, прэч!
ЯНКА. Ды ніякі я ня злодзей – звычайны хлапчына Янка.Мы ціха, дзе-небудзь у куточку…
КАТОК. Ох, уцякаць адсюль трэба… І навошта, ну й навошта мне трэба было тую табакерку з падпечка даставаць?!.
МЫШКА (паказвае галоўку з кішэні). Вой, яшчэ пасьпеем уцячы. (Да Янкі, досыць пяшчотна.) А ты, Яначка, папрасіся, хораша так папрасіся…
ЯНКА. Пусьціце, калі ласка, пераначаваць!
КАТОК. Уцякаць адсюль трэба…
1 ВАРТАЎНІК. Кароль загадаў ніякіх чужынцаў у палац – не пускаць!
ЯНКА. Гэта чаму?
2 ВАРТАЎНІК. А таму, што нядаўна здарылася ў караля бяда, ясна?! ЯНКА. Якая бяда?
1 ВАРТАЎНІК. А такая! Прыляцеў неяк сюды апоўначы люты зьмей, схапіў яго дачку і занёс на сваю заклятую азёрную выспу, куды ні дайсьці, ні даплысьці!..
КАТОК. Я ж казаў, што ўцякаць трэба.
ЯНКА. Ды ціха ты, Пярэстарх! А што сам кароль?
2 ВАРТАЎНІК. А што кароль? Кароль цяпер аж валасы на галаве рве.
ЯНКА. І ўсё?!.

1 ВАРТАЎНІК. Ірве і ў клубочкі скручвае… А яшчэ абвясьціў на ўсё каралеўства: хто верне яму дачку, за таго аддасьць яе замуж і ўсё каралеўства пасьля сьмерці сваёй адпіша.
ЯНКА. О, вось гэта па мне справа!
2 ВАРТАЎНІК. Ты што пляцеш, хлопча? Шмат прыязджала сюды розных князевічаў і каралевічаў, ды ніхто да выспы дабрацца ня можа: зьмей такія хвалі ўзьнімае, што рады няма!..
ЯНКА (паляпваючы па кішэні з табакеркаю). Нічога, нічога, я дам яму рады!
1 ВАРТАЎНІК. Ну, балбатун! А ну, прэч!
2 ВАРТАЎНІК. Во, плявузгар! Пайшоў вон!..
КАТОК. Такі надаюць у каршэнь…
МЫШКА. А можа, не надаюць?..
1 ВАРТАЎНІК. Пайшоў прэч!
2 ВАРТАЎНІК. Пайшоў вон!

Вартавыя адпіхваюць Янку ад брамы.

З"ява восьмая

З палацу на крыкі выбягае КАРОЛЬ.

КАРОЛЬ. Што такое? Я з-за гора свайго й так каторую ноч ня сплю, а тут вы яшчэ раструбіліся!..
1 ВАРТАЎНІК. Ды тут нейкі валацуга ў палац прэцца.
ЯНКА. Ваша Вялікасьць Кароль! Заўтра, як толькі сонца ўзыйдзе, ты сваю дачку ўбачыш.
КАТОК. Вой, вой! Усё, прапалі, як рудыя мышы.
МЫШКА (пакрыўджана). Ніякія рудыя мышы не прападалі, і мы не прападзем.
КАРОЛЬ. Што?..

Кароль зьдзіўлена абыходзіць Янку, уважліва з усіх бакоў разглядае яго. Раптам сьмяецца:

І ты, хлопча, -- басяк, галота, лапсярданец, -- бярэсься маю дачку… (раптам пачынае плакаць) маю дачусю, маю дачулечку-у-у… зь няволі выбавіць?
ЯНКА (кланяецца). Праўда, пане кароль. Бяруся!
КАРОЛЬ. Вой, глядзі, вой, глядзі! (Пачынае зноў рыдаць.) Бо я за сваю дачку… сваю дачусю… сваю дачулечку-у-у-у!.. (Крыху супакойваецца.) Каб заўтра да ўсходу сонца мая дачка была ў мяне! Бо калі ня будзе – загадаю адсекчы табе галаву!

ЯНКА. Будзе, пане Кароль, будзе!
КАТОК (убок). Во, язык круціцца, як хвост у сабакі!..

Кароль хоча яшчэ нешта сказаць, але зноў рыдае і зьнікае за брамаю. Янка мае пасунуцца сьледам за Каралём, аднак Вартавыя скрыжоўваюць перад ім свае дзіды. Янка са шкадаваньнем аглядвае дзіды, але адыходзіць. За ім адыходзяць Каток і Мышка.

З"ява дзевятая

КАТОК. Ох, Янка! Як жа ты зьбіраесься каралеўскую дачку ратаваць?
ЯНКА. Я зьбіраюся? Я толькі на ёй жаніцца зьбіраюся ды ўсім каралеўствам валодаць! А ратаваць яе вось хто будзе. (Пстрыкае пальцам па табакерцы.)
КАТОК. Во, яшчэ дачку тую й у вочы ня бачыў, а ўжо жаніцца зьбіраесься. Можа, ты зь ёю ў такі скрут патрапіш, што сам ня рад будзеш?
МЫШКА. А можа, не патрапіць? Янка ў нас (уздыхае пяшчотна...) вунь які!.. Не раўнуючы запячанскі асілак!
ЯНКА (горда ахарошваецца). Во, чуў?
КАТОК. Глядзі, Янка,-- я цябе папярэджваў!

Янка дастае табакерку, адчыняе яе. Тройчы гучна чхае. Адразу з"яўляецца Слуга.

З"ява дзесятая

СЛУГА. Што загадаеш, гаспадар?
ЯНКА. Зрабі, браток, такую ласку: вылажы мне за ноч жалезны мост ад каралеўскага палаца да заклятай зьмеевай выспы і пастаў на ім залатую карэту!
КАТОК. Вой, вой, вой! Зусім з глузду зьехаў. Куды цябе нясе, Янка, ну куды ж цябе чорт нясе?!.
СЛУГА. Усё будзе зроблена, як загадаеш! (Зьнікае.)
КАТОК (азіраецца па баках). Усё, самы час уцякаць адсюль!
ЯНКА. Ай, каток, што ты ўсё панікуеш? Уцякай, калі хочаш. Я цябе не трымаю.
КАТОК. Ну, не. Ведаю я цябе, Янка. Ты ж без мяне як прусак прападзеш.
ЯНКА. Які яшчэ такі прусак?

КАТОК. Звычайны, даўгавусы.
ЯНКА. У мяне ж вусаў нават няма!
КАТОК. Вось таму й прападзеш!

Але тут з"яўляецца Слуга з рабрэстым пранікам, кладзе яго паверх балеі. Замест карэты ставіць на пранік пакарабачаны казанчык.

СЛУГА. Гатова!..
КАТОК І МЫШКА (разам). Ух ты!
ЯНКА (абдымаючы Катка). Во! А ты казаў!..

Каток выкручывецца з яго абдымкаў, з падазронасьцю аглядвае мост.

КАТОК (бурчыць сам да сябе). Што дурню не кажы, а ён усё роўна сам сабе ў пекла дарогу мосьціць...

З"ява адзінаццатая

ЯНКА (да Слугі.) Ну, браток, дзякуй табе! (Адчыняе табакерку.) Адпачывай пакуль!

Слуга аддае пугу Янку і зьнікае ў табакерцы. Янка зачыняе і хавае яе.

Залазь, Пярэстрах, паедзем!..
КАТОК. Куды гэта?..
ЯНКА. Як, куды? Каралеўну са зьмеевага палону вызваляць!
КАТОК. Такі хочацца табе, Янка, у пекла галаў усунуць... (Аднак залазіць у карэту.)
МЫШКА. Вой, і я з вамі таксама.

Янка з сумненьнем глядзіць на Мышку.

Вазьмі мяне, міленькі Яначка. (Амаль што закахана...) Ня кідай мяне тут адну, прашу цябе... Прападу я адна.
КАТОК (незадаволена). Не хапала яшчэ розных мышэй па зьмеевых выспах развозіць...
ЯНКА. Э, ад сьмерці ўратаваў, дык і ў адзіноце ня дам загінуць. Залазь! (Мышка залазіць у карэту. Янка пугаю паганяе коней.) Но, паляцелі, саколікі!

Коні хутка імчаць карэту па мосьце на выспу.

### З”ява дванаццатая

Пасярод выспы ўзвышаецца вялізны цёмны замак. З акна на Янку зьдзіўлена глядзіць КАРАЛЕЎСКАЯ ДАЧКА. (Як зрабіць?)

КАРАЛЕЎСКАЯ ДАЧКА. Вой! А хто ж ты такі? Можа, які каралевіч?
ЯНКА. Не.
КАРАЛЕЎНА. Тады, мусіць, князевіч?!
ЯНКА. Ды не…
КАРАЛЕЎНА. Тады, можа, прынц?
ЯНКА. Не, ня прынц.
КАРАЛЕЎНА. Ну, тады… Ну, тады… Знакаміты пан!
ЯНКА. Не, і ня пан я…
КАРАЛЕЎНА (расчаравана). Фі! Калі ты не каралевіч, не князевіч, ня прынц, і нават ня пан, тады навошта сюды прыехаў?
ЯНКА. Янка я, звычайны хлапчына. А прыехаў сюды, каб цябе ад зьмея лютага пазбавіць. Садзіся хутчэй у карэту – да бацькі твайго ў палац паедзем!
КАРАЛЕЎНА (нават крыху адварочваецца). Фі! Нават і не падумаю.
ЯНКА (разгублена). Вось табе й маеш! Гэта чаму?..
КАРАЛЕЎНА. Каб зь нейкім простым Янкам – і да бацькі свайго ў палац ехаць? Не! Мяне толькі прынц або каралевіч ад зьмея праклятага пазбавіць павінен!
КАТОК (убок). Бач ты, сама, як качарэжка, а прынцаў ёй з каралевічамі падавай!..

### З”ява трынаццатая

Раптам узьнімаецца на возеры высокая хваля, дрыжыць выспа, нахіляюцца сьцены зьмеевага замку. Вось і сам ЗЬМЕЙ махае непадалёк ад выспы сваімі грознымі лапцёжнымі крыламі.

ЗЬМЕЙ (здалёк). А-а! А хто гэта тут перад замкам маім гаспадарыць?! Адар-рву галаву!
ЯНКА (са сполахам). Вой, м-мама! (Да Каралеўны, губляючы цярпеньне). Ну й дзе твае прынцы?! А Зьмей вунь – ужо падлятае! Лезь хутчэй праз акно, пакуль ён мне й табе галоў не сарваў!

КАРАЛЕЎНА (са страхам глядзіць уніз). Баюся...
МАРСКІ ЗЬМЕЙ (ужо зусім блізка, больш рашуча махае крыламі). Ах ты, зладзюжнік! Ты на чыё дабро, хлопча дурны, рота разявіў?! Ды я зараз табе!.. Ды я з табою!.. Ха! (Смаліць з пашчы агнём.) Ху і хо!.. (Смаліць зноў і зноў.)
ЯНКА (зусім перапалоханы, выстаўляе рукі). Вой, скакай!
КАРАЛЕЎНА. Вой, баюся!
ЯНКА. Думаеш, я не баюся? Ды скакай ты, скакай!
КАТОК. Скачы, дурніца!
КАРАЛЕЎНА. Гэта я дурніца?! Ну, кацячая поўсьць, я табе яшчэ дурніцу ўспомню! (Скача і якраз трапляе Янку ў рукі – Каралеўну можна спусьціць уніз да Янкі ў вядзерцы на вяроўцы.)

Янка хапае Каралеўну, садзіць яе ў карэту, хвостка паганяе пугаю коней.

ЯНКА. Но!!! Выносьце хутчэй, саколікі!

Коні маланкаю мчацца праз мост. Зьмей кідаецца за імі ў пагоню.

ЗЬМЕЙ (смалячы за Янкам, гучна лопаючы крыламі). Стаяць, каму сказана?!. А ну, стой, карэта, раз-два!!!
ЯНКА (проста са страшэнным сполахам). Ага, зараз! Спужаліся і паслухаліся!
ЗЬМЕЙ (шугаючы з зяпы полымем). Ха! Ху!!
КАРАЛЕЎНА (лямантуючы, крычыць). А-а-а!
ЯНКА. О-о-о-о!
КАТОК і МЫШКА (трасучыся ў карэце). А-а-а-а! О-о-о-о! І-і-у-у-у-у-о-о-о!..

З”ява чатырнаццатая

Імкліва нясуцца коні. Вось і канчаецца мост, вось і нарэшце бераг. Скача Янка на зямлю, высаджвае Каралеўну, а сам хутка адварочваецца, дастае табакерку, расчыняе яе і гучна чхае. Выскоквае Слуга.

СЛУГА. Што загадаеш, гаспадар?
ЯНКА. Чха!..Вой, хутчэй, чха, вой, хутчэй, чха!..
СЛУГА. Ды што хутчэй?
ЯНКА. Чха, чха!.. Хутчэй, братка, руш гэты мост пракляты!..

СЛУГА. Усё будзе зроблена, як загадаеш! (Зьвяртаецца да дзяцей у залу.) А ну, дзеткі, тузаніце хто тут!..

Дзіця тузае за вяроўку. І ў той жа момант мост ламаецца, рушыцца; вялізны абломак трапляе Зьмею ў голаў. Зьмей злосна крычыць і патанае ў возеры.

ЯНКА, КАТОК І МЫШКА (крычаць разам). Ура!!! Наша перамога!..

З"ява пятнаццатая

КАРОЛЬ (выбягае з палаца, кідаецца да Дачкі). Дачуся!
КАРАЛЕЎНА (кідаецца да бацькі). Татуся!!.
КАРОЛЬ (абдымае, мацае яе). Дачуля, дачуся, дачулечка-а-а!.. Жывая, здаровая, цэлая-я-а!
КАРАЛЕЎНА (трохі па-глупяньдзейску). Ага!!!
КАРОЛЬ (да Янкі). Ну, хлопча, парадаваў ты мяне. Як і абяцаў, аддам табе сваю дачку замуж!
КАРАЛЕЎНА. Што, за яго замуж ісьці?! (Касавурыць рожу.)
КАРОЛЬ. Так, за яго! …І адпішу вам усё каралеўства.
ЯНКА. Ура!
КАРОЛЬ. Пасьля сваёй сьмерці…

*Грае ўрачысты туш. Янка і Каралеўна падымаюцца на сходах у палац. На іх, ужо як на шлюбную пару, ляцяць з усіх бакоў кветкі. Чуюцца воклічы "Слава Янку! Слава Янку!" Побач сьціпла ідуць Каток і Мышка.*

КАТОК. Ну вось, як табакерку з-падпечка даставаць – дык катку, як справу рабіць – дык разам, а як слава – дык аднаму Янку. Вось яна, удзячнасьць людская!..

Каралеўна, пачуўшы словы Катка, злосна наступае яму на хвост. Каток гучна мяўчыць ад болю й крыўды. Імкліва апускаецца

З а с л о н а

## А К Т II

### З”ява першая

Раніца ў каралеўскіх пакоях. Янка, знай сабе, пахропвае, побач, ужо прачнуўшыся, сядзіць незадаволеная Каралеўна. Побач з парогам, на атласнае падушачцы, зьвярнуўся клубочкам Каток, чуйна паглядаючы адным вокам за Каралеўнаю. Разам з Катком – Мышка.

КАРАЛЕЎНА (і так, і гэтак прымерваючы карону з засохлых макавых галовак да галавы сьпячага Янкі). Цьфу, ну зусім ня прынц!
КАТОК (сам сабе, мармыча). Бач ты, як прынцы ёй гэтыя даліся…
КАРАЛЕЎНА (зноў з усіх бакоў аглядваючы Янку). Мужык мужыком, а такі мост да выспы зрабіў! І карэтаю залачонаю недзе разжыўся. Мусіць, нехта яму дапамог. А можа, скраў?!.

Янка прачынаецца. Каралеўна адразу мяняецца, зьвяртаецца да Янкі лагодна ды ласкава.

Вой, Янка! А мой жа ты любы Янка!..
КАТОК (па-ранейшаму ціха, сам сабе). Ты глядзі, зьмяюка, як хутка скуру мяняе! Вой, прападзе зь ёю Янка, вой, прападзе!
МЫШКА. Можа, усё ж не прападзе?..
ЯНКА (задаволена). Што, мая харошая каралеўна?
КАРАЛЕЎНА (лашчыцца да Янкі). Паслухай, Янка! А скажы ты мне, хто табе той мост зрабіў, па якім ты мяне да бацькі прывёз?
ЯНКА (адмахваецца ад Каралеўны). Ай!..
КАТОК. Чуе мая душа – зараз яна яму языка не раўнуючы як бант разьвяжа!..
КАРАЛЕЎНА (яшчэ бліжэй пасоўваецца да Янкі). Ну скажы! Ну!..
ЯНКА. Ды чаго там!.. Надта доўга чхаць будзеш.
КАРАЛЕЎНА. Чхаць? Вой, я так люблю чхаць. Ну, галубок, ну, коцік!
КАТОК. Во, яшчэ й нашую пачэсную кацячую кроў прыблытала!..
КАРАЛЕЎНА. Ну, рыбачка, козьлічак, зайчанятка!.. Давай разам на ўсё чхаць будзем!

ЯНКА. Вой, ну зрабіў і зрабіў!
КАРАЛЕЎНА (нечакана мяняе інтанацыю, раве дурным голасам). А-а! Памру-у, калі не прызнаесься!
ЯНКА. Вось жа, упартасьць жаночая! (Дастае табакерку, паказвае яе жонцы). Во, ёсьць табакерка ў мяне чароўная. Як раскрыю яе, як чыхну, – адразу выскоквае верны слуга і робіць усё, што яму загадаю.
КАТОК. Усё, прапаў Янка.
МЫШКА. Ды што ты яго раней часу хаваеш? Да гэтага не прапаў і потым, можа, не прападзе!
КАТОК. Можа! Яно дык можа – каб не каралеўны крывая рожа. (Сплёўвае.) Цьфу!..
КАРАЛЕЎНА (наступае Катку на хвост і адначасова прагна цягне рукі да табакеркі). Ух ты!..
КАТОК. Мяў-у-у!..
ЯНКА (хуценька прыбірае табакерку). Толькі прысягні, што ты сама безь мяне ніколі яе ў рукі ня возьмеш.
КАРАЛЕЎНА (жагнаецца). Каб мне ня ўстаць!
ЯНКА. Чаго б ты хацела, каб Слуга з табакеркі зрабіў?
КАРАЛЕЎНА. Што б я хацела… А няхай зноў моста да выспы зробіць. Нешта мне захацелася зноў у зьмеевым замку на выспе пажыць.

Янка адчыняе табакерку. Адтуль хутка выскоквае Слуга. Янка з Каралеўнаю гучна чхаюць.

З"ява другая

СЛУГА. Што загадаеце, гаспадары?
ЯНКА. А пастаў ты нам зноў мост да выспы, які раней ставіў!

Слуга кланяецца, і адразу да выспы зноў паўстае мост. Янка вядзе Каралеўну да карэты.

Калі ласка, прашу любую жонку да карэты!
КАРАЛЕЎНА. О, банжур, мансіньёр! (Садзяцца ў карэту і едуць да зьмеевага замку. Выходзяць.) А масток, Яначка, няхай пастаіць. Будзем па ім на бераг езьдзіць – у госьці да бацькі й куды захочам.
ЯНКА. Ну, няхай пастаіць.

*Заходзяць у замак. Выбіраюць сабе шыкоўную залу-спальню.*

КАРАЛЕЎНА (падносіць Янку маленькую падушачку). А табакерку сюды пакладзі – а то яшчэ згубіш.

Янка кладзе табакерку на падушачку. Каралеўна зноў касавурыцца на Янку.

Паслухай, Янка… Што ты ўсё ўпалацах кісялём кісьнеш? Можа, на паляваньне якое б у лес каралеўскі паехаў?
ЯНКА (крыху падумаўшы). У лес каралеўскі, кажаш? А што – можна!.. Гэй, каток, мышка, гайда са мною!

Янка, Каток і Мышка садзяцца ў карэту, едуць назад цераз мост.

З"ява трэцяя

У гэты час Каралеўна хуценька бярэ з падушачкі табакерку, адкрывае яе і агідненька тройчы чхае. Адтуль адразу паказваецца Слуга.

СЛУГА (унура). Што табе трэба, мая новая гаспадыня?
КАРАЛЕЎНА. Загадваю табе мост залачоны – прыбраць!
СЛУГА. Усё будзе зроблена, як загадаеш… (Зноў да дзяцей.) Давай, хто зноў тузануць хоча… (Магчыма, на гэты раз дзеці не адгукаюцца.) Ніхто? Ну, то я сам… (Слуга сам рушыць мост, зьнікае.)

З"ява чацьвертая

КАТОК (ужо на беразе, паказваючы, як рушыцца мост). Янка, Янка! Мост прападае!
ЯНКА. Вой! (Раптам ляпае-мацае сябе па кішэнях.) Мая табакерка!.. (Усё зразумеўшы.) Эх! Падманула мяне каралеўна! (Горка плача.)
КАТОК. А, дзіва што!.. Што я табе казаў? Ты яе пашкадаваў, зь бяды выбавіў, а яна табе чым за тваё дабро заплаціла? Добра яшчэ, што жывы застаўся. А то магла б, зьмяюка, зусім на глум зьвесьці.

МЫШКА. Хопіць табе, каток, Янкава добрае сэрца рваць. Ён у нас такі далікатны, такі чулы… Трэба неяк ягоную табакерку назад з палону вызваляць.
КАТОК. Гэта што – па халоднай вадзе назад да той карготы плысьці?..
*МЫШКА. Калі баісься – сама паплыву! (Рашуча накіроўваецца да возера.)*
КАТОК. Пачакай! (Мышка спыняецца.) Яшчэ патонеш сама… (Мышка залазіць Катку на сьпіну. Той з асьцярогаю спрабуе лапаю ваду. Нарэшце рашаецца плыць. Да Янкі:) Ды ня кісьні ты, Янка. Дабудзем мы табе табакерку!
ЯНКА (толькі махае ім усьлед рукою). Ай!..

Каток з Мышкаю плывуць на выспу.

З”ява пятая

Каток і Мышка даплываюць да замка. Вылазяць на бераг. З усіх бакоў абыходзяць замак, ня ведаючы, як туды патрапіць. Знаходзяць нейкую шчыліну.

КАТОК (спрабуе хоць неяк уціснуцца ў шчыліну. Аднак ледзь не захрасае ў ёй, а таму спыняе свае спробы.) А-а! Давай ты, мышка!
МЫШКА. А ты?.. (Пралазіць у шчыліну.)
КАТОК (засоўвае ў шчыліну толькі пысу, хвост вонкі ходзіць ходырам туды-сюды.) А я адсюль… кіраваць буду. Глядзі ж, назад без табакеркі не вяртайся!.. І, як што якое,-- крычы!
МЫШКА (ужо знутры). Не, лепей ты крычы, калі што якое… А я пастараюся ціха.
КАТОК (застаецца адзін). Эх, Пярэстарх, Пярэстарх! Спачатку з людзьмі зьвязаўся, цяпер вось з мышамі!.. (Крычыць да Мышкі.) Ну, што?..
МЫШКА. Ды ціха ты! Шукаю…

З”ява шостая

Мышка прабіраецца ў пакой да Каралеўны. Тая, між тым, соладка пасопвае на ложку. Мышка пачынае ўсё абнюхваць, паўсюль торкацца сваёй пыскаю.

КАТОК (прыцішаны ды прыціснуты). Знайшла?
МЫШКА (злосна шэпча). Цішэй! Яшчэ не…
КАТОК (які ня чуе). Га?..

МЫШКА. Шукаю, шукаю!
КАТОК (які ня чуе па-ранейшаму). Га?..
МЫШКА. Ды ціха ты – Каралеўну разбудзіш…

Мышка спыняецца побач з драўляным куфэркам. Яна спрабуе падняць сваімі маленькімі лапкамі цяжкое вечка, аднак у яе нічога не атрымліваецца. Каток па-ранейшаму крычыць “Ну што, знайшла?” Мышка, сабраўшыся зь сіламі, нарэшце неяк прыўзьнімае вечка. Яно, аднак, пагражае вырвацца зь ейных лапак і прычавіць яе навечна…

КАТОК. Ну што, знайшла?
МЫШКА (ціхутка). Цішэй! Знайшла… Але трэба дзюрачку грызьці…
КАТОК. Га?..
МЫШКА. Вой, ціха… (Пачынае хутка-хутка грызьці куфэрак. Мышыным шкрабатаньнем можа быць простае драпаньне пазногцямі па дзяружцы ці па якім куфэрку.)

Пачуўшы шоргат, Каралеўна прачынаецца, хапае свой боцік, кідае ім у кут.

КАРАЛЕЎНА. Ай, і тут ад катоў спакою няма! А ну, прэч!..
КАТОК (звонку, не дачуўшы). Га?..

Мышка на нейкі час замірае. Калі Каралеўна зноў пачынае сапсьці, яна зноў грызе куфэрак. Каралеўна зноў прачынаецца, кідае другім ботам у другі кут.

КАРАЛЕЎНА. Я сказала, пайшлі прэч!
КАТОК. Га?..

Мышка зноў сьцішваецца. Каралеўна зноў засынае. Мышка хутка-хутка грызе куфэрак, нарэшце прагрызае ладную дзюру. Хапае табакерку і – наўцёкі!

З”ява сёмая

МЫШКА (дабегшы з табакеркаю да шчыліны, у якой захрас Каток). Ёсьць!.. Знайшла!

КАТОК (так і гэтак спрабуючы вылузацца са шчыліны.) То чаго ты марудзіш? (Мышка падпіхвае яго ў пысу.) Хутчэй, давай!.. (Каток нарэшце вызваляецца і падстаўляе сьпінку Мышцы.) Во, капоха!..

Мышка заскоквае Катку на сьпіну, ён зноў асьцярожна ды марудна спрабуе лапаю ваду, нарэшце, фыркаючы, плыве назад. Вось ужо хутка й бераг. Каток раптам заварочвае галаў да Мышкі.

Мышка!.. А ці не згубіла ты табакеркі?
МЫШКА (моцна трымаючы табакерку лапкамі й зубамі, толькі мычыць). М-м!..
КАТОК (не разумеючы, спрабуе завярнуць назад галаў). Што?.. Дык не згубіла?
МЫШКА. М-м!..
КАТОК. А няўжо згубіла?
МЫШКА (мычыць проста адчайна). М-м-м!..
КАТОК. Што? Згубіла?!
МЫШКА (бярэ табакерку ў лапку і высока ўздымае яе над галавой). Ды вось яна! (Раптам не ўтрымоўвае табакерку, якая – плюх у ваду!) Вой!
КАТОК. Ах ты, недарэка! Разява, няўклюда, салупяка! Што ж ты нарабіла?
МЫШКА. А ты чаго ўсё пытаесься: ці не згубіла?.. ці не згубіла?..
КАТОК (выбіраецца на бераг і накідваецца на Мышку.) Ну, усё! Маліся, я цябе задушу!

Мышка ў сполаху закрываецца лапкамі. Аднак у гэты момант Янка зноў адбірае яе ад Катка.

З”ява восьмая

ЯНКА. За што ты яе, каток?
КАТОК. Ды ўсё за тое!.. Табакерку залатую мышка твая ўлюбёная – у возера ўпусьціла!
ЯНКА. Праўда?
МЫШКА. Вой, праўда, міленькі Яначка. Вой, праўда…
ЯНКА. Эх! (Толькі скрушна махае рукою ды зноў сядае, зажураны моцна-моцна.)

З”ява дзявятая

Раптам з возера паказваецца Рапушка.

РАПУШКА. Чаго ты, чалавеча, сумуеш?
ЯНКА (толькі адмахваецца). Ай, рапушка!..
*РАПУШКА. Раскажы мне: можа, дапамагу табе за тое, што ты калісьці ад сьмерці мяне пазбавіў.*
КАТОК. А што тут расказваць! Была ў Янкі, а дакладней, у нас адна чароўная табакерка, а яе мышка ў возера ўпусьціла!
РАПУШКА. Гэта бяда – не бяда! Зараз дастанем мы вашую табакерку.

Рапушка нырае на дно возера, боўтаецца там, боўтаецца, дастаючы па чарзе розныя табакеркі.

РАПУШКА. Гэта?
ЯНКА. Вой, не…
РАПУШКА. Можа, гэта?
КАТОК. Не!
РАПУШКА. Тады, можа, гэта?
ЯНКА. Вой, зусім не!

Нарэшце Рапушка дастае патрэбную.

Во, гэта, гэта! Дзякуй табе, рапушка! Дзякую, даражэнькая! Збавіла ты мяне ад бяды!
РАПУШКА. Як спатрэбіцца дапамога – зьвяртайся! (Зьнікае на дне.)

З”ява дзесятая

КАТОК (да Янкі). Ну, і што цяпер рабіць будзеш? Зноў да каралеўны сваёй (жэстамі перадражнівае Каралеўну) разьлюбезьніцы лупавокае!.. вернесься?

У гэты момант на высьпе паказаваецца сама Каралеўна.

КАРАЛЕЎНА (крычыць). Янка! Янычка!.. Міленькі, харошанькі, каханенькі, родненькі! Вой, прашу!..Вой, вярніся! (Раве.) Я больш так ня буду!!!
ЯНКА (крыху падумаўшы). Не! Адзін раз падманула – дык і потым падманеш.

КАТОК. Во! Нават і ў майго гаспадара крыху мазгоў дадалося…
КАРАЛЕЎНА. Вой, Яначка! Не губі ж ты сваю жоначку родную!
ЯНКА. А ты мне болей ня жонка! (Адкрывае табакерку, гучна чхае, адтуль выскоквае Слуга.)
СЛУГА. Што загадаеш, мой ранейшы гаспадар?
ЯНКА. Загадваю табе ўзяць караля і перанесьці яго на зьмееву выспу, у замак да дочачкі свае любае. Няхай там разам жывуць ды розных прынцаў з каралевічамі выглядаюць!
СЛУГА. Усё будзе зроблена, як загадаеш!

Слуга зьнікае. І адразу пералятае Кароль па паветры ў зьмеевы замак.

КАТОК (з яхідцаю). А сам што – у каралеўскі палац пойдзеш жыць?
ЯНКА (зноў крыху падумаўшы). Не! Няхай гэты палац увогуле пярунам лясьне! (Вялізны трах-бабах!..Палац адразу прападае.) А мы лепей у сваю хату вернемся – самі сабе гаспадарыць будзем!
КАТОК. Ты глядзі – нават маімі словамі загаварыў! Ты бач, як табе ў галаве праясьніла!..
КАРАЛЕЎНА (плача-рыдае на плячы Караля на высьпе). А-а, Янка-а-а! Ну, даруй! Ну, даруй мне, дурнічаньцы-ы-ы-ы!..
ЯНКА. Ды ніколі!
КАРАЛЕЎНА. А-а-а-а!..

З”ява адзінаццатая

Каралеўна плача так, што сьлёзы проста патокам ліюцца ў балею. Ад гэтых сьлёзаў узьнімаецца высачэзная хваля, грозна коціць на бераг і раптам змывае ў ваду Мышку.

МЫШКА. Вой, пі-пі-пі!.. Ратуйце!

Янка, не раздумваючы, кідаецца на ратунак. Выхоплівае з вады мышку, і раптам… замест Мышкі побач зь ім паўстае – няпісанае красы ПРЫГАЖУНЯ!

ЯНКА. Вось дык так! Вось дык маеш!.. Ды хто ж ты такая?

Каток проста прыкусвае свае вусы ад нечаканасьці…

ПРЫГАЖУНЯ. Ах, Яначка! Я – тая самая шэрая мышка, якую ты ўжо трэці раз ратуеш ад сьмерці немінучае.
ЯНКА. Ды якая ж ты мышка, калі ты – уся такая… такая…
ПРЫГАЖУНЯ. Я – звычайная кавальская дачка, якую калісьці злы Зьмей таксама выкраў у бацькі. Толькі я не скарылася Зьмею, і ён абярнуў мяне ў шэрую мышку. Ды яшчэ выскаляўся: злыя чары здыме зь мяне толькі той, хто тры разы ўратуе мяне ад сьмерці.
ЯНКА. Дык што ж, выходзіць…
ПРЫГАЖУНЯ. Так, гэта ты, даражэнькі Янка. Мой мілы Янка, у якога я закахалася ўсім сэрцам яшчэ шэраю мышкаю…
ЯНКА (неадрыўна глядзіць на Прыгажуню). Вой! Здаецца, і я… таксама…
КАТОК. Ну, во: быў у мяне адзін гаспадар – Янка, а зараз яшчэ й гаспадыня будзе! (Трэцца ля ног Прыгажуні.) А як цябе зваць, гаспадынька?
ПРЫГАЖУНЯ. Тацянка…
ЯНКА і КАТОК (у адзін голас). Тацянка!!
ЯНКА (вядзе Прыгажуню да сваёй простай хаткі). А… ці будзеш ты з намі жыць у простай сялянскай хатцы, Тацянка?
ПРЫГАЖУНЯ. Я з табой, Янка, – хоць на краёчку зямлі жыць буду!
КАТОК (як бы трохі пакрыўджана). А са мною?..
ПРЫГАЖУНЯ. І з табою, мілы каточак!
КАТОК (задаволена). М-р, мяў!!!

І гучыць вясельная музыка, грымяць вальсы-чарльзтоны, суцэльнае сьвята ў простае сялянскае хатцы!..

УСЕ (сьпяваюць).
Ох, і ўтульна наша хата!
І штодня – у хаце сьвята!
Мае Янка прыгажуньку,
А каток – сьмятаны буньку!

Эх, шчасьліва наша доля!
І красуе жыта ў полі,
І раздольна ў полі сьмеху,
І разносіць песьню рэха!

З а с л о н а

К а н е ц.